
М. І. ЕРМАЛОВІЧ

На слядах аднаго міфа



М. І. ЕРМАЛОВІЧ

Па слядах аднаго міфа

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук, прафесар
А. П. ГРЫЦКЕВІЧ

Мінск
«Навука і тэхніка»
1989

ББК 63.3(2)43
Е72

Рэцэнзенты:

доктар гістарычных навук Л. В. Аляксееў,
доктар гістарычных навук В. У. Чапко,
кандыдат гістарычных навук А. А. Трусаў,
кандыдат гістарычных навук С. А. Шчарбакоў

Ермаловіч М. І.

Е72 Па слядах аднаго міфа / Навук. рэд. А. П. Грыцкевіч.— Мн.: Навука і тэхніка, 1989.— 94 с.

ISBN 5-343-00016-9.

Ермолович Н. И. По следам одного мифа.

На аснове дэталёвага разгляду гістарычных і іншых матэрыялаў асвятляецца пытанне аб утварэнні ў 50—60-х гадах XIII ст. Вялікага княства Літоўскага.

Для навукоўцаў, краязнаўцаў, студэнтаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

0503020900—111
Е——————15а—89 **ББК 63.3(2)43+63.3(2Б)**
М316(03)—89

ISBN 5-343-00016-9

© Выдавецтва
«Навука і тэхніка», 1989.

Гэтая кніга прысвечана эпосе стварэння Вялікага княства Літоўскага — часу, мала асветленаму паўнацэннымі крыніцамі і, як паказвае аўтар, яшчэ недастаткова вывучанаму. Нанова пераглядаючы гістарычныя звесткі, якія датычаць гэтай праблемы, М. Ермаловіч даволі абгрунтавана адмаўляе заваяванне ў XIII ст. беларускіх земляў літоўцамі, што лічылася дагэтуль бясспрэчным фактам. Замест гэтага ён прапануе арыгінальную канцэпцыю і пацвярджае яе спасылкамі на крыніцы. Не ўсё тут здаецца досыць пераканаўчым, сустракаюцца сцверджанні, на маю думку, занадта катэгарычныя, але гэта ўрэшце не так істотна. Галоўнае тое, што ў кнізе шмат новых, арыгінальных думак, якія, несумненна, заслугоўваюць таго, каб быць уведзенымі ў навуковы ўжытак. Яны будуць стымуляваць працу даследчыкаў, вымусяць перагледзець застарэлыя ў нашай гістарыяграфіі погляды.

28 лютага 1989 г.
г. Масква

Л. В. Аляксееў,
доктар гістарычных навук

ПРАДМОВА

У гістарычнай навуцы ўмацавалася думка, што ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII ст. бярэ пачатак з заваявання літоўскім князем Міндоўгам шэрагу беларускіх земляў, і ў першую чаргу так званай Чорнай Русі з гарадамі Навагрудкам, Ваўкавыскам, Слонімам, Гродна і інш.[1] Здавалася б, што такое рэдкае ў навуцы адзінадушша трымаецца на бясспрэчных гістарычных сведчаннях. Але ў свой час М. Дашкевіч заўважыў, што «ў верагодных крыніцах не дайшло да нас ніякіх звестак аб пакарэнні Літвой гэтага ўчастка»[2]. З таго часу прайшло больш за 100 гадоў, а ў даследчыкаў не з'явілася ніводнай крыніцы, якая б пацвярджала літоўскае заваяванне як гэтай, так і якой-небудзь іншай беларускай зямлі[3].

Нават У. Пашута ў сваёй вялізнай працы аб утварэнні Літоўскай дзяржавы гаворыць: «У Чорнай Русі, якой Міндоўг авалодаў у 40-х гадах XIII ст., выкарыстаўшы цяжкія для Рускай зямлі вынікі мангольскага нашэсця, княжыў яго сын Войшалк»[4]. Але нават гэты даследчык, кніга якога садзейнічала яшчэ большаму ўмацаванню ў нашай гістарыяграфіі сцверджання аб літоўскім заваяванні Беларусі, відаць, не быў упэўнены ў правільнасці гэтага і іншых сваіх тэзісаў, звязаных з утварэннем і далейшай гісторыяй Вялікага княства Літоўскага, калі палічыў патрэбным адзначыць: «Далейшыя поспехі нашай навукі, магчыма, прывядуць да перагляду прапанаваных тут аргументаў і вывадаў. Чым хутчэй гэта адбудзецца, тым лепш»[5]. Так, перагляд неабходны. Сучасная гістарычная навука, перад якой ставіцца задача ліквідаваць усе «белыя плямы» нашага мінулага, не можа мірыцца з бяздоказнымі сцверджаннямі, і таму пытанне аб утварэнні Вялікага княства Літоўскага павінна быць прыведзена ў адпаведнасць з праўдзівымі гістарычнымі сведчаннямі.

1

НА ЎЗРОЎНІ XVI СТ.

Часцей за ўсё тэндэнцыйна скажаецца пачатковая гісторыя той ці іншай дзяржавы. Так здарылася і з гісторыяй Вялікага княства Літоўскага, першыя старонкі якой да непазнавальнасці зацемнены міфам аб літоўскім заваяванні Беларусі. Ён мае даўнюю гісторыю. Яго ўзнікненне адносіцца да XVI ст., калі ішла абвостраная барацьба Маскоўскай дзяржавы за беларускія і ўкраінскія землі, якія знаходзіліся ў той час у складзе Вялікага княства Літоўскага. Тады была выкарыстана не толькі вайсковая сіла, але і ідэалагічныя сродкі барацьбы. Патрэбна было абгрунтаваць законныя правы Рускай дзяржавы на Беларусь і Украіну. Гэта і было адной з мэт літаратурна-публіцыстычнага твора «Сказание о князьях владимирских», які з'явіўся ў першай трэці XVI ст. Дзеля гэтага ў яго і быў уключаны раздзел «Родословие литовских князей», змест якога коратка зводзіцца да наступнага.

Ратуючыся ад татарскага пагрому Батыя, нейкі Віцянец, які нібыта быў родам са смаленскіх князёў, уцёк у Жамойць (так тут называецца Літва), пасяліўся там і ажаніўся з дачкой бортніка. Праз трыццаць гадоў ён быў забіты перуном. Пасля гэтага жонку Віцянца забраў ягоны раб конюх Гегіменік. І вось у хуткім часе маскоўскі князь Юрый Данілавіч паслаў гэтага Гегіменіка «на Волоскую землю и на Киевьскую (г. зн. на Украіну) и на обь сю страну Меньска (г. зн. у Беларусь)» браць з іх царскія даніны. Гегіменік, «мужь храбр зело и велика разума», беручы даніны, назбіраў шмат багацця, пачаў валодаць многімі землямі і дзякуючы нязгодам і міжусобіцам паміж рускімі князямі стаў першым вялікім літоўскім князем [6]. Палітычная мэта гэтай выдуманай гісторыі пра літоўскіх князёў Віценя і Гедыміна была ясная: літоўскія князі, выкарыстаўшы цяжкі для Русі час, самаўпраўна прысвоілі сабе бела-

рускія і ўкраінскія землі і зараз павінны вярнуць іх законным іх гаспадарам — маскоўскім князям.

Зразумела, што ў Вялікім княстве Літоўскім усё гэта не магло застацца без адказу. Тым больш што ў 1561 г. гэта дзяржава ўступіла ў Лівонскую вайну, і пагроза страты беларускіх земляў стала рэальнасцю: у пачатку 1563 г. войскі Івана Грознага занялі Полацк. У гэты крытычны момант і з'явіліся летапісы, якія ў сучаснай навуцы прынята называць беларуска-літоўскімі, бо ў іх, як лічыў М. М. Улашчык, выкладаецца гісторыя Вялікага княства Літоўскага і напісаны яны на беларускай мове. Менавіта яны і пазней створаная ў значнай меры на аснове іх «Хроніка» польскага гісторыка М. Стрыйкоўскага побач з іншым павінны былі даказаць гістарычныя правы Вялікага княства Літоўскага на беларускія землі, у тым ліку і на Полацк, заняты ў той час рускімі войскамі. Захоп літоўскімі князямі беларускіх земляў гэтыя летапісы і «Хроніка» Стрыйкоўскага, як і «Сказание о князьях владимирских», таксама адносяць да часу нашэсця Батыя, толькі прыпісваюць гэта іншым асобам, а менавіта жамойцкім князям. Чаму гэта так, стане зразумелым, калі прыгадаць, што апошнія ў той час апынуліся ў больш выгадным становішчы. У выніку Грунвальдскай перамогі (1410 г.) спыніліся напады нямецкіх крыжакоў на Жамойцію (заходняя частка сучаснай Літвы). У той жа час шматлікія войны, якія вяліся ў XV—XVI стст. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай, адбываліся на беларускіх землях, што аслабляла ў дзяржаве пазіцыі іх феадалаў. Жамойцкія магнаты, адчуўшы сваю сілу, сталі прэтэндаваць на першынство ў дзяржаве і таму імкнуліся прыпісаць сабе і заслугу ў яе стварэнні. Вялікую ролю ў падрыхтоўцы «Хронікі» Стрыйкоўскага адыграў біскуп Гедройц — ідэолаг жамойцкай нацыянальнай партыі ў другой палове XVI ст. Ён забяспечыў Стрыйкоўскага шматлікімі і, відаць, тэндэнцыйна адрэдагаванымі ім летапісамі. Гедройц і фінансаваў друкаванне «Хронікі» у Кёнігсбергу ў 1582 г.

Таму не дзіўна, што, паводле беларуска-літоўскіх летапісаў і «Хронікі» Стрыйкоўскага, менавіта вялікі князь жамойцкі Мантвіл, убачыўшы, што ў выніку нашэсця Батыя рускія землі спустошаны і князі рускія разагнаны, даў войска свайму сыну Ердзівілу, і той, перайшоўшы Вяллю, а пасля і Нёман, знайшоў гару

прыгожую і заснаваў на ёй горад, назваўшы яго Новагарадком і зрабіўшы яго сваёй сталіцай. Пасля гэтак жа сама ўзнавіў іншыя гарады, разбураныя Батыем [7].

Аўтары летапісаў і Стрыйкоўскі да непазнавальнасці заблыталі гісторыю: паперастаўлялі падзеі, перайменавалі гістарычных асоб, а то і проста рабілі падлог. У гэтых адносінах характэрная перадача падзей, якія нібыта прывялі да заваявання Літвой Полацка. Тут засталіся некаторыя дэталі, якія даюць магчымасць аднавіць гістарычную праўду. У Іпацьеўскім летапісе пад 1162 і 1167 гг. апавядаецца пра міжусобную барацьбу полацкіх і мінскіх князёў. У 1162 г. полацкі князь Рагвалод пайшоў на аднаго з мінскіх князёў Валадара Глебавіча. Апошні, ухіліўшыся ад бою днём, ноччу выступіў з сваім войскам, набраным з «літвы», на палачан і разбіў іх пад Гарадцом. Паражэнне было страшэнным, і Рагвалод пабаяўся варочацца назад у Полацк. Палачане ўзялі сабе новага князя Усяслава Васількавіча. У 1167 г. ужо сам Валадар Глебавіч пайшоў на Полацк і перамог палачан. Усяслаў Васількавіч уцёк з Полацка ў Віцебск, а Валадар Глебавіч стаў на кароткі час полацкім князем, пакуль не быў разбіты на Дзвіне [8].

Для аўтараў летапісаў гэтыя падзеі і з'явіліся вельмі зручнымі для апрацоўкі іх у патрэбным кірунку. У іх падзеі 1162 і 1167 гг. аб'яднаны ў адно, Валадар Глебавіч названы Мінгайлам — сынам жамойцкага князя Ердзівіла, які быццам бы княжыў у Новагарадку. Дык вось нібыта пасля смерці бацькі Мінгайла, разбіўшы палачан пад Гарадцом, захапіў Полацк і стаў адначасова вялікім князем полацкім і новагародскім. Пасля яго смерці засталіся два сыны, адзін з якіх, Гінгвіл, стаў быццам бы княжыць у Полацку. Ён, ажаніўшыся з цвярской князёўнай Марыяй, прыняў хрысціянства. Пасля яго смерці ў Полацку княжыў яго сын Барыс, які заснаваў горад Барысаў і пабудаваў у Полацку царкву святой Сафіі [9]. Каб зрабіць гэтыя звесткі яшчэ больш пераканаўчымі, Стрыйкоўскі ў сваёй «Хроніцы» сцвярджаў, што на свае вочы бачыў недалёка ад Полацка Барысаў камень, на якім было напісана: «Помоги господи рабу твоему Борису, сыну Гингвилову» [10]. Няма чаго казаць, што ўсё гэта выдумка. Барысавага каменя з такім надпісам ніколі не існавала і не магло існаваць, бо полацкі князь Барыс быў сынам славутага Усяслава

Чарадзея. І наогул, полацкія князі не маглі паходзіць ад жамойцкіх, бо княжылі задоўга да апошніх. Гаворка тут можа ісці пра адваротнае — пра паходжанне князёў Літвы ад полацкіх, што мае пад сабой, як мы ўбачым далей, рэальныя падставы.

Пра тое, як фальсіфікаваў Стрыйкоўскі гісторыю ў кірунку перабольшвання літоўскай сілы і небяспекі, яскрава сведчыць такі факт, прыведзены ў свой час М. Дашкевічам. Рускі летапіс пад 1089 і 1103 гг. паведамляў, што на рускую зямлю напалі «прузи», г. зн. саранча. Пад пяром польскага храніста XV ст. Я. Длугаша «прузи» ператварыліся ў прусаў, адно з балцкіх плямёнаў. Стрыйкоўскі ж, беручы гэта месца ў Длугаша, да прусаў дадаў яшчэ літоўцаў і яцвягаў. Так былі ўнесены ў «Хроніку» прыдуманыя напады прусаў, літоўцаў і яцвягаў на рускую зямлю [11].

Такім чынам, у XVI ст. у Маскоўскай дзяржаве і ў Вялікім княстве Літоўскім узнікла версія пра заваяванне Беларусі Літвой. Толькі ў «Сказании о князьях владимирских» даводзілася, што літоўскія князі зрабілі гэта па даручэнні маскоўскага князя, а беларуска-літоўскія летапісы і «Хроніка» Стрыйкоўскага сцвярджалі, што жамойцкія князі па сваёй ініцыятыве ўзялі пад апеку беларускія землі, спустошаныя татарамі. Кожны з гэтых варыянтаў, як мы бачылі, адпавядаў палітычным мэтам варагуючых дзяржаў. У далейшым гістарычная навука высветліла, што не існавала ніякіх ні Мантвіла, ні Ердзівіла, ні Мінгайлы, ні Гінгвіла. Аднак міф пра заваяванне Літвой Беларусі застаўся. На месца іх былі знойдзены іншыя кандыдаты на ролю заваёўнікаў, у прыватнасці Міндоўг, які па сённяшні дзень фігуруе ў гэтай ролі.

Жывучасць версіі пра літоўскае заваяванне Беларусі тлумачыцца тым, што яна была выкарыстана рускай дакастрычніцкай гістарыяграфіяй з мэтай пацвярджэння рэакцыйнага тэзіса пра выратавальнае значэнне для Расійскай імперыі самадзяржаўя. Афіцыйныя гісторыкі і сканструявалі схему, паводле якой Расія ў выніку заняпаду самадзяржаўя слабела, а Літва нібыта ў выніку зараджэння ў ёй моцнай манархічнай улады Міндоўга мацнела і таму яна стала для Рускай дзяржавы такім жа страшным ворагам з захаду, як татары з усходу. В. Таціщчаў казаў: «Тогда татары, нашед, всем обладали, литовцы бывшую под властию многую часть госу-

дарства отторгнули»[12]. Тое ж самае паўтарыў і С. Салаўёў: «Русь находилась между двумя страшными врагами: татарами с востока и Литвой с запада»[13]. Гэта сцвярджалі і іншыя гісторыкі XIX ст. Не дзіўна таму, што ў дакастрычніцкай гістарыяграфіі тэзіс пра літоўскае заваяванне стаў догмай.

На вялікі жаль, і ў савецкай гістарыяграфіі пытанне ўтварэння Вялікага княства Літоўскага таксама не атрымала дэталёвага асвятлення. Таму ў падручніках і працах па гісторыі літоўскае заваяванне Беларусі прымаецца безагаворачна як нешта добра вядомае. Пра гэта сведчыць і кніга У. Пашуты «Образование Литовского государства» (1959), а таксама адпаведныя артыкулы «Советской исторической энциклопедии» і іншыя выданні. Вось характэрнае для сённяшняй гістарычнай навукі тлумачэнне прычын літоўскага заваявання Беларусі і ўтварэння Літоўскай дзяржавы: «Літоўскія князі са сваімі дружынамі, карыстаючыся феадальнай раздробленасцю заходніх земляў Русі і Польшчы, часта ўрываліся ў іх прасторы. Уварванне літоўцаў у заходнія землі Русі стала асабліва частым з другой паловы XII ст. У 20-х гадах XIII ст. дружыны літоўскіх князёў гаспадарылі ў Полацкай зямлі, нападаючы адсюль на паўднёвыя ўскраіны Смаленскага княства і Чарнігаўшчыну. Літоўскія князі, скарыстаўшы цяжкую барацьбу рускага народа з татара-манголамі на ўсходзе і нямецкімі агрэсарамі на захадзе, сталі падначальваць сваёй уладзе землі заходняй Русі. Адзін з літоўскіх князёў Міндоўг падначаліў сабе другіх князёў Літвы і захапіў землі па верхнім цячэнні Нёмана. Гэтым быў пакладзены пачатак стварэнню Літоўскай дзяржавы. Утварэнне яе вызначалася інтарэсамі літоўскіх феадалаў, якія хацелі ўмацаваць сваё панаванне над літоўскім сялянствам і ўсталяваць сваю ўладу ў суседніх землях Русі»[14].

Такім чынам, тут вызначаны наступныя моманты захопу літоўскімі феадаламі беларускіх земляў: 1) раздробленасць беларускіх земляў і, як вынік гэтага, іх слабасць; 2) частыя літоўскія набегі на беларускія і суседнія рускія землі; 3) барацьба рускіх земляў з мангола-татарамі і нямецкімі агрэсарамі як фактар, які аблегчыў заваяванне беларускіх земляў літоўскімі феадаламі; 4) захоп Міндоўгам беларускіх земляў па верхнім Нёмане; 5) утварэнне яе вызначалася інтарэсамі літоўскіх феадалаў.

2

ЦІ ТОЛЬКІ РАЗДРОБЛЕНАСЦЬ І СЛАБАСЦЬ?

Раздробленымі, загразлымі ў міжусобіцах і слабымі паказаны ў даследаваннях і падручніках па гісторыі беларускія землі XII—XIII стст. Яны быццам бы спыніліся ў сваім развіцці і толькі чакалі, калі хто-небудзь іх заваюе і збярэ ў адзінае цэлае, што нібыта і зрабіла Літва, дзе ў выніку развіцця феадалізму ўтварылася дзяржаўная ўлада, абапіраючыся на якую літоўскія феадалы прыгняталі сваіх сялян і заваёўвалі чужыя землі. Чаму не магла ўтварыцца дзяржава на беларускіх землях, дзе феадалізм узнік на некалькі стагоддзяў раней, чым у Літве, і як абыходзіліся беларускія феадалы без дзяржаўнай улады, на гэтыя, як і на іншыя падобныя, пытанні гісторыкі чамусьці адказу не даюць.

Такі погляд на беларускія землі таго часу вынікае з пашыранай у гістарычнай навуцы догмы, паводле якой аб'яднанне Беларусі і ўтварэнне беларускай народнасці і культуры адбывалася ў XIV—XVI стст. пасля так званага літоўскага заваявання Беларусі [15]. У сапраўднасці ж усё было інакш. Працэс збірання паасобных гістарычных абласцей Беларусі ў адзінае цэлае і ўтварэнне беларускай народнасці і культуры пачаўся значна раней XIV ст. Як адзначыў акадэмік Б. Д. Грэкаў, «распад Кіеўскай дзяржавы перш за ўсё вынік росту асобных яго састаўных частак, кожная з якіх стала праводзіць сваю ўласную палітыку, маючы на ўвазе ўласныя мэты» [16]. Гэтым і было абумоўлена з'яўленне новых эканамічных і палітычных цэнтраў, вакол якіх і пачалі фарміравацца на старажытнарускай аснове тэрыторыі ўсходнеславянскіх народнасцей (велікарускай, украінскай, беларускай).

Першапачатковым ядром фарміравання тэрыторыі Беларусі была Полацкая зямля. Як сведчаць навуковыя даследаванні, Полацкае княства, якое жыло «сваім асобным жыццём з першага свайго з'яўлення на гіста-

рычнай сцэне» [17], было «найбольш самастойнай палітычнай адзінкай старажытнай Русі» [18]. Размешчаная на скрыжаванні важнейшых гандлёвых шляхоў і аб'яднаная імі, Полаччына эканамічна ўмацавалася і абагнала ў сваім развіцці некаторыя іншыя землі Кіеўскай Русі [19]. У адрозненне ад усіх іх яна мела сваю княскую дынастыю Ізяславічаў. У ёй склалася багатая арыгінальная культура [20].

Як адзначыў Л. Аляксееў, феадальны клас Полаччыны «раней за феадалаў іншых земляў пачаў пашыраць сваю абласную тэрыторыю» [21]. Вось чаму Полацкае княства, якое ўзнікла ў IX—X стст. на невялікай тэрыторыі па Заходняй Дзвіне ў раёне ракі Палаты [22], ужо к канцу XI ст. «ахоплівала большую частку сучаснай Беларусі. Яно ляжала ў асноўным па Заходняй Дзвіне, Нёмане і Бярэзіне з іх прытокамі» [23]. Хоць у пачатку XII ст. княства падзялілася на асобныя ўдзелы, пашырэнне яго тэрыторыі працягвалася. Найбольш моцны з полацкіх удзелаў — Мінскі — выступаў сапернікам Полацка ў далейшым збіранні беларускіх земляў. Мінскі князь Глеб Усяслававіч выкарыстоўваў зручнае геаграфічнае становішча свайго княства, якое, знаходзячыся на мяжы Нёманскага і Дняпроўскага водападзелаў, займала ключавыя пазіцыі на важнейшых гандлёвых шляхах. Ён імкнуўся далучыць да сваіх уладанняў паўднёвыя (прыпяцкія), заходнія (нёманскія) і ўсходнія (дняпроўскія) землі. Дзеля дасягнення гэтых мэт ён ажыццявіў паходы на Слуцк (1116 г.) і разам з палачанамі — на Навагрудскую і Смаленскую вобласці (1119 г.) [24]. Такім чынам, ужо ў намерах Глеба Менскага акрэсліваюцца ў асноўным контуры будучай Беларусі і цэнтральнае становішча ў ёй Мінска.

Аднак пашырэнне тэрыторыі Полацкай зямлі «не магло не прывесці да сутычкі з інтарэсамі феадалаў суседніх земляў» [25]. Полацкія князі рабілі напады на Ноўгарад, Пскоў, Смаленск. Кааліцыйныя сілы рускіх князёў у сваю чаргу спусташалі Полацкую зямлю, разбуралі яе гарады, нават на некаторы час пазбаўлялі яе самастойнасці і далучалі да Кіева, як, напрыклад, Полацка ў 980 г., Мінска ў 1119 г., Полацка ў 1129 г. Аднак феадальная раздробленасць, якая была вынікам феадальнага спосабу вытворчасці, з'яўлялася на той час заканамерным і прагрэсіўным этапам гістарычнага развіцця. Таму яе нішто не магло спыніць. Вось чаму ні-

якія рашучыя захады кіеўскіх князёў не маглі стрымаць далейшага палітычна-эканамічнага развіцця Полацкай зямлі. Феадальная раздробленасць, як слушна адзначаюць даследчыкі, перш за ўсё праявілася ў Полацкай зямлі, што сведчыла пра яе больш высокае сацыяльна-эканамічнае развіццё ў параўнанні з некаторымі іншымі землямі [26]. Гэта і было прычынай таго, што яна, першай вылучыўшыся з Кіеўскай дзяржавы, у сваю чаргу сама стала дзяліцца на ўдзелы. У кожным з іх замацаваўся той ці іншы род полацкіх князёў. Аднак па-ранейшаму для ўсіх іх быў прывабны Полацкі пасад, які меў значэнне велікакняскага і за які пачалася паміж імі барацьба. Яна дасягнула найбольшай вастрыні ў 50—60-х гадах XII ст.

Аднак феадальная раздробленасць і звязаная з ёю палітычная дэцэнтралізацыя і міжусобная барацьба не маглі цягнуцца без канца. Справа ў тым, што ў нетрах самой феадальнай раздробленасці выспявалі ўмовы для яе адмірання. Ствараючы лепшыя магчымасці для асваення новых земляў і прыродных рэсурсаў, росту гарадоў, развіцця земляробства і рамёстваў, феадальная раздробленасць гэтым самым садзейнічала таварнай вытворчасці, г. зн. вытворчасці непасрэдна для абмену, для гандлю. А гэта ў сваю чаргу вяло да эканамічнага і палітычнага збліжэння паасобных земляў. Менавіта ў Полацкай зямлі, дзе раней пачаўся працэс феадальнай раздробленасці, ён раней і закончыўся. У выніку гэтага і міжусобная барацьба полацкіх князёў паступова заціхла значна раней, чым у іншых старажытнарускіх землях. Ва ўсякім разе яна цягнулася не пазней 1180 г., калі з выключнай яркасцю выявілася адзінства Полацкай зямлі. У паходзе на Друцк, які падпаў пад уплыў Смаленска, удзельнічала шэсць полацкіх князёў, г. зн. уся зямля. Праўда, Л. Аляксееў зазначае, што сярод іх не было мінскіх князёў. Аднак катэгарычна сцвярджаць гэта нельга. Калі не было мінскіх князёў, дык якія ж былі? У летапісе, дзе перадаюцца гэтыя падзеі, толькі адносна трох князёў пазначаны месцы іх княжання (Полацк, Віцебск, Лагойск) [27]. Чацвёрты князь Васілька Брачыславіч, як слушна лічыць Л. Аляксееў, быў ізяслаўскім князем [28]. Але калі ў гэтым паходзе былі лагойскі і ізяслаўскі князі, то ці можна лічыць, што там не было мінскага князя? Ім мог быць Андрэй Валодшыч, сын таго Валодшы, якога ў 1159 г. Глебавічы па-

садзілі ў поруб. Чаму ж паход на Друцк выклікаў такое адзінства полацкіх князёў? Бо тут справа ішла пра абарону эканамічна-гандлёвых інтарэсаў усёй Полаччыны, у прыватнасці пра валоданне важнейшым для Полацкай зямлі Друцка-Ушацкім волакам [29]. Без агульнасці эканамічных інтарэсаў полацкіх земляў не магло быць такога ратнага адзінства, якое выявілася ў 1180 г. Праўда, у 1186 г. лагойскі князь Васілька Валадаравіч і друцкі князь Усяслаў, відаць, пад націскам Смаленска, які не мог прымірыцца са сваім паражэннем у 1180 г., разам з ім і Ноўгарадам выступілі супроць Полацка. Аднак гэты паход закончыўся мірна [30], і ўдзел у ім латойскага і друцкага князёў не перашкодзіў усталяванню згоды між полацкімі ўдзеламі. Гэта пацвярджаюць падзеі 1195 г., калі полацкія князі ўдзельнічалі ў паходзе на Смаленск і адыгралі вырашальную ролю ў перамозе над ім [31]. Тое, што ў летапісе ўжыты выраз «полацкія князі», гаворыць нам, што іх было некалькі, а можа і ўсе. Л. Аляксееў чамусьці сцвярджае, што Друцк і цяпер знаходзіўся пад эгідай смалянаў, на баку якіх змагаўся супраць чарнігаўскіх Ольгавічаў [32]. Аднак гэта яўна супярэчыць летапісу, у якім сказана, што друцкі князь Барыс захапіў у палон смаленскага князя Мсціслава Раманавіча і аддаў яго чарнігаўцам [33]. Удзел у гэтым паходзе друцкага князя сведчыць, што ваенныя падзеі 1180 г. не прайшлі марна: Друцк па-ранейшаму знаходзіўся ў шчыльным саюзе з Полацкам і ў сферы яго ўплыву.

З прычыны далейшага развіцця прадукцыйных сіл феадальнага грамадства і пашырэння гандлю пачаўся працэс феадальнай канцэнтрацыі, на аснове якога ішло збліжэнне асобных тэрыторый Полацкай зямлі. І хаця ўдзелы працягвалі існаваць яшчэ доўгі час, аднак міжусобная барацьба паміж імі не адзначана ў крыніцах, як, напрыклад, у сярэдзіне XII ст. Эканамічныя інтарэсы бралі верх і прымушалі падначальвацца ім. Характэрная ў гэтых адносінах грамата полацкага князя Ізяслава (1265 г.), у якой ён піша: «Полотеск Видьбеск одно есть» [34]. Гэта грамата выяўляе і прычыну такога адзінства — гандаль па Заходняй Дзвіне: «Полочаном Видьбляном вольное торгованье в Ризе, на Готьском березе и в Любце». Тут зноў выяўляецца яскравая карціна таго, як эканамічныя інтарэсы бяруць верх над княскімі адносінамі. Палітычна Полацк і Віцебск —

два княствы, у эканамічных жа адносінах — «одно есть». Такім чынам, няма падстаў гаварыць пра міжусобіцы князёў у канцы XII і ў першай палове XIII ст. Пра палітычную ўстойлівасць унутры Полацкай зямлі ў гэты час сведчыць і тое, што на полацкім пасадзе на працягу 30 гадоў (1186—1216) княжыў адзін князь — Уладзімір Полацкі. Цяжка знайсці ў іншых старажытнарускіх землях такі фенаменальны для часоў удзельшчыны факт. Згуртаванню Полацкай зямлі спрыяла і яе барацьба з крыжацкай агрэсіяй, пра што будзе гаворка далей. Усё адзначанае сведчыць, што напярэдадні і ў час утварэння Вялікага княства Літоўскага Полацкая зямля ўяўляла сабой больш-менш адзінае цэлае і пра міжусобную барацьбу ў ёй не можа быць гаворкі.

У Турава-Пінскім княстве таксама назіралася тэндэнцыя да збліжэння з іншымі беларускімі землямі, якая праявілася ўжо ў пачатку XII ст. Нездарма ж Глеб Менскі хацеў сілай паскорыць гэты працэс, імкнучыся далучыць да сваіх уладанняў прыпяцкія землі, чым наклікаў на сябе вялікі гнеў і жорсткую помсту кіеўскага князя. У сувязі з гэтым нам хочацца звярнуць увагу на наступны факт. Далучыўшы часова да сваіх уладанняў у 1119 г. Мінск, кіеўскі князь у 1131 г. аддаў мінскаму князю Ізяславу Тураў і Пінск [35], якія былі ў сферы ўплыву Кіева. І справа, вядома, не толькі ў тым, што Ізяслаў быў іх стаўленікам (у часы ўдзельшчыны ўсе князі лёгка пранікаліся мясцовымі інтарэсамі). Галоўнае ў тым, што ўжо тады, відаць, пачалі вызначацца эканамічныя сувязі Турава-Пінскай зямлі з Мінскам і, як паказала гісторыя, гэтыя сувязі былі невыпадковымі. Яны ўвесь час мацнелі, што і прывяло ў будучым да з'яднання Турава-Пінскай зямлі з усёй Беларуссю.

У 1158 г. Тураў выйшаў з-пад улады Кіева і ў ім асела самастойная княская дынастыя. І хоць на тэрыторыі Турава-Пінскай зямлі ўзнік шэраг асобных удзелаў (Тураўскі, Пінскі, Дубровіцкі, Слуцкі, Клецкі і інш.), аднак князі іх дзейнічалі згуртавана. У пачатку XIII ст. Турава-Пінская зямля, пераадольваючы імкненне галіцка-валынскіх князёў падначаліць яе сабе, усё больш і больш звязвае свой лёс з Новагародскай зямлёй. Нездарма ж у 1228 г. новагародцы ўдзельнічалі на баку Расціслава Пінскага ў яго барацьбе з Данілам Галіцкім, а ў 1263 г. іх князь Войшалк пры дапамозе пінянаў заваёўваў Літву [36]. І гэтыя сувязі былі невыпадковыя.

Менавіта ў канцы XII і пачатку XIII ст. па сваім эканамічна-палітычным развіцці на першае месца сярод іншых беларускіх земляў выйшла Новагародская зямля, якую многія даследчыкі неправамерна называюць Чорнай Руссю (у той час яна не мела такой назвы). На вялікі жаль, гістарычная навука вельмі мала надавала ёй увагі і разглядала яе не як суб'ект гісторыі, а толькі як аб'ект заваёўніцкіх дзеянняў суседзяў. Так, У. Пашута характарызаваў яе «як вельмі істотны фактар гісторыі Літвы» [37]. Пытанне аб ролі Новагародскай зямлі ў гісторыі Беларусі, у аб'яднанні беларускіх земляў навукай не распрацавана.

Летапісныя паведамленні і асабліва археалагічныя даследаванні, праведзеныя ў апошнія дзесяцігоддзі, даюць магчымасць па-новаму зірнуць на гэту гістарычную вобласць Беларусі. На долю Новагародскай зямлі выпала гістарычная роля стаць у другой палове XIII ст. ядром аб'яднання беларускіх і балцка-літоўскіх земляў у адзіную дзяржаву. У адрозненне ад Полацкай і Тураўскай земляў яна была параўнальна новай гістарычнай вобласцю Беларусі, якая ўзнікла на левым беразе верхняга Нёмана. Яе фарміраванне пачалося з часу заснавання Новагарадка (сучасны Навагрудак), наконт чаго выказана некалькі меркаванняў. М. Дзмітрыеў у 1858 г. сцвярджаў, што Новагарадок быў заснаваны ў 1116 г. сынам Уладзіміра Манамаха Яраполкам [38]. Аднак гэта не пацвярджаецца верагоднымі крыніцамі. М. Ціхаміраў лічыў, што Новагарадок упершыню ўпамінаецца ў 1212 г. [39] Ён спасылаўся на наступнае месца Іпацъеўскага летапісу: «В лето 6720. Король отья Перемышль от Лесьтька Любачев. Лесьтько же зжалися о срамоте своей и после к Новогороду по Мстислава и реки братьми еси поиди и сяди в Галиче» [40]. Але тут, як бачым, гаворка ідзе аб нейкім Новагарадзе ў Галіцкай зямлі.

Аднак найбольш верагодна, што да Новагарадка адносіцца запіс у Сафійскім I летапісе, дзе пад 1044 г. сказана: «Ходи Ярослав на Литву, а на весну заложил Новогород и сделал и». Такі ж запіс і пад тым жа годам маецца ў Наўгародскім IV летапісе [41] і ў В. Таціщава [42]. Гэты гісторык быў першым, хто выказаў думку, што ўпомнены тут Ноўгарад і ёсць Новагарадок Літоўскі [43], г. зн. сучасны Навагрудак. Аднак яна засталася незаўважанай і забытай. На карысць яе гаворыць на-

ступнае. Ва ўсіх указаных вышэй летапісах заснаванне Новагарадка звязваецца з паходам Яраслава Мудрага на Літву. А ў той час, як убачым, пад Літвой разумелася не сучасная Літва, а тэрыторыя Верхняга Панямоння. Менавіта паход Яраслава Мудрага і меў за мэту заваяванне гэтай Літвы. А. Ельскі адзначаў, што Новагарадок узнік на мяжы Старажытнай Літвы і яцвягаў [44], што і слушна, бо пацвярджаецца летапісам, у якім сказана, што паход на Літву Яраслаў Мудры зрабіў пасля паходу на яцвягаў у 1038 г. [45] Аб населенасці Новагародскай зямлі ў мінулым яцвягамі сведчыць тапанімія [46]. Тое, што яцвягі складалі значную частку насельніцтва ў Новагародскай зямлі, гаворыць за іх важкі ўклад, які яны ўнеслі ў справу ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. Праўда, Ф. Гурэвіч аспрэчвае ўказаную дату заснавання Новагарадка. Аднак яе довады вельмі няпэўныя, бо ў адной працы яна сцвярджае, што гэты горад заснаваны ў першай палове XI ст. [47], у другой сказана, што ў другой палове XI ст. [48], пры гэтым не тлумачыць, чаму яна змяніла сваю думку. Пабудова Новагарадка павінна была забяспечыць панаванне Кіева над яцвягамі і Літвой, аб чым і сведчыць хуткая пабудова горада, якая, паводле В. Таціщава, працягвалася толькі вясну і лета. Горад адначасова стаў і важным цэнтрам славянскай каланізацыі, аб чым сведчыць наступнае паведамленне Таціщава. На падставе летапісу, які меўся ў яго распараджэнні, ён пісаў, што ў 1119 г. мінскі князь Глеб ваяваў Новагародскую (Навагрудскую) вобласць [49], што належала аднаму з сыноў Уладзіміра Манамаха. Гэта паведамленне, сведчачы пра залежнасць Новагарадка ад Кіева, у той жа час паказвае рост яго, які быў вынікам каланізацыі і сцягвання вакол сябе пэўнай тэрыторыі, што і прывяло да ўтварэння Новагародскай вобласці. Каштоўнай з'яўляецца наступная вестка пра Новагарадок, якую знаходзім зноў-такі ў В. Таціщава. У ёй паведамляецца, што ў 1130 г. кіеўскі князь Мсціслаў пасля паходу ў Літву вярнуўся ў Новагарадок, дзе заклаў царкву (відаць, яе рэшткі выявіў М. К. Каргер у 1961 г. [50]), і адтуль пайшоў у Кіеў [51]. Гэта паведамленне пацвярджае значэнне Новагарадка як апорнага пункта кіеўскіх князёў для сваіх паходаў на Літву.

Амаль праз стагоддзе зноў з'яўляецца вестка аб Новагарадку на старонках Іпацьеўскага летапісу. У ім пад

1228 г. паведамляецца аб удзеле новагародцаў разам з тураўцамі і пінянамі ў кааліцыі з іншымі князямі ў паходзе на Камянец супраць Данілы Галіцкага [52]. На падставе гэтага можна меркаваць, што барацьба паміж Кіевам і Галічам у той час ішла ў значнай меры з-за Турава-Пінскай і Новагародскай земляў. Гэта тым больш верагодна, што наступнае паведамленне Іпацьеўскага летапісу пад 1235 г. ясна гаворыць аб залежнасці Новагарадка і Літвы ад Данілы Галіцкага: «Даниил возведе на Конрада Литву Мандога Изяслава Новогородьского» [53]. Самае каштоўнае ў гэтай вестцы тое, што, паводле яе, Новагарадок меў свайго князя. Аднак Новагарадок не быў толькі цэнтрам асобнага княства. Летапісныя звесткі 50—60-х гадоў XIII ст. гавораць аб наяўнасці цэлай гістарычнай вобласці — Новагародскай зямлі [54].

Да сярэдзіны XIII ст. Новагародская зямля дасягнула высокага эканамічнага і культурнага развіцця. Гэтаму садзейнічаў шэраг прычын. Тут было добра развітае земляробства, якому спрыяла ўрадлівая глеба, што не патрабавала вельмі цяжкай апрацоўкі (чаго не было ў Падзвінні). Новагародская зямля была краінай развітых рамёстваў. Тут выплаўлялася жалеза і была наладжана вытворчасць разнастайных вырабаў з яго, апрацоўваліся каляровыя і каштоўныя металы. Існавалі ганчарнае, кастарэзнае і іншыя рамёствы [55].

Усё гэта ў першую чаргу адносіцца да Новагарадка. Так, па насычанасці жалезнымі знаходкамі ён адзін з самых багатых у гэтых адносінах гарадоў [56]. Можна меркаваць, што адной з прычын хуткага эканамічнага росту Новагарадка з'яўлялася тое, што ён быў размешчаны побач з багатымі пакладамі балотнай руды, пра што можа сведчыць назва блізкага пасёлка Руда. Аднак вядучай галіной у Новагарадку была апрацоўка каляровых і каштоўных металаў. Праца кавалёў па золату і ювеліраў к XII ст. набыла асаблівае значэнне. Яна ператварыла іх у досыць заможных гарадскіх жыхароў [57].

Адначасова археалагічныя матэрыялы сведчаць, што Новагарадок вызначаўся не толькі інтэнсіўным унутраным жыццём, але і меў шырокія знешнія сувязі. У гэтых адносінах асабліва паказальны такі факт. Новагарадок, які па памерах сваёй умацаванай часткі (2,5 га) належыць да невялікіх гарадоў, па знаходках імпарт-

ных прадметаў раскошы сапернічае з усімі старажытнарускімі гарадамі, мае унікальныя рэчы. Новагародскі імпарт з поўнай падставай дазваляе лічыць, што ў XII—XIII стст. горад вёў інтэнсіўны гандаль рускімі і заморскімі таварамі. Новагарадок вёў ажыўлены гандаль з паўднёварускімі гарадамі, з Полацкам, з Прыбалтыкай і Польшчай, з Візантыяй і Блізкім Усходам [58].

У выніку развіцця рамёстваў і гандлю і наяўнасці густога сельскага насельніцтва на параўнаўча невялікай тэрыторыі Новагародскай зямлі было шмат гарадоў: апроч сталічнага Слонім, Ваўкавыск, Гарадзен (Гродна), Здзітаў, Зэльва, Свіслач і інш. Хоць летапіс іх упершыню называе толькі ў XIII ст., але яны, як паказвае археалогія, узніклі значна раней — у канцы X—пачатку XI ст. Як сведчыць Іпацьеўскі летапіс, у Новагарадку (1235) [59], у Гародні (1128 і інш.) [60], Ваўкавыску (1256) [61], Свіслачы (1256) [62] былі свае князі. Можна думаць, што яны былі і ў іншых гарадах, як, напрыклад, у Слоніме (пад 1281 г. у Іпацьеўскім летапісе ўпамінаецца Васілька Слонімскі, магчыма, князь). Значыць, гэтыя гарады з'яўляліся цэнтрамі асобных удзелаў. Аднак усе яны шчыльна гуртаваліся вакол Новагарадка, князь якога, магчыма, меў для ўсіх іх значэнне вялікага князя. Цэнтральнае становішча Новагарадка і вызначыла назву гэтай зямлі. Летапісы не зарэгістравалі ніводнага выпадку міжусобнай барацьбы яе князёў. Новагародская зямля была краінай развітога феадальнага грамадства. Ужо ў XI ст. тут панаваў феадалізм і вылучылася сацыяльная верхавіна грамадства, быт якой вызначаўся выключнай раскошай [63]. Наяўнасць багатых магіл побач з мноствам безынвентарных сведчыць пра рэзкую класавую дыферэнцыяцыю грамадства Новагародскай зямлі [64]. Аб высокім сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці Новагародскай зямсведчаць і археалагічныя даследаванні Ваўкавыска [65], Слоніма [66], Здзітава [67]. Асабліва ў гэтых адносінах вызначаўся Гарадзен (Гродна). Археалогія сведчыць аб высокім і рознабаковым развіцці яго культуры. Тут, як і ў Полацку, у XII ст. склалася свая самабытная архітэктура, найбольш выдатным помнікам якой з'яўляецца Каложская царква [68].

Новагародская зямля мела выгаднае геаграфічнае становішча, і гэта асабліва праявілася ў сярэдзіне XIII ст.: «У перыяд двух вялікіх бедстваў, якія абрушы-

ліся на Кіеўскую Русь, Польшчу і Прыбалтыку,— мангольскага заваявання і крыжовых паходаў,— Беларускае Панямонне было адносна бяспечнай тэрыторыяй»[69]. І таму яно з сярэдзіны XIII ст. стала прытулкам для прадстаўнікоў насельніцтва многіх абласцей Усходняй Еўропы, якія ратаваліся ад жорсткіх заваёўнікаў з усходу і захаду[70]. Прыліў новага насельніцтва, зразумела, не мог не выклікаць яшчэ большага развіцця прадукцыйных сіл Новагародскай зямлі, што ў першую чаргу выкарысталі для свайго ўзбагачэння яе феадалы. Маючы ў сваіх руках вялікія багацці, яны былі зацікаўлены ва ўстанаўленні больш моцнай дзяржаўнай улады, з дапамогай якой можна было б трымаць у пакорнасці сялян і рамеснікаў, захопліваць новыя землі.

Адначасова тут ва ўмовах скрыжавання этнічна разнастайнага насельніцтва фарміравалася новая арыгінальная культура. Даныя археалогіі паказваюць, што ў ёй «дзівосна перапляталіся мясцовыя, паўднёвыя і заходнія рысы, але дамінавала ўсходнеславянская культура. Вельмі магчыма, што менавіта ў гэтых умовах былі закладзены першыя асновы беларускай народнасці»[71]. Як бачым, найноўшыя навуковыя даныя адхіляюць укаранелую ў навуцы думку, паводле якой фарміраванне беларускай народнасці і культуры пачалося пасля ўваходжання Беларусі ў склад Вялікага княства Літоўскага, дзесьці ў XIV—XVI стст.

Усё разам узятае — высокае эканамічнае развіццё, прыліў новага насельніцтва, што абумовілі далейшы рост прадукцыйных сіл, канцэнтрацыя вялікіх багацця ў руках новагародскіх феадалаў і далейшае ўмацаванне іх улады — павялічвала палітычную вагу Новагародскай зямлі сярод іншых гістарычных абласцей Беларусі і дало ёй магчымасць стаць новым дзяржаваарганізуючым цэнтрам беларускіх і размешчаных сярод іх балцка-літоўскіх земляў.

Наяўнасць мяшанага дрыгавіцка-крывіцкага насельніцтва і інвентар могільнікаў[72], тып жыллёвых збудаванняў[73] пераканаўча сведчаць пра шчыльныя эканамічныя і культурныя сувязі Новагародскай зямлі з Полаччынай. Новагародскі храм XII ст. носіць на сабе яскравыя сляды ўплыву полацка-віцебскага дойлідства[74]. Нездарма ж некаторыя даследчыкі лічылі, што Новагародская зямля належала Полацкаму княству[75]. Ва ўсякім разе бясспрэчна тое, што працэс узаемнага

эканамічнага і культурнага збліжэння паміж беларускімі землямі ў XII—XIII стст. не толькі не абмінуў Новагародскую зямлю, але і выразней за ўсё тут праявіўся. Эканамічна магутныя новагародскія феадалы шмат зрабілі для збірання ў адзінае цэлае беларускіх земляў, эканамічнае і культурнае збліжэнне якіх пачалося раней.

Значэнне Новагародскай зямлі як цэнтра новай дзяржавы добра разумелі галіцка-валынскія князі, якія самі прэтэндавалі на ролю збіральнікаў паўднёва-заходніх і заходніх старажытнарускіх земляў. І таму аслабленне і захоп яе было іх мэтай. Аднак манголататарскае нашэсце аслабіла Галіцка-Валынскую зямлю, і яе князі павінны былі саступіць ролю збіральнікаў гэтых земляў Новагарадку.

Такім чынам, у сярэдзіне XIII ст. цэнтр палітычнага жыцця Беларусі перайшоў з Полацка ў Новагарадок, які стаў асяродкам зараджэння новай дзяржаўнасці. Вядома, гэта не гаворыць аб страце Полацкам свайго значэння ў далейшай гісторыі Беларусі. Ён яшчэ доўгі час быў цэнтрам сваёй зямлі і адыгрываў вялікую ролю ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці ўсёй дзяржавы. Такім чынам, не ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага было перадумовай фарміравання тэрыторыі Беларусі і беларускай народнасці і культуры, а, наадварот, працэс фарміравання тэрыторыі Беларусі, беларускай народнасці і культуры, які праходзіў на грунце эканамічнага і культурнага збліжэння беларускіх земляў, і зараджэння новай дзяржаўнасці ў Новагарадку быў перадумовай утварэння Вялікага княства Літоўскага.

3

ДЗЕ БЫЛА ЛЕТАПІСНАЯ ЛІТВА?

Пытанне аб месцазнаходжанні летапіснай Літвы — адно з найважнейшых у нашым даследаванні. Сапраўды, дзе была тая зямля, імя якой пасля дало назву адной з буйнейшых дзяржаў у Еўропе? Гэта праблема патрабуе дэталёвага разгляду, бо з яе заблытвання найперш і пачынаецца заблытванне гісторыі ўтварэння Вялікага княства Літоўскага.

У розныя гістарычныя перыяды пад Літвой разумелі не адну і тую ж тэрыторыю, не адзін і той жа народ. Яшчэ ў канцы XIX ст. А. Качубінскі аспрэчваў тых вучоных, якія «сучаснае этнаграфічнае становішча Літвы ўзводзілі ў становішча дагістарычнае, ад веку непарушнае» [76]. На жаль, гэта слушная думка была пакінута ў навуцы па-за ўвагай, і па-ранейшаму ў даследаваннях і падручніках па гісторыі старажытная Літва XI—XIII стст. (уласна Літва) атаясамліваецца з іншай гістарычнай вобласцю — Аўкштайціяй, якая займала ўсходнюю частку сучаснай Літвы [77].

Адной з прычын атаясамлівання летапіснай Літвы і Аўкштайціі з'яўляецца тое, што апошняя ў старажытнарускіх летапісах не згадваецца. Таму быў зроблены вывад, што яна выступае тут пад назвай Літвы [78]. Гэта стала агульнапрынятым, што і стрымлівала далейшае высвятленне пытання, дзе была летапісная Літва XI—XIII стст. Даследчыкі, замест таго каб уважліва прачытаць і прааналізаваць адпаведныя месцы летапісаў з мэтай даць адказ на гэта пытанне, бяздоказна паўтаралі: Літва — гэта Аўкштайція. Аднак Літва XI—XIII стст.— гэта зусім не Аўкштайція і знаходзілася яна не там, дзе яе змяшчаюць даследчыкі.

Адказ на пытанне, дзе была летапісная Літва, даюць галоўным чынам некаторыя запісы нашых летапісцаў. Паведамленні гэтыя, як убачым, пацвярджаюцца тапанімікай і іншымі матэрыяламі.

Іпацьеўскі летапіс пад 1159 г. паведамляе пра тое, што мінскі князь Валадар Глебавіч «ходяше под Литвою в лесех»[79], а пад 1162 г., што ён жа выступіў на свайго праціўніка «с Литьвою»[80]. Адсюль бачна, што Літва знаходзілася па суседству з Мінскім княствам. Да такой самай высновы, грунтуючыся на тых жа летапісных звестках, прыйшоў і А. Насонаў[81].

Тэрыторыю, якая ляжала на захад ад Мінска, як Літву паказвае, але ўжо з боку Новагарадка (і гэта асабліва каштоўна), запіс Іпацьеўскага летапісу пад 1262 г. Паведамляецца, што князь Войшалк «учини собе манастырь на реце на Немне, межи Литвою и Новымгородком»[82]. Як вядома, Войшалк заснаваў манастыр пры ўпадзенні ракі Валаўкі ў Нёман, там, дзе цяпер знаходзіцца в. Лаўрышава[83] (на паўночны ўсход ад Навагрудка). Такім чынам, згодна з летапісам, на паўночны ўсход ад Лаўрышава, за Нёманам, у кірунку Мінска знаходзілася Літва, што цалкам адпавядае летапісным звесткам 1159 і 1162 гг. Калі б пад Літвой тут разумелася Аўкштайція, то летапісец ніяк не сказаў бы, што заснаваны Войшалкам манастыр быў паміж Літвою і Новагарадком, бо Аўкштайція знаходзілася ад Новагарадка не ў паўночна-ўсходнім, а ў паўночна-заходнім кірунку.

Летапісная Літва была не толькі на правым, але і на левым беразе Нёмана. У 1190 г. князь Рурык Расціслававіч вырашыў дапамагчы сваім родзічам — пінскім князям у барацьбе з Літвой і сабраўся ў паход на яе, але не здолеў дайсці туды, бо зрабілася цёпла і снег растаў, а ў гэтай балоцістай краіне толькі і можна ваяваць у моцныя халады[84]. З гэтага можна зрабіць вывад, што Літва была недалёка ад Пінскай зямлі, за яе балотамі. Пра гэта таксама сведчыць Іпацьеўскі летапіс пад 1246 г. Ён паведамляе пра літву, якая, зрабіўшы набег на Перасопніцу (на Валыні), вярталася праз Пінскую зямлю назад, дзе і была разбіта галіцка-валынскімі князямі[85]. У наступным годзе «літва» напала на Мельніцу і Лякоўню (таксама на Валыні) і зноў вярталася праз Пінскую зямлю, дзе таксама была разбіта[86]. У 1262 г. атрады «літвы», пасланыя Міндоўгам на валынскія гарады, адступалі: адзін — у кірунку Ясельды[87], а другі — да Небля[88], г. зн. у бок Пінскай зямлі, як і ў папярэдніх выпадках. Паколькі кожны раз зваротны шлях «літвы» праходзіў праз Пінскую зямлю, то

можна зрабіць вывад, што Літва знаходзілася дзесьці па суседству з ёй. Так яно і было, што непасрэдна пацвердзіў Іпацьеўскі летапіс. Пад 1253 г. у ім гаворыцца, як галіцка-валынскія князі, ідучы праз Пінск на Новагарадок, сустрэлі на сваім шляху літву: «И послаша сторожу Литва на озеро Зьяте (у сярэдзіне XVI ст. пры перапісе пінскіх пушчаў яно ўжо называлася балотам [89]) и гнаше через болото до реки Щарье» [90]. «Старожа» звычайна высылалася для аховы межаў краіны. З гэтага вынікае, што Літва знаходзілася дзесьці ў вярхоўі левага прытока Нёмана—Шчары. Дарэчы, назва гэта балцкага паходжання, азначае «вузкая» [91].

Гэта Літва прыкрывала сабой Новагародскую зямлю з паўднёвага ўсходу, бо галіцка-валынскія войскі, перамогшы яе, «наутрея же плениша всю землю Новогородьскую» [92]. Пра такое ж месцазнаходжанне Літвы гаворыць і запіс Іпацьеўскага летапісу пад 1255 г.: «Данилови же (Даніла Галіцкі) пошедшу на войну на Литву, на Новогородок» [93]. Гэта значыць, што галіцкія войскі ішлі на Новагарадок той жа дарогай, што і ў 1253 г., а менавіта праз Літву. Гэтыя факты, відаць, і мела на ўвазе Ф. Гурэвіч, калі зазначыла, што ў летапісных звестках пра Навагрудак у 50—70-х гадах XIII ст. «апавядаецца аб пранікненні галіцка-валынскіх князёў з Літвы ў гэты горад» [94]. У Т. Нарбута мы чытаем аб тым, што ў 1405 г. тураўскі біскуп Антоній са згоды Вітаўта хрысціў у Літве народ у праваслаўную веру [95]. Было незразумела, чаму менавіта тураўскі біскуп хрысціў Літву, якая, калі яе атаясамліваць з Аўкштайціяй, знаходзілася далёка ад Турава. Але ў святле папярэдне сказанага ўсё становіцца ясным. Літва была па суседству з Турава-Пінскай зямлёй, і таму зусім натуральна, што яе хрысціў тураўскі біскуп.

У свой час А. Качубінскі меркаваў, што назва «Літва», звязваючыся з корнем «лі» ў нашым «ліць», у літоўскім «ліетус» (дождж), азначае жыхароў вільготнай мясцовасці. Ён сцвярджаў таксама, што назва «дрыгавічы» таксама літоўскага паходжання («дрэгнас» — палітоўску «вільготны») [96]. Тое, што летапісная Літва ў старажытнасці знаходзілася па суседству з балоцістай Турава-Пінскай зямлёй, населенай дрыгавічамі, пацвярджае гэтыя меркаванні даследчыка. Пра такое суседства сведчаць і археалагічныя даследаванні. В. Сядоў на іх падставе лічыць, што дрыгавічы далей

на поўнач ад Выганаўскага балота не жылі нават у адносна позні час [97]. Менавіта Выганаўскае балота было прыроднай мяжой паміж Пінскай зямлёй і летапіснай Літвой. Яно ж было прычынай і таго, што дрыгавіцкая каланізацыя летапіснай Літвы значна замарудзілася і таму гэта апошняя магла так доўга праіснаваць. У згодзе з прыведзенымі фактамі знаходзіцца і паведамленне М. Стрыйкоўскага пра літву над Нёманам, «якая жыла ў пушчах і здаўна прыслужвала Навагрудскаму княству» [98].

Характэрна, што на тэрыторыі, якая ў летапісах выступае пад назвай Літвы, да сённяшняга дня захаваўся тапонім «Літва». Населеныя пункты з такой назвай мы сустракаем у Слонімскім (Гродзенская вобл.), Ляхавіцкім (Брэсцкая вобл.), Уздзенскім, Стаўбцоўскім, Маладзечанскім (Мінская вобл.) раёнах. Гэта карэнныя назвы, якія супадаюць з летапіснай назвай «Літва» і якія маюцца толькі ва ўказаным рэгіёне. Іх трэба адрозніваць ад тапонімаў тыпу «Літвінава», «Літвінавічы», «Ліцвякі» і ім падобных, якія маюцца ў іншых мясцінах Беларусі, Расіі, Украіны. З'яўленне іх там звязана з высяленцамі з Літвы ў тыя мясцовасці. Адзін з такіх тапонімаў — «Літвілішкі» — выяўлены намі на тэрыторыі Аўкштайціі (былая Мукснікаўская вол. Віленскага пав.). І побач з ім — тапонім «Мінчукі» [99]. Зразумела, што яны былі заснаваны выхадцамі з летапіснай Літвы і суседняй з ёй Міншчыны.

Летапісныя даныя і тапаніміка даюць магчымасць арыенціровачна вызначыць тэрыторыю Старажытнай Літвы. На поўначы яна межавала з Полацкім княствам па нёманскай Бярэзіне. Пазней яна была зблытана з дняпроўскай Бярэзінай, якую і лічылі мяжой Літвы з Руссю. Так, маскоўскія паслы, прад'яўляючы прэтэнзіі на беларускія гарады, гаварылі паслам Вялікага княства Літоўскага: «...а рубеже был тем городам с Литовской землею по Березыню» [100]. Пра літоўска-полацкае сумежжа тут сведчаць і размешчаныя побач тапонімы «Літва» і «Палачаны» (Маладзечанскі р-н). Па гэтай жа Бярэзіне ішла паўночна-заходняя мяжа Літвы з Нальшчанамі. На ўсходзе Літва межавалася з Мінскім княствам, заходні рубеж якога не ішоў далей ракі Усы (прыток Нёмана) [101]. На ўсходзе левабярэжжа верхняга Нёмана Літва ў глыбокай старажытнасці суседнічала з другім балцкім племем — лотвай, пра што сведчаць

аднайменны гідронім (Капыльскі р-н) і тапонімы «Вялікая Лотва» і «Малая Лотва» (Ляхавіцкі р-н) [102]. Не выключана, што менавіта адсюль і пачалося рассяленне літвы і лотвы: першай — на паўночны захад, другой — на поўнач і паўночны ўсход [103]. Далей мяжа Літвы пераходзіла на р. Шчару, вялікі паўднёвы выгіб якой і з'яўляўся прыродным рубяжом Літвы на паўднёвым усходзе, поўдні і паўднёвым захадзе. Прыкладна па вярхоўі р. Мышанкі і па ніжнім цячэнні р. Валаўкі ішоў заходні рубеж Літвы, які ў больш старажытныя часы аддзяляў яе ад яцвягаў.

Для навукі мае прынцыповае значэнне высвятленне пытання, дзе была «Літва Міндоўга», бо менавіта з яе пачаўся працэс аб'яднання балцка-літоўскіх плямёнаў. У. Пашута паказваў яе ў Аўкштайціі, на тэрыторыі, якая ўключала гарады Вільню, Трокі, Кернаў, Дзялтуву, Укмерге [104]. Але на гэтай самай карце ён змяшчаў (праўда, з пытальнікам) г. Варуту, дзе, як адзначана ў летапісе пад 1252 г., бараніўся Міндоўг ад сваіх супраціўнікаў [105], на месцы сучаснага пасёлка Гарадзішча (Баранавіцкі р-н), што вельмі далёка ад Аўкштайціі. У сувязі з гэтым узнікае пытанне, чаму Міндоўг бараніўся ад ворагаў не ў «Літве Міндоўга», а ў Новагародскай зямлі, чаму ён кінуў «сваю» Літву і прыйшоў шукаць абарону ў чужой зямлі. У. Пашута не ставіў гэтых пытанняў і, натуральна, не даў на іх адказу, як і не тлумачыў, чаму ён меркаваў, што Варута знаходзілася на месцы сучаснага Гарадзішча.

Але ўся справа ў тым, што «Літва Міндоўга», як і ўся Літва, знаходзілася не ў Аўкштайціі, а ў Верхнім Панямонні, дзе і Варута. Ужо летапіснае паведамленне, што «Даниил возведе на Кондрата Литву Миндовга Изяслава Новогородского» [106], дае зразумець, што «Літва Міндоўга» і Новагарадок знаходзіліся блізка адзін ад другога. Відаць, гэта апошняе было прычынай таго, што Э. Гудавічус, які прысвяціў «Літве Міндоўга» спецыяльнае даследаванне і які лічыць, што яна знаходзілася на поўдні сучаснай Літвы, нават не ўказаў, дзе і ў якім кантэксце яна ўпамінаецца [107]. Блізкасць «Літвы Міндоўга» ад Новагарадка дае магчымасць вызначыць (хоць прыблізна) месцазнаходжанне Варуты. Хаця яе атаясамліванне з сучасным Гарадзішчам не можа з'яўляцца бясспрэчным, аднак яно можа быць блізкім да ісціны. Мы са свайго боку пра месцазнахо-

джанне і назву Варуты выказваем такое меркаванне. Між рэкамі Сэрвеччу і Валоўкай ёсць невялічкая рэчка Рута і некалькі населеных пунктаў з такой назвай. Магчыма, на месцы аднаго з іх і знаходзілася Варута. У першапачатковай рэдакцыі летапісу, створанай, як меркаваў У. Пашута [108], у Новагарадку, магло быць напісана, што Міндоўг «вниде во град во Руту». Паўтарэнне прыназоўнікаў характэрна для Новагародскага летапісу: «на реце на Немне», «за Домонтом за Нальшанским», «На Романа на Брянского» [109]. Пазнейшы рэдактар, устаўляючы Новагародскі летапіс у Галіцка-Валынскі, мог, не разабраўшыся, «во Руту» прыняць за адно слова і, зрабіўшы іншыя рэдакцыйныя змены, напісаць «вниде во град именем Ворута». Магчыма, што Варута знаходзілася на месцы сучасных Карэлічаў, якія размешчаны на р. Рута і дзе ёсць гарадзішча [110].

Менавіта «Літву Міндоўга» разам з правабярэжнай Літвой і Нальшчанамі ваяваў у 1258 г. татарскі ваявода Бурундай [111]. Але Р. Батура мяркуе, што пад «зямлёй Літоўскай» у летапісе трэба разумець Новагародскае княства, якое нібыта ўжо належала Літве [112]. Аднак ён не ўлічыў таго, што ў гэты час Новагарадок не атаясамліваўся з Літвой, пра што сведчыць згаданае вышэй летапіснае паведамленне аб заснаванні Войшалкам манастыра паміж Літвой і Новагарадком. У 1262 г. Міндоўг помсціў валынскаму князю Васільку за яго ўдзел у паходзе Бурундая нападам на валынскія гарады. Паказальна, што атрады «літвы» і ў гэты раз адступалі праз Пінскую зямлю [113], што яшчэ раз сведчыць аб знаходжанні «Літвы Міндоўга» паміж Пінскай і Новагародскай землямі. З гэтага вынікае, што Бурундай мог ваяваць адзіную ў той час Літву, якая знаходзілася ў Верхнім Панямонні і з якой ён перайшоў у Нальшчанскую зямлю. Хоць апошняя пакуль што даследчыкамі дакладна не лакалізавана, аднак бясспрэчна, што яна, мяжуючы з Літвой, знаходзілася на паўночным захадзе сучаснай Беларусі. І калі Бурундай, рухаючыся з паўднёвага ўсходу, прайшоў праз Літву ў Нальшчаны, то лівонцы і рыжане, якія рухаліся з паўночнага захаду, праз Нальшчаны (durch Nalsen) [114] праніклі ў Літву. Гэта яскравае супадзенне ў паказаннях Іпацьеўскага летапісу і Лівонскай Рыфмаванай хронікі — яшчэ адно відавочнае сведчанне, дзе была старажытная Літва. Суседствам Новагарадка і «Літвы

Міндоўга» тлумачыцца факт з'яўлення апошняга ў гэтым горадзе, аб чым будзе ісці гаворка ніжэй.

Было зроблена пярэчанне, што тэрыторыю, паказаную намі як Літву, з IX ст. займалі славяне і што тут з X ст. існаваў старажытнарускі горад Ізяслаўль [115]. Аднак славяне на гэтым месцы, як і на ўсёй тэрыторыі Беларусі, не былі аўтахтонамі, бо да іх, як зазначае Ф. Гурэвіч, «тут жылі балцкія плямёны культуры штрыхаванай керамікі» [116]. На гэта ўказваюць і археалагічныя помнікі, такія, як Гарадзішча (Баранавіцкі р-н), Карэліцкі тракт, Чарэшля (Навагрудскі р-н), Бяздоннае, Кабакі, Ніз (Слонімскі р-н), Валожын (Валожынскі р-н), Дзяржынск, Навасады, Старая Рудзіца (Дзяржынскі р-н), Гарадзілава, Гарадок (Маладзечанскі р-н) і інш.[117]

Трэба зазначыць, што першапачаткова у канцы X ст. падпадала хрысціянізацыі толькі славянскае насельніцтва, а іншапляменнае заставалася ў язычніцтве [118]. Вось чаму астравы балцкага насельніцтва яшчэ доўгі час існавалі на тэрыторыі Беларусі, як, напрыклад, у раёне Абольцаў (Талачынскі р-н), Гайны (Лагойскі р-н) і інш.[119] Насельніцтва іх было ахрышчана ў каталіцкую веру па ўмове Крэўскай уніі 1385 г. Між іншым, гэтым і тлумачыцца, чаму ў Абольцах і Гайне былі пабудаваны першыя касцёлы на тэрыторыі Беларусі. Не выключана, што насельніцтва гэта, у тым ліку і старажытнай Літвы, акружанае славянамі, у значнай ступені асімілявалася і было не столькі балцкім, колькі язычніцкім. Як убачым, Міндоўг і Войшалк спачатку былі язычнікамі. Нездарма ж пазнейшы Хлебнікаўскі летапіс у адрозненне ад «Аповесці мінулых часов» [120] Літву змяшчае сярод славянскіх плямёнаў [121].

У святле прыведзеных намі фактаў цяжка пагадзіцца з думкай, што найбольш раннія ўпамінанні Літвы адносяцца да ўсходняй, цэнтральнай і занямонскай частак сучаснай Літвы [122]. Гэта адхіляецца першым жа ўпамінаннем Літвы пад 1009 г. у Кведлінбургскіх аналах. Ужо тое, што ў гэтай лацінамоўнай крыніцы назва «Літва» выступае ў славянскай форме і што тут гаворыцца аб яе сумежжы з Руссю (in confinio Rusciae et Lituae) [123], сведчыць аб тым, што гаворка тут можа ісці аб Літве ў Верхнім Панямонні, бо толькі ў такім выпадку яна магла межаваць з Руссю, ад якой тэрыторыя сучаснай Літвы была адгароджана яцвягамі [124].

Гэта ж пацвярджаюць і наступныя паведамленні аб Літве, звязаныя са згаданымі вышэй паходамі на яе Яраслава Мудрага ў 1040 і 1044 гг. У Я. Длугаша знаходзім дадатковыя звесткі аб гэтым, а менавіта тое, што кіеўскі князь «разбіў Літву на палях слонімскіх (прыгадаем, што тут ёсць тапонім «Літва») і завалодаў ёю да Нёмана»[125], г. зн. захапіў яе левабярэжную частку. Прыведзеныя факты абвяргаюць і думку, што тапонімы «Літва» ва ўказаным намі рэгіёне з'явіліся ў выніку прасоўвання сюды пазней (калі менавіта, не ўказваецца) літоўскіх паселішчаў[126]. Аднак падзеі 1009, 1040 і 1044 гг. паказваюць, што ўжо ў XI ст. гэта мясцовасць называлася Літвой.

Некаторыя даследчыкі, каб даказаць знаходжанне старажытнай Літвы на поўдні сучаснай, з назвы рэчкі «Летаўка» (правы прыток Віліі ў раёне г. Кернау) выводзяць назвы «Летува—Летава—Літва»[127]. Аднак гэта вельмі праблематычна, бо ў самых ранніх пісьмовых звестках, як і ў тапаніміцы, адлюстравалася назва «Літва», а не «Летува» і «Летава». Ва ўсякім выпадку нельга бачыць толькі ўказаны спрэчны гідронім і не заўважаць цэлае гняздо адзначаных вышэй красамоўных тапонімаў «Літва» ў Верхнім Панямонні. Нельга прызнаць удалай і спробу лакалізаваць на тэрыторыі сучаснай Літвы ўладанні літоўскіх князёў XIII ст., згаданых у пісьмовых крыніцах[128]. Справа ў тым, што тапонімы, падобныя на імёны названых князёў, ёсць не толькі на тэрыторыі Літвы, але і ў іншых мясцовасцях, у прыватнасці на Беларусі, як, напрыклад, Таўтвілы (Пружанскі р-н), Юткі (Мядзельскі р-н), Даўяты (Браслаўскі р-н), Руклі (Аршанскі р-н) і інш. Спасылка Р. Батуры на грамату Міндоўга ад 1253 г.[129] нічога не дае для высвятлення месцазнаходжання старажытнай Літвы ў Аўкштайціі, паколькі ў гэтым дакуменце пералічаны землі, якія нібыта належалі Літве, але што разумелася пад ёй, тут не відаць. Тое ж і ў адносінах дагавора Гедыміна ад 2 кастрычніка 1323 г.[130] Ужо тое, што гэты князь, называючы сябе каралём Літвы, палічыў патрэбным у ліку іншых земляў, ад імя якіх ён заключыў дагавор, назваць Аўкштайцію і Жамайцію, гаворыць аб іх такім агульнавядомым найменні ў той час і што тытул караля Літвы, такім чынам, паходзіў не адсюль. Гэта ж пацвярджае і П. Дузбург, у якога Аўкштайція паказана ў сувязі з падзеямі 1294—1300 гг.

як «уладанне караля Літвы» (terra regis Litowia) [131], з чаго відаць, што Літва і Аўкштайція — розныя ў той час геаграфічныя паняцці. Як доўга яшчэ трымалася назва «Аўкштайція» ужо ў час існавання Вялікага княства Літоўскага, сведчыць упамінанне яе Вітаўтам у яго пісьме ад 11 сакавіка 1420 г.[132] Тое, што ў 1268 г. Нальшчаны названы «правінцыяй Літвы» [133], не гаворыць аб пашырэнні назвы апошняй на гэту зямлю, а толькі аб прыналежнасці яе да Літвы, што і адпавядала сапраўднасці, паколькі Войшалк заваяваў яе разам з Дзяволтвай у 1264 г. Калі Вартберг паказаў Кернау ў Літве [134], то гэта зразумела, бо ён пісаў сваю хроніку пасля 1378 г.[135], калі назва «Літва» ужо замацоўвалася ў тым месцы. Выказана яшчэ думка, што з тэрыторыі, якая нібыта з'яўлялася цэнтрам утварэння феадальнай Літоўскай дзяржавы (г. зн. з усходу і цэнтра сучаснай Літвы), у пачатку XIV ст. знікла назва «Літва» і заменена там назвай «Аўкштайція» [136]. У такім разе незразумела, чаму гэта назва адтуль знікла і калі і чаму яна там зноў з'явілася і замацавалася.

Аднак усё адбывалася інакш: спачатку ўсходняя частка сучаснай Літвы называлася Аўкштайціяй, пра што могуць сведчыць і такія тут тапонімы, як Аўкштайцы, Аўкштыня, Гаўкштаны, Аўкштадворы, Аўкштэлі і ім падобныя ў былых Быстрыцкай, Міляцкай, Міцкунскай, Няменчынскай, Рашанскай, Шырвінскай і Янішскай валасцях Віленскага пав., у Жосельскай, Алькенішскай і Сумілішскай валасцях Трокскага пав., у Аляксандраўскай воласці Лідскага пав. і ў Лынгмянскай воласці Свянцянскага пав.[137] І толькі пазней у сувязі з перанясеннем сталіцы дзяржавы ў Вільню у пачатку XIV ст. назва «Літва» з Верхняга Панямоння паступова пачала пераходзіць на ўсход сучаснай Літвы і замацоўвацца там. Але адначасова яна прадаўжала захоўвацца і на ранейшым месцы яшчэ цэлыя стагоддзі. У Магілёўскай хроніцы пад 1695 г. гаворыцца, што літоўскае пагранічча праходзіла недалёка ад Мінска і Слуцка [138]. Наколькі гэта назва ў Верхнім Панямонні мела ўсеагульнае прызнанне і нават афіцыйнае, можа служыць той факт, што дзекабрыст А. Бястужаў, жывучы ў 1821 г. на тэрыторыі сучаснага Валожынскага р-на, даў у Пецярбург такі свой адрас: «Литва, д. Выгоничи, в 40 верстах от Минска» [139]. Дзе знаходзілася ўласна Літва ў старажытнасці, добра ведаў і рускі гіс-

торык М. Надзеждзін: «Уласна ў «Літве» ёй (літоўскай мовай.— *М. Е.*) гавораць ужо вельмі нямногія, і менавіта: адно паселішча ў павеце Вілейскім, некалькі сёл у паветах Навагрудскім і Слонімскім» [140]. Слушна адзначалася, што ў часы А. Міцкевіча Літвою называлі не толькі сучасную Літву, але і пэўную частку славянскай тэрыторыі. Аднак апошняя насіла такую назву не таму, што яна калісьці ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага [141], а таму, што менавіта тут і была ў далёкія часы ўласна Літва.

Са знаходжаннем летапіснай Літвы ў Беларускім Панямонні звязана і тое, што насельніцтва яго, асіміляваўшыся ў беларусаў, называла сябе па-ранейшаму ліцвінамі. Пісьмовыя крыніцы адзначаюць гэта ўжо з канца XIII — пачатку XIV ст. Так, П. Дузбург, напрыклад, у сваёй хроніцы два разы (пад 1296 і 1305 гг.) піша пра змаганне нямецкіх рыцараў з літоўскімі і абодва разы заўважае, што апошнія былі рускімі [142], г. зн. толькі па назве былі ліцвінамі, а па сутнасці з'яўляліся славянамі. У «Хроніцы Літоўскай і Жмойцкай» пад 1405 г. гаворыцца пра Андрэя Літвіна, які раіў Вітаўту не ісці на згоду з непрыяцелем, крыкнуўшы пры гэтым: «Не мири, Витавте, не мири» [143], з прычыны гэтага Вітаўт празваў яго Нямірам, ад якога і род такі пайшоў. Як бачым, ні гэты ліцвін, ні вялікі літоўскі князь не гаварылі па-літоўску. У інтэрмедыі драмы Георгія Каніскага «Воскресение мертвых» (1746) пад імем Літвіна выведзены беларускі селянін [144]. А. Міцкевіч (1798—1855), які нарадзіўся пад Навагрудкам, сваю айчыну называў Літвой [145]. Нават беларускі пісьменнік XIX ст. В. Дунін-Марцінкевіч (1807—1884), якога таксама нельга западозрыць у адсутнасці беларускай нацыянальнай свядомасці, лічыў, што ён вырас сярод ліцвінаў [146]. Гэтак жа ўраджэнец Гродзеншчыны К. Каліноўскі, рэвалюцыйная дзейнасць якога прыпадае на 60-я гады XIX ст. і які заўсёды звяртаўся да свайго народа на беларускай мове, як правіла, называў родны край Літвой. Называе сябе ліцвінам і адзін з герояў трылогіі Я. Коласа «На ростанях» (у ёй паказваюцца падзеі пачатку XX ст.) Баранкевіч, хаця ён і беларус [147]. Мы не будзем больш прыводзіць аналагічныя прыклады, бо Я. Юхо пераканаўча паказаў, што назва «Літва» на працягу многіх стагоддзяў адносілася да Беларусі і была, па сутнасці, яе гістарычным найменнем [148].

Толькі на пачатку XX ст., калі завяршыўся працэс утварэння беларускай нацыі, назва «Беларусь» замацавалася і за Беларускім Панямоннем, выцесніўшы адтуль назву «Літва», якая з таго часу стала адносіцца толькі да сучаснай Літвы.

Цяпер коратка спынімся на некаторых іншых гістарычных абласцях і княскіх родах, якія ў крыніцах упамінаюцца побач з Літвой. У дагаворы 1219 г. названы князі Булевічы і Рушкавічы. Адносна іх месцазнаходжання былі выказаны меркаванні. Так, І. Бяляеў паказваў без размежавання першых і другіх на тэрыторыі ад Віліі да Нёмана і Свіслачы і на ўсход да Бярэзіны дняпроўскай [149]. На жаль, ён не ўказаў ні крыніцы, ні меркаванняў, якія яму далі падставу для гэтай высновы. У апошні час Э. С. Гудавічум на падставе тапанімікі, якая супадае з імёнамі булевіцкіх і рушкавіцкіх князёў, лічыць, што Булевічы валодалі Шаўляйскай зямлёй, а Рушкавічы — зямлёй Упітэ [150]. Аднак такія тапонімы ёсць і на Беларусі (Булеўскае балота і інш.) [151]. Намі было выказана меркаванне, што Булевічы знаходзіліся на тэрыторыі Стаўбцоўскага р-на, таму што там меліся тапонімы Балевічы [152]. Гэта, як бачым, супадае са сцвярджаннямі І. Бяляева. Булевічы толькі аднойчы ўпамінаюцца ў летапісах, і таму магчыма, што летапісец не зусім дакладна перадаў іх прозвішча. На гэту думку наводзіць тое, што ў Нягневічах (Навагрудскі р-н) ёсць рэчка з крыху незвычайнай назвай «Буловіч» [153]. Гэта не так далёка ад Стаўбцоўскага р-на і таму можа быць пэўным арыенцірам для лакалізацыі Булевічаў. Таму стане зразумелым, чаму Міндоўг так жорстка абышоўся з булевіцкімі князямі, усіх іх знішчыўшы [154]. Падначаленне Булевічаў, якія знаходзіліся на яго шляху ад Навагрудка ў Літву, адчыніла яму шлях да заваявання апошняй. Адзначым яшчэ, што ў Памераніі ёсць населеныя пункты Bulitz, Bullen [155]. А гэта можа ўказваць на заходнеславянскае паходжанне Булевічаў, тым больш што імёны іх князёў, як, напрыклад, Вішымут, адносяцца да славянскіх [156]. Магчыма, што Булевічы з усім сваім родам і князямі ўцяклі з заходнеславянскіх земляў, ратуючыся ад анямечвання і хрысціянізацыі, на тэрыторыі, дзе было яшчэ нямала язычніцкага насельніцтва.

Што да Рушкавічаў, то гэта прозвішча празрыста славянскае. На карце Памераніі мы знаходзім Ruske-

witz [157], што таксама можа ўказваць на месца, адкуль яны прыйшлі. Імёны іх князёў — Кінцібут, Ванібут, Бутавіт, Віжэнік, Вішлій, Кіцэній, Плікасова, Хвал, Сірвіт — носяць славянскі характар [158]. Па-ранейшаму ў нас адсутнічаюць даныя, якія б далі магчымасць больш-менш дакладна вызначыць месца іх княжання. Толькі па тапанімічных даных, як гэта робіць Э. Гудавічус, вызначаць гэта нельга. Паколькі ў XIII ст. Рушкавічы рабілі напады на Валынь, то мы схільны лічыць, што іх уладанні былі па суседству з Пінскай зямлёй. Відаць, язычніцтва Булевічаў і Рушкавічаў найперш і звязвала іх з балцка-літоўскімі князямі.

У свой час Э. Вальтэр зрабіў спробу вызначыць месцазнаходжанне Нальшчанскай зямлі, якую ён паказваў на паўночным захадзе сучаснай Літвы [159]. Адным з крытэрыяў для такой высновы была наяўнасць там тапонімаў тыпу «Налішкі». Аднак, адшукаўшы такі ў Жамайціі, даследчык зазначыў, што ён нічога агульнага з Нальшчанамі не мае. А гэта азначала, што і іншыя падобныя тапонімы нельга было ўпэўнена адносіць да Нальшчанаў. Прычынай няўдачы Э. Вальтэра было і тое, што ён, атаясамліваючы старажытную Літву з сучаснай, не звярнуў увагу на сведчанні, якія супярэчылі гэтаму. Так, адзначыўшы, што ў нямецкіх крыніцах «Нальсен» і «Наліске» знаходзяцца ў сувязі з пагранічнай вобласцю, як бы спрэчнай, не жмудскай і не літоўскай, не заўважыў, што тут вельмі выразна паказана становішча Нальшчанаў як тэрыторыі, што раздзяляла Літву і Жамойцію. Прыведзенае Вальтэрам паведамленне Рыфмаванай хронікі, што шлях лівонцаў у Літву на Міндоўга пралягаў праз Нальшчаны і што яны знаходзіліся на дарозе ад Дзвінска да Літвы, таксама пацвярджала месцазнаходжанне і старажытнай Літвы і Нальшчанаў. Але гэтыя сведчанні засталіся без уважлівага аналізу Э. Вальтэра. А. Кіркор атаясамліваў Нальшчаны з Гальшанамі [160]. Паводле У. Пашуты, Нальшчанская зямля займала ўвесь крайні паўночны захад сучаснай Беларусі і крайні паўднёвы ўсход сучаснай Літвы (ад Нёмана ніжэй Гродна і да Заходняй Дзвіны ў раёне Даўгаўпілса і ад Крэва да Вільні) [161]. Гэта ў некаторых адносінах слушна, аднак яму не дадзена тлумачэнне. Нальшчаны непасрэдна межавалі са старажытнай Літвой, як мы бачылі вышэй, і гэта дае падставу іх лакалізаваць на паўночным захадзе Бела-

русі. У некаторых месцах Рыфмаванай хронікі Нальшчаны маюць назву «Альсен». Яна, магчыма, нямецкага (гоцкага?) паходжання, бо магла ўтварыцца ад слоў Aal (вугор) і Seen (азёры), што значыць «азёры, населеныя вуграмі». Калі так, то гэта вобласць, відаць, займала тэрыторыю паўночна-заходняй часткі Беларускага Паазер'я, багатага вуграмі. Бясспрэчна, што карэннымі насельнікамі Нальшчанаў былі балты. Але, як вядома, гэта раён найбольш ранняга пранікнення славян-крывічоў, на што ўказвае назва «Крэва» і падобныя ёй. І таму Нальшчаны трэба адносіць да найбольш аславяненых к гэтаму часу абласцей. Бадай, неправамерна залічаць Нальшчанскую зямлю да балцка-літоўскіх, асабліва калі ўлічыць, што яе князі адсутнічалі ў валынска-літоўскім дагаворы 1219 г. Нездарма і нальшчанскі князь Даўмонт з усім сваім родам уцёк у Пскоў і там быў абраны князем. Пасля XIII ст. назва «Нальшчаны» знікла, прынамсі ў пісьмовых дакументах. На іх тэрыторыі пазней утварылася Крэўскае княства.

Летапісная назва «Дзяволтва» — мабыць, сцягнутая форма назвы «Дзевалотва», што можа гаварыць аб насельніках гэтай вобласці як адгалінаванні балцкага племя лотвы, што ў старажытны час насяляла цэнтральную і паўночна-заходнюю частку Беларусі [162], тым больш што ў Хлебнікаўскім летапісе Дзяволтва і названа Лотвай [163]. «Хроніка Быхаўца», створаная ў XVI ст., указвае на існаванне Дзевалтоўскага княства [164], якое знаходзілася ў раёне Вількаміра. Няпэўнасць крыніц спарадзіла неразбярыху ў навуковай літаратуры нават аднаго і таго ж аўтара. Так, на карце, прыкладзенай да кнігі У. Пашуты «Героическая борьба русского народа за независимость» (1956), Дзяволтва паказана ў міжрэччы Нявежы і Швентойі. А на карце «Земли и населенные пункты Древней Литвы» ў кнізе У. Пашуты «Образование Литовского государства» на месцы Дзяволтвы паказана вобласць Упітэ, а асноўная частка тэрыторыі Дзяволтвы аднесена на ўсход ад ракі Швентойі, туды, дзе звычайна паказваецца Аўкштайція.

Праблема месцазнаходжання Аўкштайціі таксама заблытаная. Нават нельга ўпэўнена сказаць, ці на тэрыторыі яе была Вільня, бо некаторыя даследчыкі лічаць, што гэта гістарычная вобласць знаходзілася на захад ад Вільні. Тапаніміка сведчыць, што на тэрыторыі сучаснай Літвы аўкштайты займалі прастору ў

міжрэччы Меркіс і Стравы і міжрэччы Жаймяны і Швентойі. Але наўрад ці жылі аўкштайты за правым берагам Швентойі, аж да р. Нявежыс, як гэта паказвае У. Пашута. У адной з нямецкіх хронік гаворыцца, што ў 1332 г. лівонцы зрабілі набег на Жмудзь (Жамойцію) і дайшлі да Швентойі. У наступным годзе яны зноў хадзілі на Жмудзь і дайшлі да Вількенберга (Укмерге) [165]. З гэтага можна зрабіць вывад, што заходні рубеж Аўкштайціі не ішоў далей Швентойі.

Гаворачы аб месцазнаходжанні Жамойціі, тэрыторыя якой цягнулася да Балтыйскага мора, мы хочам звярнуць увагу на наяўнасць значнай колькасці тапонімаў тыпу «Жамойцішкі», «Жамайтэлі» і ім падобных у былых Бутрымонскай і Язненскай валасцях Трокскага, у Падбярэзскай, Рукойненскай, Янішскай валасцях Віленскага пав., у Аляксандраўскай, Беняконскай, Ганчарскай і Эйшышскай валасцях Лідскага, у Дубатоўскай воласці Свянцянскага, у Забрэскай і Суботнікаўскай валасцях Ашмянскага паветаў і інш. [166] Гэтыя тапонімы досыць сканцэнтраваны і лакалізаваны і ўшчыльную ахопліваюць усходнія і паўднёва-ўсходнія межы сучаснай Літвы. Е. Ахманьскі заўважыў неадпаведнасць назвы «Жамойція» (нізкая зямля) таму геаграфічнаму становішчу, якое займае гэта вобласць, размешчаная на высокім месцы. І ён выказвае меркаванне, што гэта назва паўстала тады, калі жамайты сядзелі на нізінным месцы над р. Нявежай. Але адсюль іх нібыта выцеснілі аўкштайты, якія прыйшлі з ашмянскіх высотаў (адсюль і Аўкштайція — высокая зямля). У выніку гэтага жамайты і засялілі сваю сучасную мясцовасць, выцесніўшы адтуль куронаў [167]. Наяўнасць у адных і тых жа мясцінах жамойцкіх і аўкштайцкіх тапонімаў можа ў некаторай меры пацвярджаць гэту думку. Адначасова адсюль можна зрабіць меркаванне аб магчымасці таго, што ў нашых летапісах Аўкштайція выступае пад старой назвай сваёй тэрыторыі. І гэта найбольш верагодна, бо яшчэ ў канцы XIX і пачатку XX ст. жыхары ўсходняй Літвы нярэдка называліся жамайтамі, а літоўская мова — жамойцкай [168].

З разгледжанага бачна, што балцка-літоўскія землі некампактна цягнуліся з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход ад Балтыйскага мора да вярхоўя Шчары. У даследаваннях сцвярджаецца аб наяўнасці ў літоўскіх землях ужо ў пачатку XIII ст. адносна адзінай дзяржа-

вы [169], сведчаннем чаго нібыта з'яўляецца дагавор 1219 г. Аднак з гэтым цяжка згадзіцца. У ім упамінаецца звыш 20 старэйшых князёў, што яскрава сведчыць аб выключнай раз'яднанасці гэтых земляў. Выраз «старэйшыя князі» адносіцца ў гэтым дагаворы не толькі да князёў Літвы, як гэта звычайна сцвярджаецца даследчыкамі, але і да князёў усіх пералічаных тут земляў. Тое, што князі Літвы названы першымі, яшчэ раз паказвае яе месцазнаходжанне ў Верхнім Панямонні. Яна была найбліжэй да Валыні і таму названа першай. Апроч таго, не звярталася ўвага на адсутнасць у гэтым дагаворы нальшчанскіх князёў. А гэта таксама не дае права гаварыць аб наяўнасці нават адносна адзінай дзяржавы ў балцка-літоўскіх землях. Але самае галоўнае, гэта так званае адзінства было вынікам не ўнутранага развіцця, а знешняга фактару: балцка-літоўскія князі былі пакліканы валынскімі князямі для барацьбы з палякамі і тым самым паказалі сябе ў якасці наёмнікаў.

На заканчэнне гаворкі аб літоўска-балцкіх землях зноў вернемся да старажытнай Літвы. Найбольш важна тут будзе падкрэсліць, што яна ўрэзвалася клінам паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Новагародскай землямі і побач з імі з'яўлялася адной з гістарычных абласцей Беларусі. Зразумела, што пры аб'яднанні гэтых земляў яна не магла не ўвайсці ў склад тэрыторыі Беларусі як адна з яе састаўных частак. Не бачачы такога геапалітычнага становішча старажытнай Літвы, нельга зразумець, чаму яна ў сярэдзіне XIII ст. апынулася ў фокусе палітычнага саперніцтва суседніх з ёю земляў, якія імкнуліся заваяваць яе, што было першым звяном у пашырэнні іх улады на іншыя землі. У гэтым саперніцтве і атрымаў перамогу Новагарадок, які і стаў цэнтрам утварэння новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

4

ЛІТОЎСКІЯ НАБЕГІ І СЛАВЯНСКАЯ КАЛАНІЗАЦЫЯ

«Літоўскія набегі» гістарычная навука разглядае як фактар, які нібыта падрыхтаваў заваяванне літоўскімі феадаламі беларускіх земляў. Даследчыкі звычайна спасылаюцца для пацвярджэння гэтага на «Слова аб палку Ігаравым». Так зрабіў і У. Пашута. Зазначыўшы, што гэты твор паведамляе пра страту полацкімі князямі былых пазіцый у Літве і Падзвінні, ён прыводзіць у якасці пацверджання наступныя радкі: «И Двина болотом течет оным грозным полочаном под клики поганых. Един же Изяслав, сын Васильков, позвони своими острыми мечи о шеломы литовськыя, притрепа славу деду своему Всеславу, а сам под чрьлёными щиты на кроваве траве притрепан литовськими мечи... Не бысть ту брата Брячислава, ни другаго Всеслава...» [170] Як вядома, «Слова» не летапіс, а мастацкі твор. Таму перад даследчыкам стаіць задача высветліць, якія гістарычныя падзеі знайшлі адлюстраванне ў гэтым месцы твора. Хутчэй за ўсё аўтар яго, гаворачы пра з'яўленне «паганых» на Дзвіне, меў на ўвазе падзеі 1167 г., калі вядомы нам мінскі князь Валадар Глебавіч пайшоў са сваім войскам, у складзе якога, як і ў 1162 г., магла быць і літва, на Полацк, захапіў яго і пайшоў далей уздоўж Дзвіны на Віцебск, дзе яго напаткала няўдача [171]. Выкарыстанне полацкімі князямі літвы і ліваў як вайсковай сілы ў паходзе на Друцк мела месца і ў 1180 г. [172], незадоўга да напісання «Слова». Вось гэтыя і ім падобныя факты і далі падставу аўтару «Слова» гаварыць пра з'яўленне «паганых» на Дзвіне. Але гэтыя факты сведчаць, што не сама «літва» прыйшла на Полаччыну, як звычайна сцвярджаецца, а была прыведзена полацкімі князямі для барацьбы паміж сабой. Такія дзеянні былі характэрны не толькі для полацкіх князёў. Кіеўскія князі ў міжусобнай барацьбе часта выкарыстоўвалі полаўцаў. За гэта аўтар «Слова» асуджае і кіеўскіх, і полацкіх князёў: «Ярославли (г. зн. кіеўскія

князі) и вси внуци Всеславли (г. зн. полацкія князі)!.. Вы бо своими крамолами начасте наводити поганыя полкы на землю Рускую, на жизнь Всеславлю...» Вось гэтых слоў і не прыводзяць даследчыкі, а ў іх якраз і паказана праўдзівая прычына з'яўлення «паганых» на Дзвіне.

Што датычыць князя Ізяслава Васількавіча, які загінуў у барацьбе з літоўцамі, то трэба найперш адзначыць, што гэта адзіны герой у «Слове», якога не ведаюць летапісы, і таму цяжка сказаць, дзе ён княжыў. Выраз «трубяць трубы гарадзенскія» яшчэ не дае падставы гаварыць, што ён быў князем у Гарадзені (сучаснае Гродна), бо ў той час гарадоў з такой назвай было шмат. Але, як паказвае «Слова», полацкі і віцебскі князі Брачыслаў і Усяслаў Васількавічы не падтрымалі свайго брата Ізяслава ў барацьбе з літоўцамі. Гэтым яно таксама пацвердзіла, што полацкія князі не былі ў варожых адносінах з Літвой нават і тады, калі з ёю ваяваў іх брат. Такім чынам, «Слова» дае праўдзівую гістарычную карціну адносін паміж Полацкам і Літвой. І таму не маюць рацыі тыя даследчыкі, якія вырываюць з тэксту «Слова» паасобныя месцы, каб пацвердзіць штучную канцэпцыю пра падначаленне Літве беларускіх земляў.

І ўсё ж у першыя тры дзесяцігоддзі XIII ст. у розных крыніцах зарэгістраваны тры літоўска-полацкія канфлікты, на якіх завастраецца асаблівая ўвага ў даследаваннях. Таму яны патрабуюць уважлівага разгляду, каб высветліць іх характар.

Першы з іх знайшоў адлюстраванне ў «Хроніцы Ліваніі» Генрыха Латвійскага пад 1201 г. Тут сказана, што летоны, пасля таго як, прыйшоўшы ў Рыгу, заключылі мір з хрысціянамі, «наступнай зімой, спусціўшыся ўніз па Дзвіне, з вялікім войскам накіраваліся ў Семігалію. Пачуўшы, аднак, яшчэ да ўступлення туды, што кароль полацкі прыйшоў з войскам у Літву (Летонію), яны кінулі семігалаў і паспешліва адышлі назад» [173]. Найперш узнікае сумненне, ці былі гэта літоўцы з тэрыторыі сучаснай Літвы, як гэта прынята лічыць, бо ім у такім выпадку не было сэнсу плысці па Дзвіне ў Семігалію, паколькі апошняя знаходзілася на левабярэжжы Дзвіны і на поўдзень ад яе была Літва ў сучасным разуменні і таму да семігалаў прасцей і бліжэй было дабрацца па сушы. Калі ж гэта былі сапраўды літоўцы, то яны жылі не на тэрыторыі сучаснай Літвы, а дзесьці далей на ўсход, побач з Полацкай зямлёй, ім у такім разе зручней

было дабірацца да семігалаў па Дзвіне. Незразумела, чаму В. Данілевіч сцвярджаў, што вынікі гэтага паходу полацкага князя ў Літву невядомыя і што, маўляў, такія адзінкавыя спробы ўціхамірыць Літву мала прыносілі карысці для Полацка [174]. Як мы ўжо ведаем з вышэй прыведзенай вытрымкі, летоны, даведаўшыся, што полацкі князь пайшоў у іх зямлю, адмовіліся ісці ў Семігалію, бо менавіта за намер напасці на апошнюю як на яго ўладанне і помсціў Полацк паходам на Летонію. Такім чынам, тут яўна выявілася сіла Полацка і бяссілле Летоніі. Звяртаем увагу і на тое, што «Хроніка Лівоніі» засведчыла прыналежнасць Семігаліі Полацку.

Паводле Я. Длугаша, у 1216 г. літоўскія дружыны ўварваліся ў ваколіцы Полацка і сталі рабаваць іх. Яны нібыта былі разгромлены і выгнаны смаленскім князем Мсціславам Давыдавічам [175]. Такую магчымасць нельга адмаўляць. Якія б дружалюбныя адносіны паміж суседнімі землямі ні былі, яны тым не менш не перашкаджалі спробе пажывіцца пры нагодзе за кошт суседа. А такая нагода ў 1216 г. магла з'явіцца. Полацкі князь у гэты год сабраў войска, каб ісці на Рыгу, але раптоўна памёр. Таму літоўскія дружыны, якія былі ў складзе полацкага войска, маглі выкарыстаць замяшанне ў Полацку і пачаць рабаваць пры адыходзе менавіта яго ваколіцы. Можна таксама дапусціць, што з-за часовай адсутнасці князя ў Полацку палачане звярнуліся да смаленскага князя, які мог быць удзельнікам паходу на Рыгу і таму прысутнічаў тады ў Полацку, расправіцца з літоўцамі. І ўсё ж такога не было. Па-першае, наяўнасць літвы ў войску Уладзіміра гаворыць аб цесным саюзе Полацка з ёю ў гэты час. Па-другое, смаленскім князем у гэты час быў не Мсціслаў Давыдавіч, а Уладзімір Рурыкавіч, які княжыў тут у 1214—1219 гг. [176] Па-трэцяе, гэты апошні таксама не мог бы прыйсці на дапамогу Полацку, бо ў той час удзельнічаў разам з іншымі князямі ў паходзе на Суздаль [177]. Усё гэта адмаўляе факт нападу на Полацк і разгром яго Мсціславам Давыдавічам у 1216 г.

Адзначаецца і яшчэ адзін факт, калі ў 1225 г. літва напала на Полацкую, Наўгародскую і Смаленскую землі. Сапраўды, у Лаўрэнцьеўскім летапісе чытаем: «Тою же зимы воеваша Литва Новгородскую волость, и поимаша множество много христиан и много зла сотворише, воюя около Новгорода, и около Торопца и Смоленска, и до Полотьска, бе бо рать велика ака же не было от на-

чала миру» [178]. Аднак у тым жа летапісе, паводле Акадэмічнага спіса, гаворыцца аб нашэсці Літвы ў раён Тарапца і Таржка, а Полацк не называецца [179]. І гэты запіс больш праўдзівы, бо ён супадае з адпаведным запісам Наўгародскага I летапісу [180]. А каму, як не наўгародцам, лепш было ведаць, на каго ў гэтым выпадку нападала Літва. Як бачым, усе тры факты, якімі аперыруюць даследчыкі ў пацвярджэнне нападаў Літвы на Полацк, з'яўляюцца малаверагоднымі. І сапраўды, як і ў XII ст., так і ў XIII ст. Літва з'яўлялася зброяй у руках Полацка для барацьбы з суседнімі землямі. Больш за тое, каб кампенсаваць свае страты ў Ніжнім Падзвінні, якім завалодалі крыжакі, Полацк усё больш умацоўваў сувязь з Літвой і свой уплыў на яе. Аб гэтым і сведчыць усё большы лік набегаў літвы на Пскоўскую, Наўгародскую і Смаленскую землі. Вось іх пералік паводле Пскоўскага, Наўгародскага і Суздальскага летапісаў: 1200 г.— на Ловаць да Налюця, 1310 г.— на Хадынічы, 1213 г.— на Пскоў, 1217 г.— на Шэлонь, 1223 г.— на Тарапец, 1224 г.— на Русу, 1225 г.— на Таржок і Тарапец, 1229 г.— на Любну, Марэву і Селігер, 1234 г.— на Русу, 1238 г. — на Пскоў, 1245 г.— на Таржок і Бежыцу, 1247 г.— на Пскоў, 1248 г.— на Зубцоў. Дарэчы, заўважым, што А. Сабалеўскі на падставе гэтых звестак зрабіў вывад, што Літва ў той час не была ля Вільні і Трокаў, а ў раёне Усвятаў, між Віцебскай і Смаленскай землямі [181]. Але ён не ўлічыў, што Усваты, далей якіх за «літвой» не гналіся наўгародцы ў 1223, 1225 і 1245 гг., былі крайнім полацкім уладаннем, дзе яна і знаходзіла сабе надзейнае прыстанішча. Апроч таго, ён не ўзяў пад увагу, што ўказаныя ім словы літоўскага паходжання, як «твань», «нетра» і іншыя, сустракаюцца не толькі ва ўказаным ім месцы Смаленшчыны, але і на ўсёй тэрыторыі Беларусі і ўсюды там, дзе ў далёкія часы жылі балцкія плямёны.

Аднак вернемся да разгляду так званых літоўскіх нападаў. Найперш зробім заўвагу, што не заўсёды летапісцы адрознівалі «літву» ад суседніх народаў. Так, у Пскоўскім летапісе пад 1213 г. чытаем: «Изгнаша от себя псковичи князя литовьского Владимира Торопецкого» [182]. Такім чынам, нават князь з Тарапца, сын вядомага Мсціслава Удалога, называецца літоўскім. На жаль, даследчыкі не звяртаюць увагі на такія дэталі. Калі ў той час у разрад літоўскіх залічваўся князь з Тарапца, то

гэта яшчэ ў большай меры магло рабіцца ў адносінах полацкіх князёў. У свой час гісторык І. Бяляеў зазначыў, што ў летапісах літва і палачане прымаліся за адно, і пад імем літоўскіх набегаў разумеліся полацкія [183]. І хаця літва і палачане не заўсёды ўспрымаліся за адно, аб чым сведчаць запісы ў Наўгародскім І летапісе пад 1191, 1198, 1258 і 1262 гг., аднак у выснове І. Бяляева ёсць вялікая доля праўды. Усе гэтыя набегі былі перш за ўсё зброяй полацкай палітыкі незалежна ад таго, хто ў іх прымаў большы ўдзел — палачане ці літва. Як паказваюць летапісы, у пераважнай большасці выпадкаў літва складала галоўны кантынгент полацкага войска і таму гэтыя набегі ў летапісах і называліся набегамі літвы. Нельга згадзіцца з думкай, што яны прыносілі ўзбагачэнне князям Літвы, мэтай якіх было рабаванне, захоп палонных, жывёлы, што з'яўлялася адной з крыніц назапашвання багацця класа феадалаў, які ў той час там фарміраваўся [184]. Бясспрэчна, што ўдзел у гэтых набегах не мог быць бескарыслівым. Аднак у цэлым яны не толькі не ўзбагачалі і не ўзмацнялі Літву, але яшчэ больш яе знясільвалі, бо, як правіла, пераважная большасць з іх заканчвалася паражэннем, стратай палонных і нарабаванага, вялікай колькасцю забітых. На жаль, усё гэта замоўчваецца ў даследаваннях ва ўгоду штучнай схеме: Літва мацнела, Полацк слабеў. Такі сумны зыход мелі набегі 1200, 1210, 1225, 1229, 1234, 1245, 1248, 1253 гг., і толькі рэдкія з іх, як у 1217 і 1223 гг., заканчваліся больш-менш шчасліва. Некаторыя паражэнні насілі яўна катастрафічны характар. Так, у 1225 г. загінула 2 тыс. «літвы» з агульнай колькасці 7 тыс., а ў 1245 г. Аляксандр Неўскі пад Тарапцом знішчыў больш 8 князёў, а пад Жыжцом і ўсіх астатніх. А колькі ж тады загінула простых воінаў? Пры такім стане рэчаў будзе няправільна гаварыць, што гэтыя набегі прыносілі карысць Літве. Не, гэта магло быць толькі ў інтарэсах полацкіх феадалаў. У. Пашута лічыў, што пра падначаленае становішча палачан сведчыць Ноўгародскі І летапіс, які пад 1258 г. паведамляе пра напад ужо не «полочан с литвой», як раней, а «литвы с полочаны» на Смаленск [185]. А крыху вышэй у сваёй кнізе гэты даследчык папракае той самы летапіс за тое, што ў ім пры паведамленні пра паход 1240 г. на Вендэн на першае месца ставіцца Літва, тады як галоўную ролю там адыгралі немцы [186]. Гэтым самым аспрэчыў і свой уласны довад на-

конт адносін Полацка і Літвы. Не меў рацыі У. Пашута і тады, калі сцвярджаў, што гэты паход на Смаленск быў «справай рук Таўцівіла»[187], які княжыў у той час у Полацку. Вядома, што яшчэ задоўга да Таўцівіла палачане хадзілі на Смаленск, а цяпер прымусілі ісці і яго. Што набегі літвы на Ноўгарад залежалі ад полацкай палітыкі, сведчыць і такі факт. Як толькі Полацк і Ноўгарад у 1262 г. заключылі мір, літва не толькі спыніла набегі на наўгародскія землі, але і разам з палачанамі стала дапамагаць наўгародцам, як, напрыклад, пры паходзе на Юр'еў супраць немцаў у 1262 г.[188]

Літву выкарыстоўвалі для аслаблення Галіцка-Валынскай зямлі і турава-пінскія князі. У канцы 20-х гадоў XIII ст. адносіны паміж Валынню і Пінскам настолькі абвастрыліся, што ўзнік канфлікт. Піняне ў 1227 г. захапілі г. Чартарыйск. У наступным годзе Даніла Галіцкі вярнуў яго назад. Пасля гэтага пінскі князь Расціслаў арганізаваў супраць яго кааліцыю князёў, у якой сярод іншых удзельнічалі тураўцы і новагародцы. Але яна пацярпела паражэнне, і Пінск падпаў пад уплыў Валыні, князі якой прымушалі пінянаў ваяваць з суседняй Літвой. Са свайго боку пінскія князі неаднаразова прапускалі літву праз свае землі для нападу на Галіцка-Валынскае княства. Пра сувязь пінскіх князёў з літвой сведчыць Іпацьеўскі летапіс пад 1247 г., калі апісвае набег літвы на Валынь пры садзейнічанні пінскага князя Міхаіла[189].

Як бачым, у навуцы непамерна перабольшана значэнне так званых літоўскіх набегаў. У даследаваннях скрупулёзна падлічваецца іх колькасць ды яшчэ без уліку іх вынікаў. І на падставе гэтага робяцца высновы пра літоўскае наступленне на славянскіх суседзяў. І ў той жа час замоўчваецца славянская, перш за ўсё крывіцкая і дрыгавіцкая, каланізацыя балцка-літоўскіх земляў. Што да літоўскіх небагаў на славянскія землі, то калі яны і былі, усё адно не маглі спыніць шырокую плынь крывіцкай і дрыгавіцкай каланізацыі ў балцка-літоўскія землі.

Як паказваюць матэрыялы археалогіі, гідранімії, тапанімікі, лінгвістыкі, балцкія плямёны (латыгола, лотва, літва, яцвягі і інш.) засялялі амаль усю тэрыторыю Беларусі[190] да прыходу сюды славян на мяжы VI—VII стст. н. э.[191] Славянскае засяленне ішло з некалькіх бакоў. Калі дрыгавічы рухаліся з поўдня на поўнач (ад Прыпяці да Дзвіны), то крывічы — па Бугска-Нёманскім

міжрэччы з захаду на ўсход і паўночны ўсход [192]. З захаду, як сведчыць летапіс, прыйшлі і радзімічы. Трэба зазначыць, што апроч гэтых галоўных славянскіх насельнікаў Беларусі тут аселі і часткі іншых плямёнаў, дарогі якіх ішлі праз Беларусь,— севяран, славенаў, дулебаў. Усё гэта спрыяла больш інтэнсіўнай славянскай каланізацыі і асіміляцыі ранейшага насельніцтва. Працэс гэты, пачаўшыся, ужо не мог спыніцца і ішоў на працягу стагоддзяў. Хаця не выключана, што напачатку (і гэта заканамерна) славянская каланізацыя сустракалася з варожасцю карэннага насельніцтва, аб чым могуць сведчыць разбураныя і пагарэлыя балцкія гарадзішчы. Аднак у далейшым сужыццё славян і балтаў працякала мірна. Але славянская каланізацыя (і асіміляцыя) не ўсюды адбывалася раўнамерна. Як ужо гаварылася вышэй, асобныя астравы балцкага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі заставаліся аж да канца XIV ст. Вось гэта акалічнасць і дала ў апошні час Е. Ахманьскаму ў яго працы аб літоўскай этнічнай мяжы на ўсходзе прапанаваць новую канцэпцыю ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. Паводле яе, цэнтральная Літва (усход сучаснай), абапіраючыся на гэтыя астравы балцкага насельніцтва, заваявала заходнерускія землі. Неабгрунтаванасць гэтага сцвярджання відавочная. Па-першае, незразумела, чаму цэнтральная Літва не магла гэтага зрабіць значна раней, калі славянскае насельніцтва было астраўным у моры балцкага. Па-другое, адрэзаныя вялізнай адлегласцю і сотнямі гадоў адзін ад аднаго, наўрад ці захавалі гэтыя балцкія рэшткі пачуццё адзінства паміж сабой, асабліва калі ўлічыць, што ва ўсходняй, паўночнай і цэнтральнай частках Беларусі жылі балцка-латышскія плямёны, да якіх балцка-літоўскія плямёны не мелі асаблівай сімпатыі. Па-трэцяе, незразумела, чаму гэтыя літоўскія плямёны, як лічыў іх Е. Ахманьскі, стварылі славянскую дзяржаву, за пяць стагоддзяў існавання якой у афіцыйным жыцці не прагучала ніводнага літоўскага слова. І апошняе (можа, самае галоўнае), крыніцы ні разу не пацвярджаюць факту якой-небудзь падтрымкі цэнтральнай Літвы з боку якіх-небудзь балцкіх астравоў, як і наогул якога-небудзь заваявання ёю беларускіх земляў.

Найбольшым з балцкіх астравоў у Беларусі, відаць, і была Старажытная Літва. І хаця яна была акружана балотамі і пушчамі, аднак і яе не абмінула славянская

каланізацыя (яна тут пачалася пазней і працякала павольней). Калі гэты працэс пачаўся, дакладна сказаць немагчыма, можна выказаць толькі некаторыя меркаванні. Вядома, што паўднёвая частка летапіснай Літвы была заваявана Яраславам Мудрым у 1040—1044 гг., у выніку чаго і быў заснаваны Новагарадок. І з гэтага часу, верагодней за ўсё, пачалася славянская каланізацыя левабярэжнай Літвы. Аднак у правабярэжнай, можна думаць, яна пачалася раней.

Густынскі летапіс пад 1128 г. адзначыў, што кіеўскі князь Мсціслаў паслаў свае войскі ў Літву да Ізяслаўля. Такім чынам, гэты горад, які знаходзіцца ад Мінска за 18 км на паўночны захад, быў зафіксаваны летапісцам на літоўскай тэрыторыі. З летапісу таксама вядома, што Ізяслаўль (Заслаўе) узнік у канцы X ст. [193], што пацвярджана і археалогіяй [194]. Значыць, да гэтага часу крывічы і дрыгавічы, каланізаваўшы іншыя балцкія плямёны, назвы якіх засталіся невядомымі, падышлі да чарговага балцкага племя — літвы, усходняя мяжа рассялення якога, як мы высветлілі, праходзіла на захад ад Мінска. Відаць, Ізяслаўль і быў адным з першых цэнтраў крывіцка-дрыгавіцкай каланізацыі Літвы. Можна меркаваць, што з канца X ст. пачынаецца сумеснае жыццё беларускіх плямёнаў з літвой.

Крывічы былі самымі блізкімі суседзямі балцка-літоўскіх плямёнаў, з якімі больш за ўсё сустракаліся, што знайшло сваё адлюстраванне ў называнні латышамі ўсяго славянскага імем сваіх спрадвечных суседзяў крывічоў — крэвамі (крээвс). Крээвс — рускі, Крээвссэме — руская зямля. Усё гэта сведчыць пра шматвяковыя сувязі балтаў і крывічоў [195].

Першапачатковы старажытнарускі летапіс называе літву ў ліку народаў, якія давалі даніну Русі. І як паказана Л. Аляксеевым, даніна літвы ішла Полацкаму княству, з'яўляючыся адной з асноў яго эканамічнай магутнасці [196]. Але гэта адносіцца толькі да правабярэжнай Літвы, бо левабярэжная была пад уладай Кіева.

Літва паступова стала адной з крыніц ваеннай магутнасці полацкіх князёў. Гісторык І. Бяляеў лічыў, што Усяславу Брачыслававічу ўдалося ў 1071 г. вярнуць сабе полацкі пасад з дапамогай Літвы. Але асабліва цесныя сувязі з ёй трымала Менскае княства, якое было ў непасрэдным суседстве з ёй. Глеб Менскі ў 1104 г. адбіў кааліцыю паўднёварускіх князёў таму, што выкарыстаў, ві-

даць, літву. Саюз з ёй і быў асновай шырокіх палітычных планаў Глеба. Можна з упэўненасцю сказаць, што, прынамсі, з пачатку XII ст. летапісная Літва з'яўлялася пастаянным ваенным саюзнікам полацкіх князёў. Вось чаму пасля пераможнага паходу кіеўскіх князёў на Полаччыну ў 1128 г. і высылкі яе князёў у Візантыю ў 1129 г. адбыліся іх паходы на Літву (1130, 1132 гг.). А Густынскі летапіс паход кіеўскіх князёў у 1128 г. называе паходам на Літву да Ізяслаўля, тым самым раскрываючы дужкі гэтай «Літвы». Магчыма, што і паходы 1130 і 1132 гг., якія ў рускіх летапісах паказваюцца як пахо-



Месцазнаходжанне Старажытнай Літвы: *1* — прыблізныя межы Старажытнай Літвы, *2* — тапонім «Літва»

ды на Літву, таксама былі паходамі на Ізяслаўль, які ў той час заняў месца Мінска, далучанага часова да кіеўскіх уладанняў. Ізяслаўль, відаць, і абараняла войска, набранае з літвы, якая жыла вакол гэтага горада.

Іпацьеўскі летапіс, гаворачы пра падзеі 50—60-х гадоў XII ст., паказвае, адкуль мінскія князі чэрпалі дадатковыя сілы для барацьбы з полацкімі князямі. Адзін з самых непакорных — Валадар Глебавіч — у 1159 г., адмовіўшыся мірыцца з полацкім князем Рагвалодам, «ходяше под литвою в лесах», г. зн. збіраў там сілы для барацьбы са сваім працiўнікам, а ў 1162 г. з літвою нанёс цяжкае паражэнне палачанам.

Але калі да 70-х гадоў XII ст. Літва выкарыстоўваецца галоўным чынам мінскімі князямі ў барацьбе з Полацкам, дык пачынаючы з 80-х гадоў яна служыць інтарэсам усёй Полацкай зямлі. Характэрна, што ў 1180 г. прывялі літву пад Друцк не суседнія з ёю мінскі і ізяслаўскі князі, а палачане. Гэта і сведчыць пра ўмацаванне сувязі з Літвой усёй Полацкай зямлі, а не асобных яе ўдзелаў, як гэта было раней. Ноўгарад добра бачыў, што вайсковая сіла Полацка знаходзіцца ў Літве, і таму імкнуўся пасварыць іх паміж сабой. Спроба гэта была зроблена яшчэ ў 1191 г. Тады наўгародцы вырашылі навязаць палачанам паход на Літву. Праўда, У. Пашута зазначыў, быццам гэта палачане хацелі ў асобе наўгародцаў знайсці сабе саюзнікаў супраць літвы і нават эстаў. Памылковасць гэтага меркавання відавочная: палачанам ніколі не было патрэбы ваяваць з Літвой і тым больш з эстамі, якія былі суседзямі наўгародцаў, а не палачан. Апошнія разумелі, што ісці на Літву — усё адно, што секчы сук, на якім сядзіш. І таму не толькі адмовіліся ад паходу на яе, але ў 1198 г., як паведамляе Наўгародскі I летапіс, прыйшлі з ёю ваяваць Вялікія Лукі.

У сувязі са славянскай каланізацыяй балцка-літоўскіх земляў стаіць пытанне з'яўлення агульных полацка-літоўскіх князёў. Непасрэднае суседства, працяглае гістарычнае сумеснае жыццё беларускіх і балцка-літоўскіх плямёнаў не маглі не прывесці да сваяцкіх адносін паміж полацкімі князямі і літоўскімі кунігасамі. І. Бяляеў на падставе летапіснага паведамлення, якое сведчыла, быццам пры нараджэнні славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея прысутнічалі «валхвы», рабіў вывад, што маці гэтага князя была ліцвінкай і сам Усяслаў быў напаўліцвінам. Аднак справа не толькі ў сваяцкіх

адносінах. Полацкія князі, якія ў адрозненне ад князёў іншых старажытнарускіх земляў маглі княжыць толькі ў Полацкай зямлі, страціўшы з той ці іншай прычыны свой пасад, уцякалі ў балцка-літоўскія землі. Вядома, што ў 1129 г. не ўсе полацкія князі былі ўзяты ў палон і адпраўлены ў Візантыю. Некаторыя з іх пазбеглі гэтага і, можна думаць, знайшлі сабе прыстанішча ў Літве. Відаць, адным з іх быў Васілька Святаслававіч, які ў 1132 г. пасля выгнання з Полацка кіеўскага стаўленіка Святаполка адразу стаў тут князем. За такі кароткі час ён, вядома, не мог прыехаць з Візантыі. Полацка-літоўскім князем быў і Гердзень — сын полацкага князя Давіда Расціслававіча, чаго не адмаўляе сучасная навука [197]. Такім чынам, перш чым стаць «літоўскім» князем у Полацку каля 1265 г., Гердзень быў полацкім князем Нальшчанаў. Беларускія гісторыкі XIX ст. М. Без-Карніловіч [198] і А. Кіркор [199] даводзілі, што Гердзень быў бацькам вялікіх князёў літоўскіх Віценя і Гедыміна.

З паходжаннем апошніх звязана пытанне ўтварэння Віленскага ўдзела Полацкага княства, што адбылося, відаць, на пачатку XII ст. Васкрасенскі летапіс паведамляе, што пасля 1129 г. «вильняне взяша ис Царяграда князя полотского Ростислава Рогволодовича детей: Давила князя, да брата его Мовколда князя» [200]. Давіл (магчыма, Давід) і быў першым віленскім князем, ад яго ў далейшым, як сведчыць гэты летапіс, паходзяць Гердзень (Ердзень), Віцень і Гедымін. Гэта тым болей верагодна, што, як гаварылася вышэй, крывічы ішлі з захаду па Нёмане і Вільня магла быць адным з першых буйных крывіцкіх паселішчаў на новым месцы. Нездарма ж нямецкі храніст П. Дузбург у пачатку XIV ст. упамінаў Крывіцію [201], якая, на думку П. Шафарыка, знаходзілася на поўнач ад Новагарадка, дзе ў значнай колькасці маюцца тапонімы накшталт «Крэва» і «Крывічы» [202]. Не выключана, што гэтыя крывічы былі язычнікамі. Сапраўды, у «Жыцці трох вялікіх мучанікаў» гаворыцца пра трох знатных ліцвінаў, якія ў першай палове XIV ст. паплаціліся жыццём за прыняцце праваслаўя. Але прозвішчы іх: Круглец, Кумец і Няжыла — чыста славянскія.

Мы лічым, што зусім неправамерна ставіць Васкрасенскі летапіс у адзін шэраг з гісторыка-публіцыстычнымі творамі XVI ст., у якіх тэндэнцыйна скажалася гісторыя Вялікага княства Літоўскага [203]. Вядома, як і кож-

ная крыніца, запіс аб першых віленскіх князях патрабуе крытычнага падыходу, аднак, на нашу думку, у ім шмат праўдзівага. У. Пашута лічыў вартым увагі сведчанне гэтага летапісу пра сына Гердзеня цвярскога біскупа Андрэя і тым самым прызнаў праўдзівасць яго [204]. Навошта ж тады адмаўляць іншыя звесткі гэтага летапісу, якія не супярэчаць даным сучаснай гістарычнай навукі? Хіба не мог узнікнуць Віленскі ўдзел Полацкага княства і хіба не маглі вільняне ўзяць сабе полацкіх князёў, калі вядома, што Вільня заснавана крывічамі, існавала доўгі час як Крывы Горад, ці Крывічград, прынамсі, ужо ў XI ст., магчыма, была адной са сталіц крывічоў [205]? Чаму не маглі паходзіць вялікія літоўскія князі Віцень і Гедымін ад віленскіх князёў? Чамусьці не звяртаецца ўвага на тое, што браты Гедыміна насілі славянскія імёны Віцень і Воін. Таксама няма падстаў лічыць імя Гедыміна літоўскім. У свой час В. Юргевіч назваў кур'ёзам паходжанне імёнаў літоўскіх князёў Ягайлы, Кейстута, Гедыміна, Свідрыгайлы, Скіргайлы, Войшалка, Вітаўта і іншых шукаць у літоўскай мове. Ён шляхам філалагічнага аналізу паказаў славянскае паходжанне імёнаў літоўскіх князёў [206].

Полацкія князі, апынуўшыся на балцка-літоўскіх землях, у паганскім асяроддзі, з палітычных меркаванняў прыкідваліся язычнікамі, пра што ў свой час слушна заўважыў А. Кіркор [207]. У сувязі з гэтым заслугоўвае ўвагі тое, што ў пераліку балцка-літоўскіх князёў у дагаворы 1219 г. самы першы і самы старэйшы з іх носіць славянскае імя Жывінбуд. Гэтак жа сама і літоўскія князі (Міндоўг, Войшалк, Даўмонт, Таўцівіл і інш.), апынуўшыся на княскіх пасадах у суседзяў славян, прымалі праваслаўе. Відаць, ні полацкія, ні літоўскія князі не вызначаліся рэлігійным фанатызмам і таму па некалькі разоў мянялі сваю веру дзеля палітычных інтарэсаў (Міндоўг, Таўцівіл). Тое, што Воін стаў полацкім князем, таксама сведчыць пра ягоную прыналежнасць да роду полацкіх князёў (полацкае веча не прымала князёў чужых дынастый). А гэта ў сваю чаргу з'яўляецца пацвярджэннем таго, што яго браты Віцень і Гедымін таксама паходзяць з роду полацкіх князёў. Такім чынам, можна з вялікай доляй упэўненасці сказаць, што з канца XIII ст. у Вялікім княстве Літоўскім запанавала полацкая княская дынастыя.

Гаворачы пра ўзаемаадносіны хрысціянства і языч-

ніцтва, трэба ўлічваць яшчэ адну акалічнасць. Пашырэнне хрысціянства на беларускіх землях было далёка не мірным працэсам. Яно суправаджалася ўзмацненнем феадальнай эксплуатацыі. А гэта не магло не выклікаць супраціўленне шырокіх мас сялянства, што часам набывала форму барацьбы з хрысціянствам. Трэба думаць, што нямала было сялян, якія, ратуючыся ад феадальнага прыгнёту і звязанага з ім хрысціянства, уцякалі ў балцка-літоўскія землі і там доўгі час заставаліся язычнікамі. Таму пашырэнне хрысціянства на беларускіх землях некаторым чынам спрыяла славянскай каланізацыі ў балцка-літоўскіх землях. Доўгі час заставаліся язычнікамі і асіміляваныя балты. Усё гэта дае падставу меркаваць, што прыналежнасць да язычніцтва не была выключнай адзнакай балтаў не толькі ў XI—XII, але і ў XIII—XIV стст. і нават на пачатку XV ст. Гэтым, відаць, і тлумачыцца тое, што ў асяроддзі беларусаў аж да XX ст. у значна большай ступені, чым у іншых славянскіх народаў, захаваліся перажыткі паганства.

Полацкая каланізацыя, якая ішла галоўным чынам па р. Вілії ў глыб балцка-літоўскіх земляў, садзейнічала далейшаму росту Крывога Горада — Вільні, што ўзвышала значэнне віленскіх князёў. Новагарадок мог быць цэнтрам Вялікага княства Літоўскага да таго часу, пакуль яно не выходзіла за межы Нёманскага басейна. Па меры пашырэння дзяржавы ўсё больш акрэслівалася яго нявыгаднае становішча — ізаляванасць ад іншых земляў, асабліва тых, што ляжалі ў Дзвінскім басейне.

У гэтых адносінах Вільня была ў лепшым становішчы. Размешчаная на скрыжаванні важных гандлёвых шляхоў, у тым ліку і на Вілії, якая злучала яе з Полацкай зямлёй, яна ўсё больш набывала цэнтральнае значэнне ў дзяржаве. «Яшчэ да часу княжання Гедыміна Крывы Горад развіўся ў такое значнае паселішча, што Гедымін палічыў патрэбным перанесці ў яго сталіцу Вялікага княства Літоўскага» [208]. Няма падставы сцвярджаць, што адной з прычын перанясення сталіцы ў Вільню з'яўлялася тое, што яна была размешчана «ў цэнтры карэннай літоўскай зямлі, цэнтры народнасці» [209]. Па-першае, што разумець пад карэннай літоўскай зямлёй? Ёю была перш за ўсё зямля летапіснай Літвы, якая, як мы бачылі, знаходзілася ў Верхнім Панямонні, у акружэнні славянскіх земляў. Па-другое, Аўкштайція і Нальшчаны ўжо даўно былі аб'ектам крывіцкай кала-

нізацыі, вынікам чаго і было ўзнікненне Крывога Горада — Вільні, які, паводле даных археалогіі, «быў заснаваны крывічамі ў час пашырэння тэрыторыі Полацкага княства ў раннюю феадальную эпоху на захад» [210]. Таму становішча Вільні вызначалася не тым, што яна была цэнтрам «карэннай літоўскай зямлі», а тым, што гэта быў адзін з даўніх і буйнейшых цэнтраў крывіцкай каланізацыі балцка-літоўскіх земляў. Праўда, там жыло разам з крывіцкім і карэннае насельніцтва, стаяла свяцілішча паганскага бога Пяркунаса, аднак усё гэта ўжо не было вырашальным фактарам. Тут, як і паўсюдна на балцка-літоўскай тэрыторыі, куды пранікала крывіцка-дрыгавіцкая каланізацыя, працягваўся інтэнсіўны працэс асіміляцыі. Наколькі ён быў моцны, сведчыць і тое, што ў летапісе, дзе апавядаецца аб заснаванні Гедымінам Вільні (як мог літовец даць ёй славянскую назву?), Вілія ўжо не называецца па-літоўску Нярысам [211]. А. Качубінскі памыляўся, калі лічыў, што беларуская мова пашырылася на захад ад Вільні толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XIX ст.[212], бо ўжо ў кнізе, выдадзенай у 1861 г., гаворыцца, што ў прасторы паміж Вільняй і Трокамі просты народ, г. зн. карэннае насельніцтва, гаворыць па-беларуску [213]. Але А. Качубінскі зусім слушна адзначаў, што Віленская губерня... уваходзіць у тэрыторыю беларускага племя і сама Вільня ўжо за рубяжом літоўскім [214]. У свой час У. І. Ленін адзначаў, што ў Віленскай губерні літоўскім з'яўляецца толькі Трокскі павет [215]. Такі вынік быў прадвызначаны яшчэ ў XI—XIII стст. заснаваннем тут Вільні і іншых крывіцкіх калоній у Нальшчанах і Аўкштайціі.

Такім чынам, перанясенне сталіцы Вялікага княства Літоўскага з Новагарадка ў Крывы Горад — Вільню было вынікам далейшай крывіцка-дрыгавіцкай каланізацыі ў глыб балцка-літоўскіх земляў. Яно сведчыла таксама, што на першае месца ў гэтай дзяржаве выходзіла Полаччына. А гэта выклікала змену новагародскай дынастыі на полацкую. У святле прыведзеных фактаў нельга пагадзіцца са сцверджаннем пра «паступовае пранікненне» [216] і «наступленне Літвы на Русь» [217]. Фактычна было паступовае адступленне Літвы пад націскам славянскай каланізацыі. Прычым утварэнне Вялікага княства Літоўскага не толькі не спыніла, а, наадварот, яшчэ больш паскорыла асіміляцыю балцка-літоўскага насельніцтва. Ф. Д. Гурэвіч лічыць, што прасоўванне ме-

жаў беларускай мовы ў зону пашырэння літоўскіх археалагічных помнікаў, відаць, адносіцца да XIV ст.[218], г. зн. да таго часу, калі ўжо ўтварылася Вялікае княства Літоўскае. І ў гэтым нічога дзіўнага няма, бо ў новаўтворанай дзяржаве беларуская культура была пануючай, а беларуская мова — дзяржаўнай. На падставе гэтага нельга пагадзіцца з думкай, што Беларусь у Вялікім княстве Літоўскім была падначаленай[219] і займала ў ім нераўнапраўнае становішча[220]. У такім выпадку становіцца незразумелым, чаму падначаленая, эксплуатуемая і нераўнапраўная краіна ўвесь час пашырала сваю тэрыторыю, а пануючая, якой лічыцца Літва, траціла сваю тэрыторыю і насельніцтва. Усё гэта гаворыць за тое, што беларускі народ у складзе Вялікага княства Літоўскага прадаўжаў тварыць сваю гісторыю, развіваў культуру, а не рабіў толькі ўклад у чужую гісторыю[221].

Тое, што ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага паспрыяла славянскай каланізацыі балцка-літоўскіх земляў і асіміляцыі іх насельніцтва і што пануючай культурай у ім стала беларуская культура і дзяржаўнай мовай беларуская, характарызуе гэту дзяржаву як славянскую. Такім чынам, не так званыя літоўскія набегі на заходнерускія землі, а славянская каланізацыя балцка-літоўскіх земляў была значным фактарам ва ўтварэнні Вялікага княства Літоўскага.

5

ДЛЯ КАГО БЫЛА БОЛЬШАЯ ПАГРОЗА?

Мангола-татарскае нашэсце і нямецкая агрэсія ў сучасных падручніках па гісторыі і навуковых даследаваннях паказваюцца як фактары, што нібыта паспрыялі захопу беларускіх земляў Літвой: «Барацьба Русі з татара-мангольскімі заваёўнікамі значна аблегчыла літоўскім князям ажыццяўленне іх захопніцкай палітыкі ў адносінах да рускіх земляў. Ва ўмовах татара-мангольскай няволі некаторыя феадалы Русі ў асобе Літоўскай дзяржавы бачылі сілу, якая не толькі можа даць адпор татарскім і нямецкім захопнікам, але і разам з тым будзе садзейнічаць далейшаму ўмацаванню іх панавання над сялянскімі масамі» [222]. Прыблізна тое ж самае сказана і ў другім даследаванні: «Феадалы, якія прыйшлі да ўлады ў Аўкштайціі, пайшлі на змову з феадаламі значна больш развітай Беларусі, напалоханымі Ардой і Ордэнам. Падзяліўшыся рэнтай з літоўскімі пануючымі класамі, беларускія феадалы ўвайшлі ў яго склад» [223]. Але ж добра вядома, што Беларусь, за выключэннем яе крайніх паўднёвых мясцін, не ведала мангола-татарскага нашэсця. Значыць, феадалам Беларусі не было ніякай патрэбы шукаць абароны ў Літоўскай дзяржавы ад татараў. Больш таго, паводле сведчання летапісаў, літоўскія князі ніколі не атрымлівалі ніякіх перамог над мангола-татарамі.

Праўда, у вядомай «Хроніцы Быхаўца» апавядаецца пра дзве бітвы, у якіх нібыта былі разгромлены літоўскімі войскамі татары,— пад Магільным і пад Койданавам. Аднак шэраг акалічнасцей прымушае сумнявацца ў тым, што яны ў сапраўднасці былі.

Вось што гаворыцца пра Магільнянскую бітву. Пасля таго як літоўскі князь Рынгальт немалы час пракняжыў у Новагарадку, рускія князі Святаслаў Кіеўскі, Леў Уладзімірскі і Дзмітрый Друцкі рашылі выгнаць яго з Новагарадка. Узяўшы сабе на дапамогу ад цара заволжскага

некалькі тысяч татараў, яны рушылі на Новагарадок. І вось Рынгальт сустрэў іх на Нёмане, ля Магільна (зараз на тэрыторыі Уздзенскага р-на, Мінскай вобл., перайменавана ў Нёман), і ў лютым баі, які працягваўся цэлы дзень, разбіў сваіх праціўнікаў, атрымаў вялікую перамогу і з багатай здабычай вярнуўся ў Новагарадок [224]. У «Хроніцы Быхаўца» не ўказана, калі адбылася гэта падзея. У ранейшай гістарычнай літаратуры яна адносілася да 1235 г.[225] Але прыняць гэтую дату нельга, бо тут упамінаюцца татары, якія з'явіліся на Русі толькі ў канцы 30-х гадоў XIII ст. Апроч таго, Рынгальт не мог княжыць у 1235 г. у Новагарадку, бо ў гэты час тут княжыў Ізяслаў, як сведчыць Іпацьеўскі летапіс. Сярод князёў, што ішлі на Рынгальта, упамінаецца Леў Уладзімірскі. Гэта магло б дапамагчы ўстанавіць найбольш верагодную дату гэтай падзеі, калі б яна сапраўды была. У Іпацьеўскім летапісе пад 1274 г. сказана, што шэраг рускіх князёў, сярод якіх быў і галіцкі (а не ўладзімірскі) князь Леў, разам з татарамі ішлі на Новагарадок [226], які ў той час быў сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Паколькі рускія князі і татары рухаліся на Новагарадок ад Слуцка [227], то іх шлях мог праходзіць і праз Магільна. Аднак летапіс, які падрабязна асвятляе гэты паход рускіх князёў і татараў, нічога не гаворыць пра бітву пад Магільнам. Як мы ведаем, у «Хроніцы Быхаўца» сказана, што гэта бітва была вялікай і што рускія і татары пацярпелі страшэннае паражэнне, і яны, вядома, пасля такой няўдачы не маглі б ісці далей Новагарадка. А між тым летапіс гаворыць, што яны, перайшоўшы р. Сэрвеч, падышлі да Новагарадка і ўзялі яго акольны горад. Выдуманым з'яўляецца і сам князь Рынгальт, бо нідзе ў іншых крыніцах ён не ўпамінаецца. Апроч таго, «Хроніка Быхаўца» называе яго вялікім князем, але ў 1274 г. ён не мог быць такім, бо ў гэты час у Новагарадку княжыў Трайдзень. Не мог быць ён і бацькам Міндоўга, бо апошні загінуў у 1263 г., а ў «Хроніцы Быхаўца» сказана, што Міндоўг стаў княжыць пасля смерці Рынгальта. Усё сказанае не пацвярджае таго, што была бітва пад Магільнам, у прыватнасці, у 1274 г., найбольш верагодным для яе, асабліва калі ўлічыць, што ў «Хроніцы Літоўскай і Жмойцкай» яна значыцца пад 1284 г.[228] (у гэтай крыніцы многія падзеі зрушаны на 10—15 гадоў наперад). Тым не менш усё гэта не выключае таго, што гэтая бітва была. Магчыма, што яна была

калі-небудзь, але яе апісанне ў «Хроніцы Быхаўца» з'яўляецца скажоным да непазнавальнасці, як гэта адбылося і з бітвай пад Гарадцом у 1161 г., аб чым мы гаварылі раней. Не выключана, што і бітва пад Магільнам адбылася таксама ў полацкія часы, а пасля была прыпісана літоўскім князям.

Малаверагодная бітва пад Қойданавам, бо звесткі пра яе яшчэ больш супярэчлівыя. У «Хроніцы Быхаўца» сказана, што заволжскі татарскі цар Балаклай сабраў вялікую раць і пайшоў на Русь. А Вялікі князь Скірмант, сабраўшы сваё войска ў Қойданаве, перамог усю раць татарскую і самога цара забіў [229]. У літаратуры гэта падзея адносілася да 1241 г.[230] Апроч таго, указваецца яшчэ адна бітва пад Қойданавам, у якой нібыта Міндоўг у 1249 г. разбіў татараў, якіх узначальваў Қайдан, і яго саюзнікаў галіцка-валынскіх князёў Данілу і Васілька. Прычым сцвярджаецца, што Қайдан загінуў тут, і таму пайшла назва «Қойданаў», які да гэтага называўся Крутагор'ем. Гэта найбольш пашыраная версія, і яна нават увайшла ў сучасныя падручнікі па гісторыі Беларусі [231]. У «Запісках Қацярыны II» прыведзены звесткі аб бітве пад Қойданавам у 1276 г., якія нагадваюць падзеі бойкі 1241 г.

Паколькі ўсе гэтыя бітвы звязаны з татарамі, то яны не маглі адбыцца ні ў 1241, ні ў 1249 гг., бо, як паказваюць даследаванні, першае ўварванне татараў на тэрыторыю Беларусі адбылося ў 1258 г.[232] Бітву 1241 г. мы наогул павінны адкінуць як выдуманую, бо ніколі не было ні вялікага літоўскага князя Скірманта, ні татарскага хана Балаклая. Нешта ёсць падобнае ў падзеях 1249 і 1258 гг. Сапраўды, князем літоўскім тады быў Міндоўг, разам з татарамі ішоў валынскі князь Васількa (яго брат Даніла, прыкінуўшыся хворым, ухіліўся ад гэтага паходу). Але татараў узначальваў не Қайдан, а Бурундай, і, што самае важнае, ніякай перамогі Міндоўг не атрымліваў: татары на чале з Бурундаем без супраціўлення занялі землі Літоўскую і Нальшчанскую (нагадаем, што гэта тэрыторыя на захадзе сучаснай Беларусі). Гэта пацвярджае і Наўгародскі I летапіс, у якім сказана, што татары ўзялі ўсю зямлю Літоўскую, а саміх пабілі [233].

Трэба зазначыць, што ёсць яшчэ сумненні ў праўдзівасці існавання Қайдана. Сярод татарскіх ханаў, военачальнікаў і ваяводаў ён не значыцца [234]. Праўда, у татар-

скага хана Менгу Цімура, які цараваў у Залатой Ардзе з 1266 па 1280 г., быў сын Кадан [235]. Менавіта ў Менгу Цімура галіцкі князь Леў Данілавіч прасіў дапамогі ў паходзе на Новагарадок. У 1274 г. Менгу Цімур даў татарскае войска, але яго ўзначальваў не Кадан, а ваявода Ягурчын [236]. Паводле Галіцка-Валынскага летапісу, татары хадзілі на Новагарадок і ў 1277 г. Таму можна меркаваць, што яны ішлі праз Койданаў. Але, па-першае, пацярпеўшы там паражэнне, яны б не пайшлі далей. Па-другое, узначальваў гэта войска татараў не Кайдан, а ваявода Мамшэй [237]. Усё адзначанае сведчыць, што Койданаўскай бітвы не магло быць ні ў 1274, ні ў 1276, ні ў 1277 гг. Апроч таго, тапонім «Койданаў» на Беларусі не адзін (населены пункт з такой назвай быў таксама недалёка ад г. Паставы [238], што таксама ставіць пад сумненне паходжанне гэтай назвы ад імя татарскага хана.

З вышэйсказанага вынікае, што Магільнянская і Койданаўская бітвы — гэта хутчэй за ўсё міфы, створаныя ў XVI ст., для ўзвелічэння літоўскіх князёў, якія быццам толькі адны маглі супрацьстаяць мангола-татарскім заваёўнікам, чаго ў сапраўднасці не было.

Вядома, нельга адмаўляць пагрозы татарскага нашэсця, якая вісела над беларускімі землямі, бо ўварванні татараў, як мы ўжо бачылі, сапраўды былі. Аднак і нельга справу паказваць так, нібы толькі Літва магла абараніць Беларусь ад татарскай заваёвы. Яна не магла абараніць і сваёй зямлі ад татараў, як гэта было ў 1258 г. Вось чаму беларускія феадалы не маглі бачыць у асобе літоўскіх князёў сілу, здольную абараніць іх ад татараў. Вось чаму беларускім феадалам не было патрэбы дзяліцца з літоўскімі феадаламі сваёй «рэнтай».

Тое, што Беларусь не ведала мангола-татарскага пагрому і панавання, мела для яе важнае значэнне, якое пакуль што яшчэ не ацэнена ў гістарычнай навуцы. Як вядома, мангола-татарскае панаванне перапыніла і замарудзіла працэс палітычнага аб'яднання рускіх і ўкраінскіх земляў, падарвала іх прадукцыйныя сілы. Усяго гэтага пазбегла Беларусь. Яе аб'яднанне не было спынена, а яе прадукцыйныя сілы ў выніку прытоку новага насельніцтва яшчэ больш узраслі. Усё гэта і было прычынай таго, што фарміраванне тэрыторыі Беларусі і ўтварэнне беларускай народнасці пайшлі хутчэй, чым аналагічныя працэсы ў іншых усходнеславянскіх землях. Так, калі ў першай палове XIV ст. пры Іване Каліце пачало

толькі ўзвышацца Маскоўскае княства, то беларускія землі к гэтаму часу амаль усе былі сабраны і аб'яднаны ў Вялікім княстве Літоўскім. Беларускія феадалы выкарысталі ў сваіх інтарэсах выгадную для іх кан'юнктуру, у прыватнасці аслабленне рускіх і ўкраінскіх земляў у барацьбе з татарамі, і заваявалі значныя часткі іх тэрыторый.

Паколькі культурныя цэнтры Беларусі не былі разбураны, беларуская культура развівалася без перашкод, што было прычынай яе высокага ўзроўню. Таму яна і заняла пануючае месца ў Вялікім княстве Літоўскім, а беларуская мова стала ў ім дзяржаўнай.

Што да нямецкай агрэсіі, то яна сапраўды з'явілася цяжкім ударам для Полацка. У выніку яе Полацкае княства было адсечана ад Балтыйскага мора, што істотна паўплывала на далейшую гісторыю Беларусі. Аднак, гаворачы пра гэта, нельга справу паказваць так, нібы беларускія землі знаходзіліся ў бязвыхадным становішчы і іх магла выратаваць толькі Літва. Не меншую пагрозу нямецкая агрэсія несла і народам Прыбалтыкі, якія разам з Полаччынай сталі аб'ектам нападу «псоў-рыцараў». Апошнім удалося, пакарыўшы балцкія плямёны прусаў, куршаў і земгалаў, з трох бакоў акружыць Жамайцію. Над ёй, як над іншымі балцкімі землямі, навісла смяротная пагроза. Са сказанага відаць, што нямецкай агрэсіяй былі запалоханы не толькі беларускія, але яшчэ ў большай ступені феадалы балцкіх земляў. Калі Полаччына траціла набытыя ёю ў Ніжнім Падзвінні землі, то балты трацілі свае карэнныя землі. Дык хіба маглі феадалы Літвы ў гэты час адважыцца на заваёву беларускіх земляў, хіба маглі беларускія феадалы ў іх асобе бачыць абаронцаў ад нямецкай агрэсіі?

У даследаваннях па гісторыі адзначаецца, што нямецкая агрэсія прымусіла балцка-літоўскія землі аб'яднацца і гэтым самым паскорыла працэс утварэння Літоўскай дзяржавы. Гэта, маўляў, і дало магчымасць літоўскім феадалам заваяваць беларускія землі, якія нібыта былі раз'яднаныя. Аднабаковасць гэтай схемы відавочная, бо застаецца незразумелым, чаму тая ж самая нямецкая агрэсія не прымусіла аб'яднацца беларускія землі. Мы ўжо гаварылі, што раз'яднанасць беларускіх, у прыватнасці полацкіх, земляў у XIII ст. надзвычай перабольшана. На горкім вопыце пазнаўшы смяротную пагрозу нямецкай агрэсіі, Полаччына шчыльней згуртоў-

валася для адпору ворагу. Трэба сказаць, што Полацк не адразу разгледзеў сапраўдную сутнасць нямецкіх рыцараў. Полацкі князь Уладзімір у 1186 г. даў нямецкаму манаху Мейнарду, відаць, угледзеўшы ў яго дзейнасці толькі місіянерскі, а не захопніцкі характар, дазвол на права хрышчэння ліваў, якія залежалі ад Полацка. Яшчэ больш легкадумна паставіліся напачатку да рыцараў у іншых краінах Усходняй Еўропы. Літоўцы (летоны) у 1202 г. заключылі дагавор з біскупам Альбертам супраць земгалаў. Мазавецкі князь Конрад у 1225 г. запрасіў тэўтонаў для барацьбы з прусамі. Не раз сумесна з рыцарамі дзейнічалі пскоўскія і наўгародскія атрады. Гэтая бесклапотнасць і была адной з прычын першых поспехаў немцаў ва Усходняй Еўропе. Для Полацка яна абярнулася стратай Ніжняга Падзвіння.

Згуртаванасць Полаччыны ў барацьбе з крыжакамі вельмі добра выяўлена ў «Хроніцы Лівоніі». Так, паводле яе, для паходу на тэўтонаў «полацкі кароль Вальдэмар (Уладзімір) сабраў войска з усяго свайго каралеўства, а таксама ад суседніх каралёў (удзельных князёў Полаччыны), сваіх сяброў і з вялікай храбрасцю спусціўся ўніз па Дзвіне» [239]. Хіба магло быць такое пры міжусобнай барацьбе?

Смяротная пагроза нямецкай агрэсіі, якая навісла як над Полацкам, так і над балцка-літоўскімі землямі, патрабавала з'яднання іх сіл. Яскравым сведчаннем гэтаму можа быць тое, што войска Уладзіміра Полацкага, з якім ён у 1216 г. сабраўся ісці на Рыгу, напалову складалася з літоўцаў. Важным фактарам у арганізацыі адпору рыцарам было ўмацаванне сувязей Полацкай зямлі з суседнімі рускімі землямі, у першую чаргу з Наўгародскай і Пскоўскай. Пацверджаннем гэтага з'яўляецца жаніцьба наўгародскага князя Аляксандра Неўскага на дачцы полацкага князя Брачыслава ў 1239 г. Саюз Полацкай і Наўгародскай земляў быў важнай умовай перамогі над нямецкімі агрэсарамі на Чудскім возеры ў 1242 г., што ў далейшым палегчыла і абарону беларускіх земляў ад крыжакоў. Адзінства Полацкай, Наўгародскай і Пскоўскай земляў прывяло да перамогі над немцамі і ў 1262 г. пад г. Юр'евам.

6

ШТО Ж ЗАВАЯВАЎ МІНДОЎГ?

Ні раздробленасць беларускіх земляў, ні літоўскія набегі на іх, ні мангола-татарскае нашэсце і нямецкая агрэсія — усё тое, што ў гістарычнай навуцы прымаецца за фактары, якія нібыта абумовілі так званае літоўскае заваяванне беларускіх земляў, нельга прызнаць пераканаўчымі довадамі. Сцверджанне пра літоўскае панаванне над Беларуссю трымаецца, па сутнасці, на традыцыі, якая ідзе ад гісторыка-публіцыстычных твораў XVI ст. Аднак іх легендарнасць, як было паказана вышэй, не выклікае сумнення.

Немалаважную ролю ў жывучасці міфа аб літоўскай заваёве мела тое, што дзяржава называлася Літоўскай. Але мы ўжо паказалі, што ў час утварэння яе назва «Літва» адносілася не да сучаснай Літвы. Акрамя таго, не варта на ўсе выпадкі гісторыі пашыраць звыклае ўяўленне, што дзяржава атрымлівае назву ад той сваёй часткі, якая дамінавала падчас яе ўтварэння. Заходняя балцкая зямля Прусія была ў канцы XIII ст. канчаткова заваявана немцамі і пасля анямечана. Аднак назвы сваёй яна не толькі не страціла, але і пашырыла яе на захад. У 1618 г. Прусія была далучана да Брандэнбурга [240], аднак і пасля гэтага захавала сваю назву, якая перайшла на Брандэнбург. Дык хіба на падставе яе назвы трэба лічыць Прусію дзяржавай не немцаў, а прусаў? Нешта падобнае адбылося і з Літвой. Заваяваная Новагарадком, яна таксама не страціла сваёй назвы і стала пашыраць яе на захад, у тым ліку і на сучасную Літву. І таму як нельга лічыць, што назва «Прусія» пашыралася з Берліна, так і нельга лічыць, што назва «Літва» пашыралася з Вільні. Цікава адзначыць яшчэ адну паралель. Як назва прусаў перайшла на ўсходніх немцаў і яны сталі называцца прусакамі, так і назва «літва» перайшла на панямонскіх беларусаў, якія доўгі час называліся ліцвінамі.

Прынята лічыць, што ў поўнай назве дзяржавы «Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае» другая ўключае ў сябе беларускія і ўкраінскія землі. Аднак ёсць падставы (на жаль, на іх не звяртаецца ўвага), якія могуць гаварыць за тое, што паняцце «Рускае» стасавалася толькі да ўкраінскіх земляў, а паняцце «Літоўскае» — толькі да беларускіх земляў. Так, калі ў выніку Люблінскай уніі 1569 г. украінскія землі перайшлі да Кароны, г. зн. да Польшчы, і, такім чынам, больш не належалі Вялікаму княству, то летапісы апошняга, створаныя ў гэты час (Красінскага, Рачынскага, Румянцаўскі, Яўрэінаўскі і інш.), называюць сваю дзяржаву княствам Літоўскім і Жамойцкім [241]. Таму можна зрабіць вывад, што пад «Літоўскім» тут разумеюцца беларускія землі, а пад «Жамойцкім» — літоўскія ў сучасным разуменні. Паказальна і тое, што беларуская мова тады часамі выступала пад імем літоўскай. Так, Л. Зізаній, тлумачачы значэнне загалоўка сваёй кнігі «Катэхізіс», гаворыць, што «по-литовски — это оглашение, русским же языком нарицается беседословие» [242]. Тут значэнне слова «літоўскі» тоеснае паняццю «беларускі», якое ў сваю чаргу адрозніваецца ад паняцця «рускі». Гэтак жа і Л. Бярында ў сваім «Лексиконе» (1627) беларускую мову таксама называе літоўскай. І ўжо ў XVIII ст. біскуп В. Садкоўскі пагражаў на слуцкім епархіяльным саборы мясцовым папам, якія ў сваёй практыцы ўжывалі беларускую мову: «Я вас скарэню, знішчу, што б і языка не было вашаго праклятаго літовского» [243]. Гэтыя і іншыя падобныя факты паказваюць, што паняцці «Літва» і «літоўскі» ў мінулым перш за ўсё адпавядалі сучасным паняццям «Беларусь» і «беларускі».

Застаецца яшчэ адзін довад на карысць версіі літоўскай заваёвы Беларусі, а менавіта тое, што ў канцы 40-х гадоў XIII ст. у Новагародскай зямлі стаў княжыць выхадзец з Літвы Міндоўг. Але ці з'яўлялася гэта толькі вынікам заваявання Новагарадка Міндоўгам? Для высвятлення такога пытання трэба прыгадаць тое, што многія літоўскія князі і феадалы, пацярпеўшы паражэнне ў міжусобнай барацьбе, перабягалі ў суседнія краі (у Ордэн, Рыгу, рускія землі), дзе былі жаданымі людзьмі, там іх ахвотна прымалі, кампенсавалі страчаную маёмасць. Прыняўшы хрысціянства і атрымаўшы вайсковую сілу, яны нападалі на літоўска-балцкія землі, чынячы там пагром і разбурэнні [244]. Нямала прыкладаў такіх пе-

рабежчыкаў у Ордэн прывёў у сваёй кнізе У. Пашута.

Цікавы лёс двух нальшчанскіх перабежчыкаў Суксе і Даўмонта, якія, ратуючыся ад Войшалка, уцяклі з радзімы: першы — у Рыгу, другі — у Пскоў. Яны сталі вернымі служкамі сваіх новых айчын і заклятымі ворагамі сваёй зямлі. Вось што гаворыць пра Суксе нямецкая хроніка: «Суксе нарадзіўся ў Літве, прыняўшы хрысціянства, ён жыў сярод ордэнскіх рыцараў, вызначаючыся храбрасцю і богабаяззю. Загінуў у час паходу на Літву» [245].

Гэтак сама вядзе сябе ў адносінах да Літвы і Даўмонт, абраны ў 1266 г. пасля прыняцця ім хрысціянства пскоўскім князем. Вось некалькі вытрымак з Наўгародскага I летапісу: «В лето 6774 (1266). Вложи бог в сердце Довмонту благодать свою... отомстити кровь крестьянскую, и поиде с пльсковичи на поганую Литву, и повоеваша много... и пособи бог князю Довмонту с пльсковичи и множьство много их (літвы) побиша, а иные в реце истопиша... Того же лета на зиму ходиша паки пльсковичи на Литву с князем Довмонтом. В лето 6775 (1267)... ходиша новгородцы с Ельферьем Сбысловичем и с Доумонтом с пльсковичи на Литву, и много их повоеваша» [246].

Прыклад Даўмонта паказвае, што з'яўленне ў той ці іншай рускай зямлі князя з Літвы не можа быць доказам заваявання яе Літвой, бо ён мог быць там не як заваёўнік, а як перабежчык ці наёмнік. Адсюль вынікае, што абранне ў сярэдзіне XIII ст. у некаторых рускіх землях князёў літоўскага паходжання было сведчаннем не ўзмацнення Літвы, а, наадварот, яе распаду і аслаблення, бо яны там былі не яе стаўленікамі, а яе ворагамі.

Такім перабежчыкам, па ўсім відаць, быў і Міндоўг, бо паводзіны яго цалкам нагадваюць паводзіны іншых літоўскіх перабежчыкаў. Важна зазначыць, што ўсе папярэднія звесткі пра Міндоўга характарызуюць яго выключна як наёмніка. Першы раз ён упамінаецца ў дагаворы 1219 г., дзе ён разам з іншымі балцка-літоўскімі князямі абавязаўся перад галіцка-валынскімі князямі ваяваць супраць палякаў [247]. Гэтак жа сама і ў 1237 г. ён разам з новагародскім князем Ізяславам паводле жадання Данілы Галіцкага ваяваў з Конрадам Мазавецкім [248]. У 1245 г. Міндоўг зноў на баку Данілы Галіцкага ў яго барацьбе з чарнігаўскім князем Расціславам [249]. Дзесьці ў прамежку 1245—1246 гг. ён быў запрошаны

куронамі для дапамогі ім у змаганні з немцамі. Аднак пад крэпасцю Амботэн ён пацярпеў страшэннае паражэнне і вымушаны быў адступаць. Крыжакі напалі на яго ўладанні і хаця не ўзялі яго ўмацавання, аднак нанеслі вялікія спусташэнні і разбурэнні яго зямлі [250]. Гэта не магло не прывесці да аслаблення пазіцый Міндоўга ў Літве, што і выкарысталі яго праціўнікі. У міжусобнай барацьбе, якую яны развязалі супраць Міндоўга, ён пацярпеў паражэнне і быў вымушаны ўцякаць у суседні Новагарадок. Яўны намёк на ўсё гэта ёсць у Іпацьеўскім летапісе, дзе гаворыцца, што Міндоўг пазней выгнаў літоўскіх князёў «за ворожьство с ними» [251]. Значыць, Міндоўг помсціў за варожыя адносіны да яго.

Для кожнага перабежчыка з Літвы было абавязковым прыняцце хрысціянства: у Ордэне — заходняга, каталіцкага абраду, у старажытнарускіх землях — усходняга, праваслаўнага. Тое ж самае зрабіў і Міндоўг. Густынскі летапіс пад 1246 г. паведамляе: «Миндовг приять веру христианскую от Востока со многими своими бояры... непомнозе же сын его Войшелк пострижеся во иночество». На жаль, гэта летапіснае паведамленне застаецца па-за ўвагай даследчыкаў. І гэта не выпадкова, бо факт прыняцця Міндоўгам хрысціянства «от Востока» пацвярджае тое, што ён не заваяваў Новагарадок, а быў абраны тут князем, як пазней Даўмонт у Пскове. Яму як заваёўніку не патрэбна было б прымаць праваслаўе. Характэрна, што гэтак сама, як і Даўмонт уцёк у Пскоў «с 300 Литвы», так і Міндоўг у Новагарадок з'явіўся з многімі баярамі, якія таксама прынялі хрысціянства. Гэта дадатковае сведчанне, што Міндоўг быў адным з перабежчыкаў, якія ўцякалі з Літвы з усім сваім родам і акружэннем.

Хаця Густынскі летапіс і пазнейшая крыніца (XVII ст.), але адзначанае паведамленне, бясспрэчна, заслугоўвае поўнага даверу. Справа ў тым, што ўсе падзеі, пра якія гаворыцца тут, а менавіта гібель аўстрыйскага герцага Фрыдрыха, смерць князя Яраслава Усеваладавіча (бацькі Аляксандра Неўскага) і прыбыццё пасольства ад папы рымскага да татараў — гэтыя падзеі сапраўды адбыліся ў 1246 г. Пры гэтым звяртае на сябе ўвагу строгае захоўванне летапісцам храналагічнай паслядоўнасці ў перадачы падзей: першая з іх адбылася 15 чэрвеня [252], другая — 30 верасня [253], трэцяя — увосень [254]. Паколькі паведамленне пра Міндоўга пастаў-

лена апошнім, то можна думаць, што яго хрышчэнне адбылося дзесьці позняй восенню ці ў пачатку зімы, г. зн. у канцы года (тады сакавіцкага, на пачатку 1247 г.). Прыняцце Міндоўгам праваслаўя трэба лічыць пачаткам яго княжання ў Новагарадку ў канцы 1246 ці пачатку 1247 г. Мы не ведаем, хто быў князем у Новагарадку непасрэдна перад Міндоўгам. Як ужо адзначалася, у летапісе пад 1237 г. упамінаўся новагародскі князь Ізяслаў [255], але нічога не вядома пра далейшы яго лёс: дакуль княжыў тут і чаму перастаў княжыць. Пазней, у 1256 г., упамінаўся нейкі князь Ізяслаў у Свіслачы. Магчыма, што гэта — былы новагародскі князь.

Новагародскія феадалы добра ведалі Міндоўга як князя суседняй Літвы і ўдзельніка сумесных паходаў, як гэта было ў 1237 г. Галоўнай мэтай выбрання Міндоўга новагародскім князем была задума выкарыстаць яго для заваявання Літвы, што ўваходзіла ў планы багатых новагародскіх феадалаў як першае звяно пашырэння сваёй улады на іншыя суседнія землі і аб'яднанне іх. У гэты час для Новагарадка склаліся спрыяльныя ўмовы. Самая важная з іх тая, што Новагародскай зямлі ўдалося выйсці з-пад залежнасці ад галіцка-валынскіх князёў у першую чаргу таму, што іх зямля была аслаблена мангола-татарскім нашэсцем. І гэта адбылося недзе на пачатку 40-х гадоў XIII ст. Так, калі ў 1237 г. па волі Данілы Галіцкага супраць Конрада Мазавецкага разам з «Літвой Міндоўга» выступіў і новагародскі князь, то ў міжусобнай барацьбе на баку тых жа князёў у 1245 г. выступіў толькі Міндоўг. Ва ўсякім выпадку ўсе далейшыя дзеянні Новагарадка выяўляюць у ім самастойную сілу, што, натуральна, і выклікала супраць яго адпаведную рэакцыю галіцка-валынскіх князёў. У той жа час Літва як наёмная сіла значна аслабела. У такой сітуацыі Міндоўг для новагародцаў быў добрай знаходкай. Пакрыўджаны сваімі суайчыннікамі, ён лепш, чым хтонебудзь, з большай зацікаўленасцю і рашучасцю мог заваяваць сваю былую радзіму. Гэты вопыт Новагарадка быў эфектыўным, таму яго пазней паспяхова выкарыстал лі полацкія і пскоўскія феадалы. Яны таксама далі прытулак выгнанцам з Літвы і выбралі іх сваімі князямі. Неўзабаве Міндоўг прыступіў да заваявання Літвы, г. зн. да выканання таго, дзеля чаго ўзялі яго новагародцы. Іпацьеўскі летапіс пад 1252 г. сведчыць: «В то же лето изгна Миндовг сыновца своего Тевтевила и Едивида,

пославшю ему на войну его со вуем своим со Выконтом, на Русь воевать ко Смоленьску и рече: «Што кто приемлеть собе держить», вражбою бо за ворожьство с ними Литву зане, поимана бе вся земля Литовьская и, бесчисленое имение их притрено бо богатьство их, и посла на не вои свое хотя убити я» [256]. Тут, як і далей у летапісе, нібы ў люстэрку, адбілася гістарычная праўда. Як бачым, Міндоўг пайшоў на хітрасць. Падгаварыўшы сваіх пляменнікаў Таўцівіла і Едзівіда з іх дзядзькам Віконтам ісці пад Смаленск, ён паслаў наўздагон сваё войска, каб забіць іх. Відаць, Міндоўг паабяцаў ім дапамагчы, бо як інакш, не выклікаючы падазрэння, ён мог паслаць за імі сваё войска. У. Пашута гэты факт тлумачыў тым, што Міндоўг сапраўды паслаў іх ваяваць да Смаленска і нават абяцаў аддаць ім усё, што яны возьмуць. Больш таго, спасылаючыся на Суздальскі і Наўгародскі летапісы, кожны з якіх называе розныя даты (1248, 1245 гг.), а таксама на папскага пасла Плана-Карпіні, які падарожнічаў па Русі ў 1245—1246 гг., гэты даследчык сцвярджаў, быццам паход жамойцкіх князёў сапраўды закрануў полацка-віцебскія землі і паўночную частку Смаленшчыны [257]. Але далей У. Пашута прызнаў, што фактычна Міндоўг «изгна» жамойцкіх князёў [258].

Значыць, Таўцівіл, Едзівіт і Віконт (ці Вікінт) былі выгнаны з Літвы. Гэта адбылося ў выніку таго, што Міндоўг «Літву зане, паимана бе вся земля Литовьская». Прачытаеш гэтыя словы і здзіўляешся з-за таго, што бясконца гавораць і пішуць пра заваяванне Міндоўгам так званай Чорнай Русі, у той час як у сапраўднасці ён «Літву зане». Гэтыя словы з выключнай яскравасцю пацвярджаюць, што Міндоўг быў перабежчыкам у Новагарадку, а не яго заваёўнікам. Бо калі б ён з Літвы заваяваў Новагарадок, дык навошта яму было займаць Літву? Словы «паимана бе вся земля Литовьская» гавораць, што Міндоўг да гэтага не валодаў ніводнай часткай яе. Значыць, ён прыбыў у Новагарадок, страціўшы Літву.

У свой час М. Дашкевіч заўважыў, што даследчыкі не растлумачылі словы «вражбою бо за ворожьство с ними Литву зане» [259]. І гэта зразумела, бо ў гэтых словах заключалася абвяржэнне міфа пра заваяванне Міндоўгам Новагародскай зямлі, які быў узяты на ўзбраенне афіцыйнай гістарыяграфіяй. Сам М. Дашкевіч таксама не рызыкнуў парушыць казённае адзінадушша ў гэтым пы-

танні. У навуцы таксама не ставілася пытанне, чаму беларуска-літоўскія летапісы, перапоўненыя байкамі пра розных міфічных жамойцкіх князёў, якія нібыта княжылі ў Новагарадку, ні слова не гавораць пра гістарычна праўдзівага князя Міндоўга, які сапраўды быў тут. І толькі «Хроніка Быхаўца» перадае звесткі Іпацьеўскага летапісу пра Міндоўга, аднак выкінуўшы адтуль словы пра заваяванне ім Літвы, бо яны закрэслілі б байкі гэтага летапісу пра заваяванне літоўскімі князямі Новагарадка і Полацка. Характэрна, што і У. Пашута, пераказваючы гэта месца Іпацьеўскага летапісу, таксама апусціў словы «Литву зане» і ніяк не каменціруе словы «поимана бе вся земля Литовьская» [260].

Гэтыя словы летапісу ясна паказваюць, што ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага пачалося не з заваявання Новагародскай зямлі Літвой, а, наадварот, з заваявання Новагародскай зямлёй Літвы. Гэтую заваёву новагародскія феадалы ажыццявілі сваімі сіламі пры дапамозе перабежчыка з Літвы Міндоўга. Апошні, помсцячы князям Літвы за іх «ворожьство» да яго, адбіраючы ад іх «бесчисленое имение их», дзейнічаў у інтарэсах новагародскіх феадалаў. І таму не дзіўна, што феадалы Літвы аказалі ўпартае супраціўленне Міндоўгу. Адсюль яскрава бачна, што дзеянні Міндоўга вызначаліся інтарэсамі Новагарадка, а не Літвы. Сапраўды, калі прыняць супрацьлеглы пункт погляду, дык становіцца незразумелым, чаму ўтварэнню Літоўскай дзяржавы ўвесь час перашкаджаюць не беларускія, а літоўскія феадалы.

У. Пашута не меў рацыі, калі гаварыў, што «ўсё ішло адносна гладка, пакуль Міндоўг дзейнічаў у межах Аўкштайціі, але яго наступленне на правы жамойцкіх князёў выклікала феадальную вайну» [261]. Гэта супярэчыць фактам. Мы ўжо не будзем казаць, што У. Пашута прымаў летапісную Літву за Аўкштайцію, да якой Міндоўг не меў ніякіх адносін. У летапісе нічога не гаворыцца пра Жамойцію. У ёй сказана, што Міндоўг заняў Літву. Словы ж «поимана бе вся земля Литовьская» сведчаць пра захоп не толькі «Литвы Міндоўга», але і правабярэжнай Літвы. Аднак паняцце «вся земля Литовьская» ў той час не пашыралася на Жамойцію. Калі пасля забойства Міндоўга Транята стаў князем Літвы і Жамойціі, летапіс гэта і зафіксаваў: «Тренята нача княжити во всей земле Литовьской и в Жемоти» [262]. Пра Міндоўга ж там ні разу не сказана, і таму няма ніякіх падстаў

сцвярджаць, быццам ён наступаў толькі на правы жамойцкіх князёў. Невядома таксама, чаму У. Пашута называў Таўцівіла і Едзівіда жамойцкімі князямі. Яны былі сынамі брата Міндоўга Даўспрунга [263], а той у дагаворы 1219 г. названы князем Літвы. Вікінт — жамойцкі князь, але ён быў выгнаны таму, што разам з пляменнікамі пайшоў у паход. Потым ён сапраўды быў у Жамойціі. Такім чынам, няма падстаў сцвярджаць, што толькі жамойцкія князі аказалі супраціўленне Міндоўгу. У першую чаргу і галоўным чынам яму супрацьстаялі князі Літвы, інтарэсы якіх перш за ўсё закрануў ён.

Таўцівіл, Едзівіт і Вікінт, як і іншыя выгнаннікі з Літвы, страціўшы апору на сваёй зямлі, былі вымушаны звяртацца па дапамогу звонку. Даведаўшыся пра намер Міндоўга забіць іх, яны ўцяклі да галіцка-валынскіх князёў Данілы і Васілька, ведаючы, што прымуць іх там з радасцю. І не памыліліся.

Захоп Новагарадком Літвы не мог не выклікаць трывогі ў галіцка-валынскіх князёў. Узмацненне Новагарадка ў выніку пашырэння яго ўлады на Літву давала яму магчымасць узяць першынство ў аб'яднанні заходнерускіх земляў. А на гэту ролю прэтэндавалі самі галіцка-валынскія князі. Даніла Галіцкі даўно добра разумеў геапалітычнае значэнне Літвы. Нездарма ён быў жанаты на сястры Таўцівіла і Едзівіда [264]. І вось калі Міндоўг апынуўся ў Новагарадку і заваяваў Літву, ён ператварыўся з ранейшага саюзніка галіцка-валынскіх князёў у іх заклятага ворага, і таму яны адразу ацанілі ўсю сур'ёзнасць становішча. У здзяйсненні сваіх далейшых намераў наступіў падыходзячы момант для ўмяшання ў справы Новагародскай дзяржавы. Даніла Галіцкі адразу адправіў паслоў да польскіх князёў са словамі: «Яко время есть хрестьяном на поганее, яко сами имеють рать межу собою» [265]. Гэты выраз тлумачыць, чаму ў Галіцка-Валынскім летапісе адсутнічае паведамленне аб прыняцці Міндоўгам праваслаўя ў 1246 г.: яно б супярэчыла прыведзеным словам Данілы Галіцкага і рабіла б бяссэнсавым яго заклік да барацьбы з паганымі. Але справа, вядома, была не ў паганстве, бо менавіта са збеглымі феадаламі-язычнікамі галіцка-валынскія князі ішлі на саюз.

Збеглыя князі Літвы накшталт іншых перабежчыкаў з яе з'яўляліся паслухмянымі служкамі новых гаспадароў. Тыя паслалі іх у Ордэн і Рыгу, у Жамойцію і да

яцвягаў з мэтай стварэння кааліцыі супраць новай дзяржавы, што ўрэшце і ўдалося зрабіць шляхам подкупу. Аднак калі гэтым удзельнікам кааліцыі адводзілася другарадная роля, дык на сябе галіцка-валынскія князі ўзялі галоўную задачу — барацьбу з Новагарадком як цэнтрам новай дзяржавы. Гэтым самым яны зноў паказалі, што для іх галоўным ворагам было не паганства, а хрысціянская Новагародская зямля, і разгарнулі супраць яе шырокі наступ адразу ў трох кірунках — на Ваўкавыск, Слонім і Здзітаў, у выніку чаго «паидоста к Новугороду» [266] і «поимаша грады многы», «возвратишеся в домы» [267]. З гэтага бачна, што галіцка-валынскія князі не ставілі сваёй задачай на той час заваяванне Новагародскай зямлі: яны яе разбуралі і рабавалі і гэтым самым знясільвалі.

Даведаўшыся, што немцы збіраюцца дапамагчы Таўцівілу ў барацьбе з Міндоўгам, Даніла Галіцкі даў яму сваё войска і полаўцаў. З гэтай сілай Таўцівіл пайшоў у Рыгу, дзе прыняў каталіцкае хрышчэнне, Міндоўг убачыў што вакол яго сціскаецца варожае кола, і вырашыў таксама дзейнічаць подкупам у адносінах з Рыгай. Тут у яго была перавага над Вікінтам і Таўцівілам: казна новагародскіх феадалаў была багатая. Але адных раскошных дароў было мала. Рыжскім біскупам Андрэем была пастаўлена ўмова: прыняць хрышчэнне ад папы, і толькі тады Міндоўг адолее ворагаў, г. зн. яму будзе аказана патрэбная дапамога. Рымская курыя ўжо даўно ўважліва сачыла за падзеямі ва Усходняй Еўропе і выкарыстоўвала кожны зручны момант для пашырэння там уплыву каталіцкай царквы. Асабліва прыдатнымі ў гэтых адносінах былі моманты варожасці і саперніцтва паміж асобнымі землямі, у прыватнасці Новагародскай і Галіцка-Валынскай. Папа рымскі Інакенцій XIV не прамінуў даць у гэтым выпадку згоду на хрышчэнне Міндоўга і ўручэнне яму каралеўскай кароны. Паводле Густынскага летапісу, гэта адбылося ў Новагарадку ў 1252 г. (паводле некаторых іншых меркаванняў, у 1253 г.). Праз два гады такая ж самая карона была ўручана ад імя папы рымскага Данілу Галіцкаму.

Становішча Міндоўга крыху палепшылася. Рыга не ваявала з ім, у яго войску з'явіўся нямецкі атрад. Паміж войскамі Міндоўга і Таўцівіла адбыліся дзве бітвы і абедзве безвынікова. У час першай Міндоўг знаходзіўся ў сваёй роднай Варуце, і яго праціўнікі абмежаваліся

рыцарскім турнірам, падчас другой ужо сам Міндоўг абклаў горад Вікінта Твірымець, але, паранены, павярнуў назад. Ворагі Міндоўга добра разумелі, што сіла яго ў Новагародскай зямлі і што без знясілення яе немагчыма перамога над ім. Вось чаму Таўцівіл паслаў нейкага Рэўбу да Данілы Галіцкага з просьбай: «Поиди к Новугородку» [268]. Просьба была выканана з задавальненнем. Даніла сабраў вялікую сілу: з ім былі яго брат Васілька, сын Леў і сват — палавецкі хан Цягак. Па дарозе яны ўзялі з сабой пінскіх князёў. Апошнія, як сведчыць летапіс, пайшлі неахвотна. І гэта зразумела. Паход арганізоўваўся не толькі супраць Новагарадка, але і супраць Літвы, якая служыла заслонай Новагародскай зямлі з паўднёвага ўсходу. А пінскім князям не хацелася варагаваць са сваімі суседзямі, з якімі ў іх даўно ўжо вызначыліся агульныя эканамічныя інтарэсы. Літва аказала супраціўленне: паслаўшы старожу на воз. Зьяце, гналася за галіцка-валынскім войскам да р. Шчары. Даніла вымушаны быў зрабіць суровае ўнушэнне сваім войскам, асабліва тым, якія не хацелі ваяваць. Супраціўленне Літвы было зломлена, і «наутрее же плениша всю землю Новогородьскую, оттуда же возвратишеся в дом свой» [269]. Аднак гэтага было недастаткова. Даніла паслаў свайго брата Васілька і сына Рамана на заходнюю частку Новагародскай зямлі — Гарадзенскае княства (гэты факт і дае падставу лічыць, што яно ўваходзіла ў склад Новагародскай зямлі). Там быў захоплены Гарадзен (Гродна), а пасля таго як Даніла дадаткова «посласте многы своя пешьте и конникы», «плениша всю вотчину их и страны их» [270].

Як бачым, у выніку гэтага паходу была занята левабярэжная Літва і ўся Новагародская зямля. І хоць Міндоўг паслаў свайго сына пад Турыйск, хоць да гэтага часу яму ўдалося падкупіць яцвягаў, справа была прайграна, і ён папрасіў у Данілы міру. Аднак умовы яго, прапанаваныя Міндоўгам, былі, відаць, непрымальныя для Данілы Галіцкага. Мір быў заключаны пасля яшчэ аднаго паходу Данілы «на Литву, на Новогородок» [271].

Чамусьці У. Пашута нічога не гаварыў пра гэты паход, магчыма, таму, што гэтае месца летапісу ясна ўказвае на знаходжанне летапіснай Літвы паміж Пінскай і Новагародскай землямі. А менавіта гэты паход і вырашыў зыход справы і прымусіў Новагарадок заключыць мір на ўмовах, прадыктаваных Данілам Галіцкім. Вось

чаму нельга паказваць заканчэння вайны 1248—1254 гг. як трыумф палітыкі і дыпламатыі Міндоўга, як гэта сцвярджаў У. Пашута, зазначаючы, што за Міндоўгам засталася Чорная Русь»[272]. Пры гэтым не растлумачыў, чаму ён змяніў свой ранейшы погляд, паводле якога гэты мір з'яўляўся перамогай Данілы[273], што больш адпавядае сапраўднасці. У. Пашута яшчэ пісаў: «Заваяваць Літву нікому не ўдалося»[274]. Але Літву і Новагарадок ніхто і не хацеў заваёўваць. Мы бачылі, што галіцка-валынскія князі тры разы займалі Новагародскую зямлю і два разы Літву і кожны раз пасля «возвратишеся в дом свой». Для заваявання і асабліва ўтрымання ў сваіх руках Новагародскай зямлі і Літвы ў іх проста не было сіл: Галіцка-Валынская зямля на той час была занята барацьбой з мангола-татарамі і вайной за аўстрыйскую спадчыну. Вайна 1248—1254 гг. была выклікана заваяваннем Літвы Новагарадком, што прывяло да пашырэння тэрыторыі і ўзмацнення Новагародскай дзяржавы. Таму галіцка-валынскія князі, якія вялі вайну з Новагарадком, мелі на мэце прымусіць яго адмовіцца ад Літвы. Яны гэтага дасягнулі. Міндоўг павінен быў здаволіцца толькі роляй князя Літвы, у той час як Новагарадок узяў сабе другога князя — Войшалка, старэйшага сына Міндоўга.

7

ПАЛІТЫКА ВОЙШАЛКА І ДРУГОЕ ЗАВАЯВАННЕ ЛІТВЫ

Як бачым, першая спроба заваявання Літвы Новгародскай зямлёй закончылася няўдачай. Галоўнымі праціўнікамі гэтага былі: знутры — літоўскія феадалы, а звонку — галіцка-валынскія князі. Гэтыя дзве сілы найбольш паслядоўна змагаліся за раз'яднанне Новагарадка і Літвы і давялі сваю справу да канца.

Аднак, нягледзячы на першую няўдачу і спусташэнне, якое прынеслі тры паходы галіцка-валынскага войска на Новагародскую зямлю, яе феадалы не адмовіліся ад свайго намеру заваяваць Літву. Але яны ўлічылі горкі вопыт першай сваёй спробы, выканаўца якой — Міндоўг — аказаўся дрэнным, няўмелым палітыкам. Яго дзеянні выклікалі міжнародны канфлікт, цэлая кааліцыя дзяржаў выступіла супраць Новагародскай дзяржавы. Асабліва няўдалым палітычным манеўрам Міндоўга быў саюз з Ордэнам. Па-першае, гэта вельмі пашкодзіла балцка-літоўскім землям. Паводле гэтага саюзу, Міндоўг рабіў за кошт іх зямельныя ахвяраванні Ордэну і адмаўляўся ў дапамозе Жамойціі ў час барацьбы яе з немцамі. Рыцары, развязаўшы сабе рукі ўмовай з Міндоўгам, разгарнулі шырокае наступленне супраць Прусіі і Жамойціі. З другога боку, манеўр Міндоўга нічога не даў і Новагарадку — не спыніў галіцка-валынскага наступлення, што і было галоўнай прычынай няўдачы.

Улічваючы праваслаўны фанатызм будучага новагародскага князя Войшалка, можна думаць, што прыняцце Міндоўгам каталіцтва выклікала незадаволенасць новагародцаў і ў шэрагу з іншым з'явілася прычынай пазбаўлення яго княскага пасада ў Новагарадку.

Такім чынам, роля Міндоўга ў гісторыі яўна перабольшваецца. Ён фактычна не быў стваральнікам Вялікага княства Літоўскага, як гэта да апошняга часу тлумачыцца ў літаратуры [275]. Не ён зрабіў сваёй сталіцай Новагарадок [276], а Новагарадок выбраў яго сваім кня-

зем. Не літоўскую ўладу ажыццяўляў тут Міндоўг[277], а быў выканаўцам дзяржаўных імкненняў Новагарадка. Таму, не апраўдаўшы надзей новагародскіх феадалаў, ён і страціў новагародскі пасад.

Праўда, апошнім часам сцвярджаецца, што сталіцай Міндоўга быў не Новагарадок, а Вільня[278]. Аднак гэта супярэчыць пісьмовым крыніцам. Нельга ігнараваць і тапаніміку: у Навагрудку ёсць гара Міндоўга[279] і гай Міндоўга[280]. Вільня ж упершыню як сталіца Вялікага княства Літоўскага ўпамінаецца толькі ў 1323 г.

Мы не ведаем дакладна, калі Міндоўг пакінуў Новагарадок, гэта, відаць, адбылося ў 1254 г., калі быў заключаны мір з галіцка-валынскімі князямі. Але ад імя Новагарадка ў гэтай акцыі ўдзельнічаў не Міндоўг, а Войшалк.

Новагародскім феадалам, як і раней, патрэбны быў князь-ліцвін, які, захапіўшы Літву, мог бы з'явіцца там як наследны гаспадар. І гэта ў будучым спраўдзілася. Па-другое, ён меўся быць такім жа нераборлівым у сродках для дасягнення сваіх мэт, такім жа рашучым і вераломным, як і Міндоўг. Будучыня паказала, што Войшалк у гэтых якасцях не толькі не ўступаў свайму бацьку, але і перасягаў яго. Па-трэцяе, патрэбны быў адначасова тонкі палітык і дыпламат, які б дзейнічаў больш дальнабачна і меў менш ворагаў, чаго не здолеў зрабіць Міндоўг. І тут новагародскія феадалы таксама не памыліліся. Нарэшце, князь гэты павінен быць больш прывязаным да Новагарадка, больш дзейнічаць у яго інтарэсах. Міндоўг жа, як вядома, у асноўным помсціў за свае крыўды, ва ўсіх яго ўчынках бачна імкненне найперш задаволіць асабістыя інтарэсы. Ён больш прыстасоўваўся да адпаведных умоў, чым сам іх ствараў, сведчаннем чаго з'яўляецца яго пераход з язычніцтва ў праваслаўе, з праваслаўя ў каталіцтва, потым зноў у язычніцтва. Войшалк быў поўнай процілегласцю Міндоўга. Назаўсёды звязаўшы свой лёс з Новагарадком, ён быў праваслаўным фанатыкам. Служэнне Новагарадку і праваслаўю — вось тая спружына, якая рухала дзейнасць Войшалка. У гэтых адносінах ён нагадваў Даўмонта, які, нягледзячы на літоўскае паходжанне, верна служыў Пскову і праваслаўю, за што быў абвешчаны пасля смерці святым.

Вось такі чалавек стаў новагародскім князем. У той час яму было 32 гады (паводле Таціщава, ён нарадзіў-

ся ў 1223 г.). Першай буйной дзяржаўна-дыпламатычнай справай Войшалка было заключэнне міру з галіцка-валынскімі князямі. У летапісе сказана: «Потом же Воишелк створи мир с Данилом и выда дщерь миндовгову за Шварна, сестру свою» [281]. Прыйсці да згоды было нялёгкай справай. Ён выступаў ад імя пераможанай і знясіленай краіны. У такім незайздросным становішчы трэба было заключыць выгадны для сябе мір. Войшалк добра разумеў галоўны пралік Міндоўга: захоп Літвы выклікаў варожасць галіцка-валынскіх князёў. Таму яго асноўнай задачай было перацягнуць былых праціўнікаў на свой бок і на пэўны час абапірацца на іх дапамогу. Гарантыяй гэтага стала выданне дачкі Міндоўга за сына Данілы Галіцкага. Сама летапісная формула сведчыць, што ўсё было зроблена супраць волі Міндоўга. Праўда, апошні ў 1252 г. таксама разам з пытаннем пра мір ставіў і пытанне «о сватьстве», але, відаць, на іншых умовах, і таму зараз ужо не Міндоўг выдаваў «свою дщерь», а Войшалк выдаваў «дщерь Миндовгову и свою сестру за Шварна». Аднак замацаванне міру ўступленнем у сваяцтва праз шлюб было звычайнай з'явай, якая ў большасці выпадкаў не гарантавала трываласці пагаднення. Таму Войшалк пайшоў на незвычайны ўчынак. Ён аддаў Новагародскую зямлю разам з Новагарадком, Слонімам, Ваўкавыскам і астатнімі гарадамі сыну Данілы—Раману. Такі дзіўны крок сучаснікі не маглі растлумачыць інакш як імкненнем Войшалка пастрыгчыся ў манахі. У сапраўднасці ж гэта быў вельмі тонкі і дальнабачны палітычны ход. Войшалк канчаткова ўваходзіў у давер да галіцка-валынскіх князёў. У. Пашута сцвярджаў, нібыта па ўмовах міру «Чорная Русь засталася за Літвой» і «што ў ёй правіў Войшалк» [282], не тлумачачы і не аналізуючы таго факта, чаму патрэбна было Міндоўгу аддаваць Войшалку Новагародскую зямлю. Мы ўжо ведаем, што яна ніколі не належала Літве, а ўсё было наадварот. Больш таго, У. Пашута гаварыў, што Міндоўг пакінуў за сабой Новагарадок, а Войшалку аддаў усе астатнія гарады Новагародскай зямлі, таму Войшалк перадаў Раману Новагарадок ад імя Міндоўга, а Ваўкавыск, Слонім і іншыя гарады—ад сябе. Гэта як быццам пацвярджаецца словамі летапісу: «...вдасть... Новогородок от Миндовга и от себе и Вослоним и Волковыеск и все городы». Але гэты тэкст летапісу дае падставы для розначытанняў у залежнасці ад таго, куды ад-

несці словы «и от себе» — да Новагарадка ці да астатніх гарадоў. Затое летапісны запіс пад 1257 г. ясна гаворыць, што Войшалк ад сябе, а не ад Міндоўга перадаў Раману Новагарадок: «Войшелк бе дал Новогородок Романови» [283]. Як бачым, тут летапіс не згадвае Міндоўга. Чаму ж ён фігуруе ў папярэднім тэксце? Войшалк мог прадбачыць, што ў яго адсутнасць Міндоўг мог прэтэндаваць на Новагарадок і ўсю зямлю і пры зручным выпадку вярнуцца туды. Забягаючы крыху наперад, скажам, што пільнасць Войшалка не была лішняй. Хто-хто, а ён ведаў свайго бацьку. Сапраўды апошні, выхваляючыся, неўзабаве паабяцаў Данілу Галіцкаму, падбіваючы яго ісці на татараў (ён не мог ім дараваць нападу Бурундая на яго зямлю ў 1258 г.): «Пришлю к тобе Романа с новогородце» [284]. Відаць, ён і хацеў, карыстаючыся адсутнасцю Рамана з войскам і занятасцю галіцка-валынскіх князёў барацьбой з татарамі, нейкім чынам вярнуцца ў Новагарадок. Звычайна даследчыкі ўказваюць на прыведзеныя вышэй словы Міндоўга як на сведчанне залежнасці ад яго Новагарадка і пры Рамане. Але яны не ўлічваюць, што новагародцы аказаліся непаслухмянымі, і Міндоўгу прыйшлося пасылаць сваё войска, у той час як Раман прывёў «мало людий» [285].

Вось чаму Войшалк прымусіў Міндоўга пацвердзіць і ад сябе перадачу Новагародскай зямлі. Адсюль упамінанне Міндоўга пра перадачу земляў Раману гаворыць не аб прыналежнасці яму гэтай тэрыторыі, а пра канчатковае і прымусовае адрачэнне ад яе, у той час як Войшалк аддаваў яе, як убачым, толькі да часу.

Тое, што Войшалк без хістанняў аддаваў Новагародскую зямлю галіцка-валынскім князям, сведчыць пра яго дальнабачнасць. Ён добра разумеў, што Новагародская зямля з'яўляецца для галіцка-валынскіх князёў адным з самых прывабных кавалкаў, валоданне якім адчыняе ім дарогу да літоўскіх і полацкіх земляў. Ён таксама бачыў тыя ўнутраныя і знешнія супярэчнасці, у якія пападала Галіцка-Валынская зямля, і таму прадбачыў яе неміну чае аслабленне, у выніку якога яна не толькі не зможа ўтрымаць за сабой Новагародскую зямлю, але і сама стане аб'ектам захопу суседзяў. Вось чаму Войшалк пайшоў на такую смелую палітычную камбінацыю, як перадача Новагародскай зямлі галіцкаму князю. Апроч таго, гэта забяспечвала яго Новагародчыне мірнае жыццё на пэўны час.

Варта ўвагі і тое, што Войшалк перадаў Новагародскую зямлю не Шварну, а Раману. Шварн, жанаты з сястрой Войшалка, меў бы ў выпадку перадачы яму Новагародскай зямлі законныя правы на яе. Іншая справа з Раманам. Няўдалы прэтэндэнт на аўстрыйскую карону, ён мог быць задаволены становішчам новагародскага князя і не прад'яўляць ніякіх прэтэнзій на Новагародскую зямлю як законную яго спадчыну. Распальванне супярэчнасцей паміж сынамі Данілы Галіцкага ў іх дамаганнях на Новагародскую зямлю, як мы пабачым далей, стане пастаянным элементам палітыкі Войшалка і з'явіцца нават прычынай яго смерці.

Аддаўшы Новагародскую зямлю пад надзейную ахову галіцка-валынскіх князёў, Войшалк пакінуў яе. Куды ён пайшоў і з якой мэтай? Летапіс так пра гэта гаворыць: «Иде Войшалк до Галича к Данилови князю и Василькови, хотя прияти мниски чин»[286]. Прыкінуўшыся богабаязным манахам, Войшалк, аднак, настойліва ствараў умовы для дасягнення сваіх палітычных мэт. Ён бачыў яшчэ адну перашкоду ў аб'яднанні Новагародскай зямлі з суседняй Літвой, а менавіта язычніцкае насельніцтва апошняй. Дарэчы, зазначым, што ў Іпацьеўскім летапісе пад 1262 г. сказана, што Войшалк стаў княжыць у Новагарадку, будучы язычнікам, і вызначаўся таму выключнай жорсткасцю. І толькі пасля, прыняўшы хрысціянскую веру, стаў іншым чалавекам. Аднак гэтае месца— пазнейшая ўстаўка ў летапіс. Густынскі летапіс пад 1246 г. і іншыя запісы Іпацьеўскага летапісу яскрава сведчаць, што Войшалк перайшоў у хрысціянства да таго, як стаў князем у Новагарадку. Сваё знаходжанне ў Галіцкай зямлі Войшалк выкарыстаў для падрыхтоўкі хрышчэння Літвы, для чаго патрэбны былі значныя рэлігійныя сілы. Іх, відаць, не хапала ў самога Новагарадка, на землях якога не было тады яшчэ ніводнага манастыра. Таму Войшалк тры гады знаходзіўся ў Палонінскім манастыры, дзе збіраў манахаў для заснавання манастыра ў Новагародскай зямлі. Мала таго, ён пайшоў у Грэцыю, у Афонскі манастыр, зноў жа, відаць, з мэтай прывесці і адтуль манахаў. Аднак з прычыны вайсковых перашкод Войшалк вымушаны быў, дайшоўшы да Балгарыі, вярнуцца з дарогі. Ён цалкам увайшоў у давер да галіцка-валынскіх князёў. Выказвалася меркаванне, што Войшалк знаходзіўся ў Галіцкай зямлі ў якасці заложніка, што гэтым самым гарантавала бяспеку Рамана ў

Новагарадку. Такая магчымасць не выключана. Але як бы там ні было, галіцкія князі паверылі ў яго намер аддацца выключна манаскаму жыццю, сведчаннем чаго былі манахі, якіх ён браў з сабою, і адпусцілі яго. Гэта была вялікая дыпламатычная перамога Войшалка. Яму толькі тое і патрэбна было. Летапіс не ўказвае дакладнай даты вяртання Войшалка ў Новагародскую зямлю. Апісанне ўсяго яго жыцця дадзена пад 1262 г. Аднак, беручы пад увагу, што Войшалк пакінуў Новгарадок у 1254 г., прабыў у Палонінскім манастыры тры гады, ды яго падарожжа цягнулася не менш за паўгода, можна лічыць, што Войшалк вярнуўся дадому не пазней як на пачатку 1258 г. Пасля вяртання ён не раскрыў адразу сваіх палітычных намераў. Ён працягваў насіць маску богабаязнага манаха і заснаваў манастыр. Тое, што гэты манастыр знаходзіўся паміж Новагарадком і Літвой, сведчыць пра яго галоўнае прызначэнне — стаць у далейшым асяродкам хрышчэння апошняй.

Заснаваўшы манастыр і дзеля прыліку пасяліўшыся ў ім, Войшалк перайшоў да ажыццяўлення галоўнай мэты вызвалення ад галіцка-валынскай залежнасці. Але, каб зрабіць гэта, трэба было знайсці іншага саюзніка. Тут Войшалк звярнуў увагу на Полацк, дзе ў той час княжыў Таўцівіл.

Калі і як з'явіўся ён у Полацку? Адны лічаць, што Таўцівіл быў залежным ад Міндоўга і дзякуючы яму стаў княжыць у Полацку [287]. Другія сцвярджаюць, што Таўцівіл пашырыў сваю ўладу на Полацк у той час, калі пасля прыбыцця ў Рыгу яму абяцалі дапамагаць «божии дворяне и бискуп и вся воя рижская» [288]. Аднак ніводнай з гэтых спрэчных думак нельга даць веры. Таўцівіл ніколі не мірыўся з Міндоўгам, ніколі не залежаў ад яго і ні з яго дапамогай, ні з дапамогай рыжан не пашыраў сваёй улады на Полацк. Верагодней за ўсё, што Таўцівіл (як і Едзівід) быў князем у правабярэжнай Літве, шчыльна звязанай з Полацкай зямлёй. Вось чаму ён больш за ўсё і быў незадаволены ўладай Міндоўга і адыграў у далейшым вядучую ролю ў перамозе над ім і выгнанні яго з Літвы. Не дзіўна, што Міндоўг, стаўшы новагародскім князем, вырашыў перш за ўсё з ім расправіцца. Таўцівіл, як вядома, у сваёй барацьбе з Міндоўгам уступіў у саюз з галіцка-валынскімі князямі. Але тыя, дасягнуўшы сваёй мэты — раз'яднання Новагарадка і Літвы, страцілі ўсялякую цікавасць да Таўцівіла і не

падумалі дапамагчы яму ўсталяваць ў Літве. Ды ў летапісе ж і сказана, што Даніла на Таўцівіла «гнев имеющу» [289]. Таму зразумела, што ён, затаіўшы гнеў на свайго былога саюзніка, вымушаны быў шукаць сабе іншых гаспадароў. І знайшоў іх у асобе полацкіх феадалаў. Яны не маглі не бачыць, што Літва дажывае апошнія дні свайго палітычнага існавання. Толькі было няясна, каму дастанецца яна. Правабярэжная Літва ўжо даўно была ў залежнасці ад Полацка, адкуль ён чэрпаў матэрыяльныя сродкі і вайсковую сілу. Але адкырта далучыць яе да сябе Полацк не рашаўся. На Літву, апроч яго, было яшчэ некалькі прэтэндэнтаў: Новагарадок, Валынь, Жамойція. Таму захоп яе мог выклікаць вялікія ўскладненні: прыклад Новагарадка быў яшчэ свежы ў памяці. Заставалася чакаць зручнага моманту. А пакуль, каб умацаваць свае пазіцыі ў гэтым складаным саперніцтве, Полацк вырашыў па прыкладу Новагарадка прыдбаць законнага спадкаемца Літвы. У гэтым галоўная прычына з'яўлення Таўцівіла на полацкім пасадзе. Немалое значэнне ў выбранні яго полацкім князем было і тое, што Таўцівіл меў пэўны ўплыў у Літве, пра што сведчыць і летапіс: «Литовьская земля в руку бе их» [290]. А полацкім феадалам асабліва патрэбна была ў гэты час немалая вайсковая сіла, і, беручы да сябе Таўцівіла, яны разлічвалі на яго ўплыў у Літве, у чым і не памыліліся. У паходзе 1258 г. на Смаленск удзельнічалі аб'яднаныя сілы Полацка і Літвы. Абранне Таўцівіла полацкім князем пацвердзіла і тое, што ён быў з правабярэжнай Літвы і меў цесныя сувязі з Полацкам і, магчыма, сваяцтва з яго князямі.

Войшалк быў упэўнены, што атрымае дапамогу ад Таўцівіла, бо той быў зацікаўлены ў аслабленні Галіцка-Валынскай зямлі, чаму садзейнічала вызваленне з-пад яе залежнасці Новагарадка. Акрамя гэтага, Войшалк ведаў, што ён лёгка дамовіцца з Таўцівілам і таму, што той захаваў гнеў да галіцка-валынскіх князёў. Дзякуючы Таўцівілу і праз вераломства Войшалк схапіў Рамана Данілавіча (і, магчыма, забіў яго), стаўшы такім чынам паўнапраўным гаспадаром Новагародскай зямлі. Адбылося гэта ў 1258 г., незадоўга да паходу Бурундая і Васілька на Літву. Апошні ў час гэтага паходу шукаў Рамана па гарачых слядах.

Толькі зараз галіцка-валынскія князі ўбачылі далёкасяжныя планы Войшалка і зразумелі, якую яны зрабілі

памылку, адпусціўшы яго. Вядома, дзеянні Войшалка яны не пакінулі без пакарання. Даніла Галіцкі пайшоў на Новагародскую зямлю, захапіў Ваўкавыск, марна шукаў ворагаў сваіх — Войшалка і Таўцівіла. Пасля паслаў атрад на Зэльву, а сына Льва — на Гарадзен. Аднак галіцка-валынскія князі не мелі сіл, каб справіцца з Войшалкам і вярнуць сабе Новагародскую зямлю. Яны ўсё больш падпадалі пад уладу мангола-татараў, якія ў гэтым самым 1258 г. прымусілі іх удзельнічаць у паходзе на Літву, куды і пайшоў Васілька. Цікава, што Бурундай, ідучы на Літву і разграміўшы яе, пакінуў у спакоі Новагродскую зямлю. У гэтым таксама нельга не бачыць дыпламатычнага поспеху Войшалка, які, відаць, звярнуў увагу Бурундая на тое, што новагародцы, па сутнасці, сарвалі паход Данілы Галіцкага на Кіеў праз Вязвягль, накіраваны супраць татараў [291].

На гэты час прыпадае пачатак адкрытай варожасці паміж Войшалкам і Міндоўгам. Летапіс адзначае, што, пасля таго як Войшалк стаў жыць у заснаваным ім манастыры, «отец же его Миндовг укоревашеться ему по его житью, он же на отца своего не любовашеть вельми» [292]. У. Пашута тлумачыў гэту варожасць тым, што Войшалк прыняў хрысціянства. Але, па-першае, Войшалк быў хрысціянінам, прынамсі, ужо з 1246 г., а летапіс гаворыць пра псаванне адносін паміж імі пасля заснавання Войшалкам манастыра, г. зн. пасля 1258 г. Па-другое, трэба ўлічваць, што варожасць была ўзаемная. Вядома, яе карані не ў рэлігійных разыходжаннях. Яе прычынай было нарастанне варожасці паміж Новагарадком і Літвой. Міндоўг не мог не бачыць, што манастыр, заснаваны Войшалкам на мяжы з Літвой, прызначаўся для яе хрышчэння, якое магло ажыццявіцца толькі пасля яе захопу.

З другога боку, тонкі палітык, Войшалк не мог не бачыць нетрывалага становішча Міндоўга, хоць знешне здавалася, што Міндоўг дасягнуў сваёй мэты—аб'яднання ўсіх балцка-літоўскіх земляў. Сапраўды, пасля перамогі Літвы ля воз. Дурбе ў 1260 г. Жамойція ўзнялася на барацьбу з Ордэнам, звярнуўшыся да Міндоўга па дапамогу, пры гэтым згаджаючыся прызнаць яго ўладу. Зазначым, што Міндоўг заўсёды станавіўся зброяй тых, хто яму прапаноўваў уладу: яшчэ у 1246 г. ён прыняў запрашэнне новагародцаў стаць у іх князем, а ў 1251 г. ён, апынуўшыся ў крытычным становішчы, пры-

няў каралеўскую карону і ўступіў у саюз з Ордэнам, які выкарыстаў гэта ў барацьбе з Жамойціяй. Цяпер Міндоўг таксама не адмовіўся ад прапановы жамойцкага князя Траняты прыняць уладу над Жамойціяй. Ён парывае з Ордэнам, адракаецца ад хрысціянства і зноў пераходзіць у язычніцтва. Пад яго ўладай апынуліся ўсе балцка-літоўскія землі. Вось гэты час і меў на ўвазе летапісец, гаворачы пра Міндоўга: «...И нача княжити один во всей земле Литовской и нача гордети вельми и вознеся гордостью и славою великою и не творящу противо себя никакого же» [293]. Гэтыя словы прыводзяцца заўсёды даследчыкамі як сведчанні вялікай дзяржаўнай сілы Міндоўга. Аднак гісторыя на гэтым не спынілася, і яе далейшы ход паказаў зусім адваротнае. Тут будзе дарэчы нагадаць словы Л. Любаўскага, што ў літоўскіх землях «абазначыўся ўжо сацыяльны падзел грамадства, з'явіліся зародкі дзяржаўнай улады, але ўсё гэта было пакуль простым фактам, не набыло цвёрдага юрыдычнага характару і таму было хісткім і зменлівым» [294]. Далейшыя падзеі яскрава пацвердзілі гэта. Сапраўды, Міндоўг стаў ахвярай палітычнай камбінацыі Траняты, якому была патрэбна не столькі ўлада Міндоўга, колькі дапамога Літвы ў барацьбе з Ордэнам. І калі гэта барацьба скончылася перамогай Жамойціі, адразу ж пачалося саперніцтва феадалаў Жамойціі і Літвы, знешняй праявай чаго была ўзаемная варожасць паміж Транятам і Міндоўгам.

Транята зрабіў усё, каб аслабіць Міндоўга. Так, ён падбіў апошняга на паход зімой 1261—1262 гг. у Лівонію, абяцаючы, быццам на дапамогу яму прыйдуць рускія, а лівы і латышы паўстануць супраць немцаў. Аднак нічога гэтага не адбылося. Міндоўг вымушаны быў ні з чым вярнуцца з Лівоніі [295]. Здрада Траняты была відавочнай, і Міндоўг павінен быў выслухаць дакоры нават сваёй жонкі за тое, што ён «дарэмна слухае такую малпу, як Транята», які прадае яго, што ён дарэмна адрокся ад каталіцтва і парваў сувязі з Ордэнам. Міндоўг мусіў прызнаць, што паступіў неразумна, але вяртацца назад не можа [296].

Сапраўды, саюз з Ордэнам і быў галоўнай сілай, якая трымала Міндоўга, бо ён не меў цвёрдай унутранай апоры нават у сваёй Літве. Таму, парваўшы з Ордэнам, ён убачыў хісткасць свайго становішча і міжволі павінен быў, як ён сам сказаў, следаваць указанням Траня-

ты і жмудзінаў [297], якія не маглі дараваць яму саюз з Ордэнам і не хацелі мірыцца з яго ўладай. У асяроддзі жамойцкіх феадалаў узнікла змова з мэтай забіць Міндоўга. На бок Траняты перайшоў і нальшчанскі князь Даўмонт, у якога Міндоўг забраў жонку. Без саюза з Нальшчанамі, якія знаходзіліся паміж Жамойціяй і Літвой, Транята, вядома, і не мог марыць пра авалоданне Літвой. Нальшчаны, як адзначала адна нямецкая хроніка, былі спрэчнай тэрыторыяй паміж Жамойціяй і Літвой [298] (гэта сведчанне, дарэчы, можа ўказваць на тое, што Аўкштайція выступала пад назвай Жамойціі). Таму, згаварыўшыся з нальшчанскім князем Даўмонтам, Транята атрымаў вялікую перавагу над Міндоўгам.

Міндоўг бачыў усё гэта і вырашыў у барацьбе з жамойцкімі і нальшчанскімі феадаламі выкарыстаць такі ж прыём, што і ў 1248 г. у барацьбе з Таўцівілам, Едзівідам і Вікінтам. Ён паслаў многіх з іх, у тым ліку і Даўмонта, ваяваць за Дняпро, пад Бранск [299], мяркуючы расправіцца са сваімі ворагамі. Аднак змоўшчыкі перахітрылі яго. Даўмонт вярнуўся з дарогі назад, дагнаў Міндоўга, забіў яго і двух ягоных сыноў. Забойства Міндоўга азначала крах справы аб'яднання усіх балцка-літоўскіх земляў вакол летапіснай Літвы.

Стаўшы князем «во всей земле Литовской и Жемоти» [300], Транята не мог адчуваць сябе ў бяспецы, ведаючы, што ў Полацку і Новагарадку сядзяць такія ж самыя, як і ён, законныя спадкаемцы Літвы. Таму ён вырашыў расправіцца паасобку з Таўцівілам і Войшалкам. Першага ён выклікаў да сябе пад выглядам запрашэння дзяліць «землю і добыток Миндовгов» [301]. Намер быў просты: забіць Таўцівіла, захапіць полацкіх баяраў, якія прыехалі з ім, і, карыстаючыся гэтым, навязаць Полацку сваю волю і князя. Усім балцка-літоўскім землям, аб'яднаным пад уладай аднаго князя, гэта было зараз пад сілу.

Таўцівіл паехаў да Траняты з такім самым контрнамерам: забіць Траняту, завалодаць яго княскім пасадам і далучыць Літву да Полацка. План гэты быў, бясспрэчна, прадыктаваны Таўцівілу полацкімі феадаламі. Дзеля гэтага яны ўзялі яго да сябе. Не дзіўна, што Таўцівіла суправаджала цэлая світа полацкіх баяраў, каб трымаць яго пад сваім кантролем і дапамагчы ў ажыццяўленні забойства Траняты. Аднак гэтаму плану не суджана было збыцца: Транята апярэдзіў. Намер Таў-

цівіла выдаў полацкі баярын Пракоп. Ён, мабыць, належаў да партыі тых полацкіх бояраў, якая змагалася за саюз са Смаленскам. Таўцівіл быў забіты, а полацкія баяры захоплены. Рабілася спроба захапіць і забіць сына Таўцівіла, які знаходзіўся ў Полацку, але палачане дапамаглі яму ўцячы ў Ноўгарад. Гэты факт пацвярджае меркаванне, што Таўцівіл у свой час не быў пастаўлены ў Полацку Міндоўгам, як сцвярджаюць некаторыя гісторыкі, а быў добраахвотна выбраны полацкім вечам, якое лічыла яго законным князем, і таму палачане не выдалі яго сына.

Палачане, апынуўшыся ў складаным становішчы, павінны былі пайсці на часовую ўступку Траняту і прыняць ад яго князя. Наўгародскі І летапіс, адзіная крыніца, якая паведамляе пра гэта, не называе імя стаўленіка Траняты ў Полацку. Выказвалася меркаванне, што гэтым князем быў Гердзень [302], сын полацкага князя Давыда Расціславіча [303]. Значыць, Транята фактычна пасадзіў у Полацку не літоўскага князя, а полацкага князя з Нальшчанаў. Гэта магло б быць яшчэ адным сведчаннем на карысць таго, што палачане нават у цяжкі момант сваёй гісторыі не бралі да сябе князёў іншых дынастый. Аднак катэгарычна сцвярджаць, што гэтым князем быў Гердзень, нельга, бо ў крыніцы аб гэтым сказана вельмі цьмяна.

Забойства Таўцівіла вывела Полацк з далейшай барацьбы за літоўскую спадчыну. Цяпер была чарга Войшалка. Але той аказаўся больш хітрым і дальнабачным, каб за нішто ісці ў рукі Траняты. Прачуўшы аб забойстве Міндоўга, «Войшелк убоявся того же и бежа до Пинська и ту живяшеть» [304]. Гэтыя словы летапісу сведчаць, што Войшалк разгадаў намер Траняты. Але не адзін толькі страх і не ён перш за ўсё гоніць Войшалка ў Пінск, што і паказалі будучыя падзеі. Перацягнуўшы на бок Новагарадка пінянаў, якія ўжо даўно адчувалі на сабе цяжар залежнасці ад галіцка-валынскіх князёў, Войшалк уважліва сачыў за падзеямі ў Літве, не спяшаючыся з адкрытым умяшаннем у яе справы. Ён добра разумеў, што феадалы Літвы не будуць мірыцца з жамойцкім панаваннем, і, можна думаць, раздзімаў гэтыя супярэчнасці, што і дало свае вынікі. Транята быў забіты конюхамі-парабкамі Міндоўга [305]. Смерць Траняты азначала крах намераў жамойцкіх феадалаў аб'яднаць усе балцка-літоўскія землі вакол Жамойціі.

Наўрад ці можна пагадзіцца з думкай, што падзеі пасля смерці Міндоўга «зноў пацвердзілі ўнутраную цвёрдасць Літоўскай дзяржавы»[306]. Наадварот, падзеі да і пасля смерці Міндоўга пацвердзілі ўнутраную слабасць Літвы. Галоўнай прычынай гэтай слабасці быў непераадольны антаганізм паміж Літвой і Жамойціяй. Менавіта ў кароткі перыяд 1260—1263 гг. канчаткова паказала сваю нежыццяздольнасць ідэя аб'яднання балцка-літоўскіх земляў як вакол Літвы, так і вакол Жамойціі.

Войшалк быў адным з тых людзей, якія разумелі ўсю марнасць асобнага ад славянскіх земляў аб'яднання балцка-літоўскіх земляў і таму назаўсёды звязаў свой лёс з Новагарадком. Паміж Жамойціяй і Літвой не было і не магло быць трывалых эканамічных сувязей. Апроч таго, летапісная Літва, акружаная амаль з усіх бакоў славянскімі землямі і ўсеяная славянскімі калоніямі, вядома, не магла быць прыцягальнай для Жамойціі з яе кампактнай тэрыторыяй і аднародным язычніцкім насельніцтвам. Феадалы Літвы і Жамойціі не мелі дастатковых сіл, каб узяць верх адных над другімі. Усё гэта не пацвярджае меркавання, што Літва ў выніку ўсталявання ў ёй манархічнай улады Міндоўга мацнела. Наадварот, як мы бачылі, манархічная ўлада Міндоўга выклікала яшчэ большы антаганізм паміж Літвой і Жамойціяй. Дзеля аб'яднання іх і іншых балцка-літоўскіх земляў патрэбны быў іншы цэнтр, якім і стаў Новагарадок.

З Новагарадка і прыйшла сіла, якая пачала аб'ядноўваць у адзінае цэлае Новагародскую, Пінскую, Літоўскую, Полацкую землі. Войшалк, даведаўшыся, што Транята забіты, а Літва і Жамойція ў стане разгубленасці і безначалля, вырашыў, што прыйшла пара дзейнічаць. Гэтага ён толькі і чакаў. Ён распачаў непасрэдную рэалізацыю той мэты, якую не ўдалося здзейсніць Міндоўгу, калі той быў новагародскім князем,— поўную і канчатковую заваёву Літвы. У. Пашута, грунтуючыся на паказаннях Наўгародскага I летапісу, сцвярджаў, што апорай Войшалка былі «вои отца и приятели»[307]. Аднак галіцка-валынскі летапісец, які, бясспрэчна, лепш ведаў сапраўднае становішча ў суседніх землях, сведчыў пра іншае: «Воишелк поиде с Пиняны к Новогороду и оттоле поя со собою Новогородце и поиде в Литву княжить»[308]. Вядома ж, ні ў Пінску, ні ў Новагарадку вояў Міндоўга

не было. Войшалк у заваяванні Літвы абапіраўся толькі на сілы Новагарадка і саюзнага з ім Пінска. Паказальна, што У. Пашута ў сваёй кнізе не прывёў гэтага летапіснага сведчання. Тое ж самае мы бачым і ў сучаснага даследчыка Э. Гудавічуса, які, робячы мантаж з летапісных звестак 1263—1265 гг., не ўключыў у яго ўпомненага паведамлення [309]. У дадзеным выпадку важна ўжо не тое, што паказваецца, а тое, што замоўчваецца. Замоўчваецца ж галоўнае: Войшалк заваёўваў Літву і іншыя балцкія землі з Новагарадка сіламі пінянаў і новагародцаў. Такім чынам, тое, што было крыху зацемнена ў дачыненні заваёвы Міндоўгам Літвы з Новагарадка, тут, у дачыненні Войшалка, ужо выступае адкрытым тэкстам. Як сведчыць далей летапіс, «Литва же вся прияше и с радостью своего господитича» [310], г. зн. прыхільна сустрэла Войшалка, як свайго законнага гаспадара. На гэта і разлічвалі новагародскія феадалы, калі бралі Войшалка сваім князем. Але, відаць, прыязна ставіліся да Войшалка толькі ў «Літве Міндоўга», тым часам як астатняя Літва аказала супраціўленне Войшалку. У летапісе пад 1264 г. чытаем: «Воишелк же нача княжити во всей земле Литовской и поча вороги свои убивати, изби их бесчисленное множество, а друзии разбегошося камо кто видя» [311]. Характэрна, што і гэта месца апусціў Э. Гудавічус, а Пашута далучыў яго да заваявання Войшалкам Нальшчанаў і Дзяволтвы. Усё гэта сведчыць пра тое, што Войшалку супраціўляліся літоўскія феадалы, што яны былі галоўнымі ворагамі ўтварэння Вялікага княства Літоўскага і што Войшалк, будучы правадніком палітыкі новагародскіх феадалаў, жорстка расправіўся з літоўскімі феадаламі, большасць якіх была знішчана, а частка разбеглася.

Але моцы Новагарадка і Пінска хапіла Войшалку толькі для заваявання Літвы. Бачачы гэта, ён зноў пайшоў на саюз з галіцка-валынскімі князямі. Магчыма, ён бярог уласныя сілы і хацеў грэбці жар чужымі рукамі. Войшалку нялёгка было зноў увайсці ў давер да галіцка-валынскіх князёў, і ён сыграў на іх слабай струнцы — на іх імкненні валодаць Новагародскай зямлёй і Літвой.

Войшалк прызнаў іх вярхоўную ўладу над сабой: «Нарекл бо бяшеть Василка отца себе и господина» [312]. Галіцка-валынскія князі пасля гэтага згадзіліся дапамагчы Войшалку ў заваяванні іншых балцка-літоўскіх

земляў. Няма чаго казаць, што яны дзейнічалі недальнабачна, трацячы свае сілы на заваяванне таго, што ім не магло належаць. Галіцка-Валынская зямля і без таго была аслаблена залежнасцю ад татараў, пасля смерці Данілы Галіцкага ўжо абазначыўся яе распад. Вось чаму так смела пайшоў Войшалк на знешняе падначаленне яе князям.

Атрымаўшы дапамогу Шварна і Васількa, Войшалк не менш жорстка расправіўся з феадаламі Дзяволтвы і Нальшчанаў і, далучыўшы гэтыя вобласці да сваіх уладанняў, вярнуўся «во свояси» [313], г. зн. у Новагарадок. Такім чынам, утварэнне Вялікага княства Літоўскага суправаджалася амаль пагалоўным вынішчэннем феадалаў балцка-літоўскіх земляў. Усё гэта лішні раз пярэчыць тым сцверджанням, што ўтварэнне гэтай дзяржавы вызначалася інтарэсамі літоўскіх феадалаў.

Нельга пагадзіцца і з тым, што «Войшалк не рабіў замаху на язычніцтва ў Літве» [314]. Галоўнай мэтай пасля заваявання Літвы Войшалк лічыў хрышчэнне яе. Для таго і быў заснаваны ім Лаўрышаўскі манастыр. Але, відаць, магчымасцей гэтага апошняга дзеля хрышчэння Літвы было недастаткова. Таму Войшалк у 1265 г. увайшоў у зносіны з пскоўскім князем, які абяцаў яму прыслаць светароў з Пскова, бо яны больш за іншых знаёмыя з мовай і звычаямі Літвы [315]. Войшалк, вядома, не атрымаў іх, бо ў 1266 г. пскоўскім князем стаў Даўмонт, былы нальшчанскі князь, які ўцёк у Пскоў, ратуючыся ад Войшалка. Вось чаму хрышчэнне Літвы ці, магчыма, нейкай часткі яе зацягнулася да 1405 г., калі толькі верыць Т. Нарбуту, звесткі якога не заўсёды вызначаюцца праўдзівасцю.

Захоп Новагарадком Літвы, Нальшчанаў і Дзяволтвы быў адначасова і ўдарам па Полацку, які пасля страты Ніжняга Падзвіння страціў і сваю апору ў гэтых землях. Каб карыстацца і ў далейшым матэрыяльнымі рэсурсамі і вайсковай сілай літоўска-балцкіх земляў, Полацк павінен быў прызнаць «волю» Новагарадка. У гэтым і заключаўся стратэгічны план Войшалка. Падначаленне Полацка Новагарадку, відаць, адбылося ў 1265 г. Грамата полацкага князя Гердзеня, напісаная 22 снежня 1264 г. [316], не гаворыць пра залежнасць Полацка і Віцебска ад Войшалка. Затое грамата полацкага князя Ізяслава, напісаная крыху пазней, ужо сведчыць пра гэта [317].

Летапісныя крыніцы нічога не гавораць пра тое, ці заваяваў Войшалк Жамойцію. Магчыма, каб ажыццявіць гэту мэту, дзеля чаго патрэбна была новая дапамога галіцка-валынскіх князёў, ён аддаў сваё княства Шварну, а сам зноў пайшоў у Галіцкую зямлю. Цікава падкрэсліць, што ў 1254 г. Войшалк не пажадаў аддаць княства яму, бо асцерагаўся, што, жанаты з яго сястрой, той будзе мець законныя правы на яго ўладанне. Зараз жа ён не баяўся гэтага, бо Шварн не меў дзяцей, значыць, у выпадку яго смерці княства не пераходзіла ў спадчыну яго нашчадкам. Перадача гэта не спадабалася брату Шварна — галіцкаму князю Льву Данілавічу, які хацеў сам валодаць Новагародскай і Літоўскай землямі, злучанымі зараз у адзінае цэлае. Вось чаму гэты князь і забіў Войшалка, «завистью оже бяшеть дал землю Литовськую брату его Шварнови» [318]. Аднак, паводле іншых крыніц, што, магчыма, болей праўдзіва, Шварн памёр раней за Войшалка, і апошні зноў вярнуўся ў сваё княства. Пасля ён прыехаў на перагаворы са Львом Данілавічам, які лічыў Літоўскае княства сваёй спадчынай пасля смерці брата Шварна. Войшалк не згадзіўся на прэтэнзіі Льва і быў забіты за гэта [319]. Але запозненая помста Льва не дала ніякіх вынікаў для яго. Вялікім князем літоўскім стаў Трайдзень, які працягваў палітыку Войшалка. Аднак далейшы разгляд гісторыі Вялікага княства Літоўскага не ўваходзіць у задачу гэтага даследавання.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Аб'яднанне Войшалкам Новагародскай, Пінскай, Літоўскай, Нальшчанскай, Дзевалтоўскай і Полацка-Віцебскай земляў у адзіную дзяржаву было фактычна трывалым пачаткам утварэння Вялікага княства Літоўскага. У гэтым і заключалася важнейшая гістарычная заслуга Войшалка. Але калі далучэнне балцкіх земляў Літвы, Нальшчанаў і Дзяволтвы да Новагарадка было гвалтоўным, то далучэнне Пінска, Полацка і Віцебска праходзіла добраахвотна. Гэтак сама пазней да Вялікага княства Літоўскага далучаліся і іншыя беларускія вобласці. Такое аб'яднанне было вынікам гістарычнага працэсу эканамічнага, палітычнага і культурнага збліжэння беларускіх земляў у басейнах рэк Дзвіны, Дняпра, Нёмана, на аснове чаго ішло фарміраванне тэрыторыі Беларусі. Вырашальную аб'яднаўчую ролю ў складванні і пачатковай гісторыі Вялікага княства Літоўскага меў найперш Новагарадок. Нездарма ж і герб гэтага горада — коннік з мячом у руцэ—стаў дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўскага [320]. Важнае значэнне Новагарадка ва ўтварэнні Вялікага княства Літоўскага і ў пашырэнні тэрыторыі гэтай дзяржавы паказаў і М. М. Улашчык [321]. І хаця пазней, у пачатку XIV ст., Новагарадок страціў сваё цэнтральнае значэнне, аднак яшчэ доўга жыла памяць аб ім як сталіцы. Вось чаму ў летапісах XVI ст. яшчэ гаворыцца аб «Новогородской державе, над Неманом лежачее» [322], якая прасціралася «ад Вилни аж до жродел Неменовых, где ся за Копылем пять миль починается» [323].

Складванне гэтай «Новагародскай дзяржавы» было паскорана і знешнімі палітычнымі прычынамі — пагрозай з боку крыжакоў і татараў. Ф. Энгельс адзначыў, што ўкраінскія і беларускія землі «знайшлі сабе абарону ад азіяцкага нашэсця, далучыўшыся да так званага Літоўскага княства» [324]. Як бачым, Ф. Энгельс гэту

дзяржаву лічыў Літоўскай толькі па назве, што і адпавядае сапраўднасці. Уласна літоўскія (у сучасным значэнні гэтага слова) землі ў гэтай дзяржаве займалі толькі дзесятую частку яе тэрыторыі, і з прычыны гэтага яны, вядома, не маглі мець у ёй дамінуючага значэння. Звычайна ў старой гістарыяграфіі факт пашырэння ў Вялікім княстве Літоўскім славянскай мовы, культуры тлумачыўся тым, што, маўляў, літоўскія князі заваявалі славянскую тэрыторыю, і таму, каб кіраваць такой вялізнай тэрыторыяй, павінны былі прыняць славянскую мову і культуру як пануючыя ў дзяржаве. Як мы бачылі, ніякага літоўскага заваявання нават у самым пачатку гісторыі Вялікага княства Літоўскага не было. Ф. Энгельс адкінуў такое яўна валюнтарысцкае тлумачэнне ўтварэння Вялікага княства Літоўскага, адзначыўшы, што ў гэтай дзяржаве «ва ўладанні саміх *літоўцаў*» былі толькі «паўночныя землі Прыбалтыкі»[325], г. зн. уласна літоўскія землі, а не ўсе землі дзяржавы. К. Маркс таксама разглядаў Вялікае княства Літоўскае як славянскую, «рускую» дзяржаву. Ён пісаў у сваёй працы «Сценька Разін»: «Русь тады была падзелена на дзве дзяржавы: Маскву і Літву»[326]. Славянскі характар Вялікага княства Літоўскага быў ужо прадвызначаны, як мы бачылі, пры ўтварэнні гэтай дзяржавы ў сярэдзіне XIII ст.

Падсумоўваючы ўсё сказанае ў гэтай кнізе, мы прыходзім да наступных высноў.

Ніводная гістарычная крыніца не пацвярджае літоўскага заваявання Чорнай Русі і іншых беларускіх земляў, што нібыта і паклала пачатак утварэнню Вялікага княства Літоўскага. Такое сцверджанне ўзнікла ў сярэдзіне XVI ст., каб ідэалагічна абгрунтаваць права Вялікага княства Літоўскага на беларускія землі, значная частка якіх тады часова была занята войскамі Івана Грознага. Гэтая версія цераз «Хроніку» М. Стрыйкоўскага перайшла ў многія кнігі па гісторыі, пазней была некрытычна прынята шмат якімі даследчыкамі і, стаўшы традыцыйнай, доўгі час не пераглядалася.

Значнай перашкодай для аб'ектыўнага асвятлення працэсу ўтварэння Вялікага княства Літоўскага з'яўляецца атаясамліванне летапіснай Літвы з усходняй часткай сучаснай Літвы. Аднак гістарычныя сведчанні і тапаніміка паказваюць, што пад уласна Літвой у XI—XIII стст. разумелася тэрыторыя Верхняга Панямоння, якая зна-

ходзілася паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Новагародскай землямі і якая побач з імі з'яўлялася адной з гістарычных абласцей Беларусі. Менавіта яна і была далучана да Новагарадка спачатку ў 50-х гадах XIII ст. літоўскім перабежчыкам Міндоўгам, а пасля ў 60-х гадах XIII ст. канчаткова яго сынам Войшалкам. Гэта было першым звяном у пашырэнні ўлады Новагарадка, які дасягнуў к таму часу значнага эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця, на іншыя беларускія і балцка-літоўскія землі. Толькі гэтым можна і вытлумачыць, чаму Новагарадок стаў першай сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Адсюль, з Беларускага Панямоння, дзе знаходзілася летапісная Літва, і пайшла назва новай дзяржавы як Літоўскай.

Тое, што ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага суправаджалася заваяваннем балцка-літоўскіх земляў (Літвы, Нальшчанаў, Дзяволтвы), знішчэннем і выгнаннем іх феадалаў, адхіляе пашыранае ў навуцы сцвярджанне, што ўзнікненне гэтай дзяржавы дыктавалася інтарэсамі літоўскіх феадалаў. Паколькі ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага было найперш вынікам эканамічнага, палітычнага і культурна-этнічнага збліжэння і аб'яднання беларускіх земляў, то гэты гістарычны працэс быў у інтарэсах беларускіх феадалаў. Гэтым жа тлумачыцца і тое, чаму ў Вялікім княстве Літоўскім пануючае месца заняла беларуская культура і дзяржаўнай стала беларуская мова.

КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

[1] Антонович В. Б. Очерки истории Великого княжества Литовского. Киев, 1878. С. 25; Любавский М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства. М., 1915. С. 14; Советская историческая энциклопедия. Т. 3. С. 246; Гісторыя Беларускай ССР. Мн., 1972. Т. 1. С. 125—126; История Литовской ССР. Вильнюс, 1978. С. 34.

[2] Дашкевич Н. П. Литовско-Русское государство // Университет. изв. Киев, 1882. № 8. С. 325.

[3] Алексеев Л. В. Полоцкая земля. М., 1966. С. 288.

[4] Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. М.. 1959. С. 341.

[5] Там жа. С. 8.

[6] Дмитриева Р. П. Сказание о князьях владимирских. М.; Л., 1955. С. 109.

[7] Полное собрание русских летописей (ПСРЛ). М., 1975. Т. 32. С. 17—19, 130.

[8] ПСРЛ. М., 1962. Т. 2. Стб. 526—527.

[9] ПСРЛ. Т. 32. С. 20, 21, 23, 130.

[10] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmudska i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1846. T. 1. S. 242.

[11] Дашкевич Н. П. Княжение Даниила Галицкого. Киев, 1873. С. 175.

[12] Татищев В. Н. Разговор двух приятелей о пользе науки и училищ // Чтения в имп. О-ве истории и древностей российских. М., 1887. Кн. 1. С. 138.

[13] Соловьев С. М. История России. М., 1963. Т. 3. С. 151.

[14] История БССР. Мн., 1961. Т. 1. С. 64—65.

[15] Абецадарскі Л. С. і інш. Гісторыя БССР. Мн., 1985. С. 32.

[16] Греков В. Д. Киевская Русь. М., 1949. С. 499—500.

[17] Пресняков А. Е. Лекции по русской истории. М., 1939. Т. 2. Вып. 1. С. 5.

[18] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 290.

[19] Там жа.

[20] Там жа.

[21] Там жа.

[22] Насонов А. Н. Русская земля и образование Древнерусского государства. М., 1951. С. 149.

[23] Тихомиров М. Н. Древнерусские города. М., 1956. С. 362.

[24] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 256—257.

[25] Там жа. С. 290.

[26] Там жа. С. 253.

[27] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 620.
[28] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 280.
[29] Там жа. С. 282.
[30] ПСРЛ. М., 1962. Т. 1. Стб. 403—404.
[31] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 690—694.
[32] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 153.
[33] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 692.
[34] Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 75.
[35] ПСРЛ. Л., 1927. Т. 1. Вып. 2. С. 302.
[36] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 752—753.
[37] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 42.
[38] Дмитриев М. Несколько слов исторического обозрения Новогрудка // Вестн. имп. Рус. географ. о-ва. СПб, 1858. Т. 24. С. 230.
[39] Тихомиров М. Н. Указ. соч. С. 42.
[40] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 731—732.
[41] Новгородская IV летопись. Пг., 1915. Вып. 1. С. 116.
[42] Татищев В. Н. История Российская. М.; Л., 1962. Т. 2. С. 79.
[43] Там жа. С. 243, 284.
[44] Słownik geograficzny. Warszawa, 1884. T. 7. S. 255.
[45] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 141.
[46] Барсов Н. Очерк русской исторической географии. Варшава, 1873. С. 41.
[47] Гуревич Ф. Д. Древние города Белорусского Понемонья. Мн., 1982. С. 6.
[48] Гурэвіч Ф. Д. Заснаванне Навагрудка // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1985. № 3. С. 73.
[49] Татищев В. Н. Указ. соч. Т. 2. С. 133—134.
[50] Археологические открытия 1965 г. М., 1966. С. 165—168.
[51] Татищев В. Н. Указ. соч. Т. 2. С. 142.
[52] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 753.
[53] Там же. Стб. 776.
[54] Там же. Стб. 819.
[55] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понемонья. М., 1962. С. 60.
[56] Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок. Л., 1981. С. 138—139.
[57] Там жа. С. 157.
[58] Там жа. С. 148—157.
[59] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 776.
[60] Там же. Стб. 292, 631.
[61] Там же. Стб. 847.
[62] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 831.
[63] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья. С. 133.
[64] Там жа. С. 133.
[65] Зверуго Я. Г. Древний Волковыск. Мн.. 1981.
[66] Археологические открытия 1968 г. М., 1969. С. 350—351.
[67] Археологические открытия 1970 г. М., 1971. С. 308.
[68] Воронин Н. Н. Древнее Гродно. М., 1953; Трусов О. А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв. Мн., 1988. С. 26.
[69] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья. С. 140.
[70] Там жа. С. 141—144.
[71] Там жа.

[72] Там жа. С. 111.
[73] Там жа. С. 136.
[74] Археологические открытия 1965 г. М., 1966. С. 168.
[75] Тихомиров М. Н. Указ. соч. С. 362.
[76] Кочубинский А. А. Территория доисторической Литвы // Журн. М-ва народного просвещения. СПб., 1897. № 1. С. 65.
[77] Гринблат М. Я. Белорусы. Мн., 1969. С. 71, 161, 165; Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 353, 381.
[78] Советская историческая энциклопедия. Т. 8. С. 738.
[79] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 496.
[80] Там же. Стб. 519.
[81] Насонов А. Н. Указ. соч. С. 153.
[82] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 859.
[83] Батюшков П. Белоруссия и Литва. СПб., 1890. С. 60.
[84] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 672.
[85] Там же. Стб. 797—798.
[86] Там же. Стб. 798.
[87] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 855.
[88] Там же. Стб. 856.
[89] Ревизия пущ. Вильно, 1867. С. 14.
[90] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 818—819.
[91] Жучкевич В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. Мн., 1971. С. 413.
[92] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 819.
[93] Там же. Стб. 828—829.
[94] Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок. С. 3.
[95] Narbutt T. Dzieje starożytne narodu Litewskiego. Wilno, 1843. T. 6. S. 87.
[96] Кочубинский А. А. Указ. соч. С. 93.
[97] Седов В. В. Дреговичи // Сов. археология. 1963. № 3. С. 116.
[98] Stryjkowski M. O początkach. Warszawa, 1978. S. 95.
[99] Гошкевич И. И. Виленская губерния. Вильно, 1905. С. 118.
[100] Дмитриева Р. Т. Указ. соч. С. 138.
[101] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 75.
[102] Słownik geograficzny. Warszawa, 1884. T. 5. S. 741.
[103] Ермаловіч М. І. Яшчэ раз аб месцазнаходжанні Старажытнай Літвы і пачатковай гісторыі Навагрудка // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1988. № 4. С. 68—75.
[104] Пашуто В. Т. Указ. соч. Карта.
[105] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 818.
[106] Там же. Стб. 776.
[107] Гудавичус Э. Литва Миндовга. Вильнюс, 1985. С. 119—126.
[108] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 42.
[109] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 859—860.
[110] Вуснае паведамленне археолага М. А. Ткачова.
[111] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 847.
[112] Batura R. Lietuwa tautu kowoje Ayksa Orda. Vilnius, 1975. P. 133.
[113] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 818.
[114] Livonische Reimchronik. Padeborn, 1876. V. 3319, 3325.
[115] Гурэвіч Ф. Д. Заснаванне Навагрудка. С. 73.

[116] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья. С. 114.
[117] Штыхов Г. В. Археологическая карта Белоруссии. Мн., 1971. С. 13, 146, 147, 150—152, 172—174, 184, 190—193, 197.
[118] Голубинские. История русской церкви. СПб, 1901. С. 177.
[119] Ochmański J. Litewska granica etniczna na wschodzie. Wrocław, 1981. S. 47—53.
[120] Повесть временных лет. М., 1950. Т. 1. С. 13.
[121] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 5.
[122] Волкайте-Куликаускене Р. К. Образование литовской народности // Сов. этнография. 1979. № 3. С. 43.
[123] Annules Quedlinburgenes: Monumenta Germaniae Historica. Hannoverae, 1858. B. 3. S. 80.
[124] Волкайте-Куликаускене Р. К. О северной границе ятвягов // Проблемы этнической истории балтов. Рига, 1985. С. 49—51.
[125] Живописная Россия. СПб, 1882. Т. 3. С. 195.
[126] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 75.
[127] Кузавинис К. Происхождение названия «Литва» // Всесоюзная конференция по топонимике СССР. Л., 1965. С. 74—75.
[128] Гудавичус Э. С. Попытка локализовать владения литовских князей XIII в. // Труды АН ЛитССР. Сер. А. 1984. № 3. С. 70—79.
[129] Batura R. Указ. соч. С. 133.
[130] Там жа.
[131] Letuwies toribine enciklopedija. Vilnius, 1976. T 1. P. 463.
[132] Там жа.
[133] Batura R. Указ. соч. С. 133.
[134] Там жа.
[135] История Ливонии. Рига, 1885. Т. 2. С. 6.
[136] Волкайте-Куликаускене Р. К. Образование Литовской народности. С. 45.
[137] Гошкевич И. И. Виленская губерния.
[138] ПСРЛ. М., 1980. Т. 35. С. 248.
[139] Русская старина. Спб, 1901. № 2. С. 395.
[140] Надеждин Н. И. Северо-Западный край империи // Журн. М-ва внутренних дел. 1843. № 2. С. 219.
[141] Непокупный А. Балтійські родичі словьян. Київ, 1979. С. 63.
[142] Брянцев П. История Литовского государства. Вильно, 1889. С. 2.
[143] ПСРЛ. Т. 32. С. 78.
[144] Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959. С. 376—379.
[145] Дзень паэзіі. Мн., 1965. С. 194.
[146] Дунін-Марцінкевіч В. Збор твораў. Мн., 1958. С. 362.
[147] Колас Я. Збор твораў. Мн., 1963. Т. 9. С. 42—43.
[148] Юхо Я. Пра назву «Беларусь» // Полымя. 1968. № 1. С. 175—182.
[149] Беляев И. История Полотска. СПб, 1872. С. 59.
[150] Гудавичус Э. С. Попытка локализовать владения литовских князей XIII в. С. 79.
[151] БелСЭ. Мн., 1970. Т. 2. С. 463.

[152] Ермолович Н. И. Где была летописная Литва? // Тез. к конференции по археологии Белоруссии. Мн., 1969. С. 235.
[153] Археологический сборник документов истории Северо-Западной Руси. Вильно, 1904. Т. 14. С. 78, 82, 94.
[154] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 736.
[155] Забелин И. История русской жизни. СПб, 1864. Ч. 1. С. 599.
[156] Морошкин М. Славянский имянослов. СПб, 1867. С. 35.
[157] Забелин И. Указ. соч. С. 608.
[158] Морошкин М. Указ. соч. С. 39, 40, 48, 99, 152, 178, 199, 200.
[159] Вольтер Э. Где искать Нальшенайскую землю? // Журн. М-ва народного просвещения. 1900. № 5. С. 205.
[160] Живописная Россия. Т. 3. С. 76.
[161] Пашуто В. Т. Указ. соч. Карта.
[162] Ермолович М. О местонахождении Древней Литвы // Проблемы этнической истории балтов. Рига, 1985. С. 70—71.
[163] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 863.
[164] Хроника Быховца. М., 1967. С. 35.
[165] История Ливонии. Рига, 1885. Т. 2. С. 225.
[166] Виленская губерния. Вильна, 1905.
[167] Ochmański J. Historia Litwy. Wrocław, 1980. S. 56.
[168] Жемайте А. Избр. соч. Вильнюс, 1952. С. 43.
[169] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 339.
[170] Там жа. С. 367.
[171] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 526—527.
[172] Там же. Стб. 620.
[173] Генрих Латвийский. Хроника Ливонии. М., 1938. С. 81.
[174] Данилевич В. Очерк истории Полоцкой земли. Киев, 1896. С. 130.
[175] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. С. 124.
[176] Голубовский П. История Смоленской земли. Киев, 1896. С. 176, 183.
[177] ПСРЛ. Т. 1. С. 492.
[178] Там же. С. 447—448.
[179] Там же. С. 510.
[180] Новгородская I летопись. С. 64, 269.
[181] Соболевский А. Где была Литва? // Изв. имп. АН VI сер. 1911. № 5. С. 1051—1054.
[182] Псковские летописи. М., 1950. Вып. 2. С. 77.
[183] Беляев И. Очерк истории Северо-Западной Руси. СПб, 1867. С. 49.
[184] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. С. 124—125.
[185] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 51.
[186] Там жа. С. 181.
[187] Там жа. С. 381.
[188] Новгородская I летопись. С. 83.
[189] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 798.
[190] Кочубинский А. Указ. соч. С. 66.
[191] Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. М., 1970. С. 191.
[192] Там жа. С. 105—108.
[193] ПСРЛ. Т. 1. Стб. 301.

[194] Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978. С. 83—90.
[195] Мавродин В. Образование Древнерусского государства. Л., 1945. С. 92.
[196] Алексеев Л. В. Указ. соч. С. 263.
[197] Новгородская I летопись. С. 574.
[198] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательных местах Белоруссии. СПб, 1855. С. 10—11.
[199] Живописная Россия. Т. 3. С. 293.
[200] ПСРЛ. Т. 7. Стб. 573.
[201] Dusburg P. Geschicht Pruss. B. 6. S. 301—304.
[202] Шафарик П. Славянские древности. М., 1846. Т. 2. Кн. 1. С. 174.
[203] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 73—74.
[204] Там жа. С. 76.
[205] Голубович В., Голубович Е. Кривой Город — Вильно // Кр. сообщ. Ин-та истории материальной культуры. 1945. Вып. 11. С. 123.
[206] Юргевич В. Опыт объяснения имен литовских князей // Чтения в имп. О-ве истории и древностей российских. М., 1883. Кн. 3. С. 28.
[207] Живописная Россия. Т. 3. С. 291.
[208] Голубович В., Голубович Е. Указ. соч. С. 123.
[209] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 266.
[210] Голубович В., Голубович Е. Указ. соч. С. 123.
[211] ПСРЛ. Т. 32. С. 40.
[212] Кочубинский А. А. Указ. соч. С. 66.
[213] Корева А. Виленская губерния. Вильно. 1861. С. 288.
[214] Кочубинский А. Указ. соч. С. 66.
[215] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 24. С. 146.
[216] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 376.
[217] Там жа. С. 387.
[218] Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья. С. 137.
[219] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 322.
[220] Там жа. С. 352.
[221] Там жа. С. 7.
[222] История БССР. Т. 1. С. 66.
[223] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 6.
[224] ПСРЛ. Т. 32. С. 132.
[225] Живописная Россия. Т. 3. С. 372.
[226] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 871—872.
[227] Там же. Стб. 872.
[228] ПСРЛ. Т. 32. С. 25.
[229] Там же. С. 131.
[230] Живописная Россия. Т. 3. С. 362.
[231] Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. С. 121.
[232] Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 375, 381.
[233] Новгородская I летопись. С. 82.
[234] Греков Б., Якубовский А. Золотая Орда и ее падение. М.; Л., 1950. С. 83, 86.
[235] ПСРЛ. Т. 2. Стб. 872.
[236] Там же. Стб. 876.
[237] Там же. Стб. 876.
[238] Гошкевич И. И. Виленская губерния. С. 114.

239 Хроника Ливонии. С. 82.
240 БСЭ. Изд. 3. М., 1975. Т. 21. С. 195.
241 ПСРЛ. Т. 35. С. 128, 145, 173, 193, 204.
242 Ботвиник М. Б. Лаврентий Зизаний. Мн., 1973. С. 97.
243 Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн., 1980. С. 224.
244 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 137—138.
245 Livländische Reimchronik. Padeborn, 1876. V. 8104—8125.
246 Новгородская I летопись. С. 85.
247 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 735—736.
248 Там же. Стб. 776.
249 Там же. Стб. 801.
250 Livländische Reimchronik. V. 2450—2542.
251 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 861.
252 Энцикл. слов. / Брокгауз и Ефрон. 1902. Т. 26а. С. 201.
253 ПСРЛ. Т. 1. С. 201.
254 Энцикл. слов. / Брокгауз и Ефрон. 1895. Т. 14а. С. 584.
255 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 776.
256 Там же. Стб. 815.
257 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 377.
258 Там жа. С. 378.
259 Дашкевич Н. Княжение Даниила Галицкого. С. 132.
260 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 377.
261 Там жа. С. 377.
262 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 860.
263 Хроника Быховца. С. 131.
264 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 815.
265 Там же.
266 Там же. Стб. 816.
267 Там же.
268 Там же. Стб. 818.
269 Там же.
270 Там же. Стб. 818—819.
271 Там же. Стб. 827—828.
272 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 380.
273 Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. М., 1950. С. 247, 259.
274 Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. С. 380.
275 Тарасов К. Память о легендах. Мн., 1984. С. 20.
276 Там жа. С. 16.
277 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 386.
278 Тезисы советской делегации на V Международном конгрессе славянской археологии. М., 1985. С. 132.
279 Гуревич Ф. Д. Древний Новогрудок. С. 7.
280 Непокупный А. Указ. соч. С. 65.
281 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 830.
282 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 380.
283 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 837—838.
284 Там же. Стб. 838.
285 Там же. Стб. 839.
286 Там же. Стб. 830—831.
287 История БССР. Т. 1. С. 65.
288 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 378—379.
289 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 820.

290 Там же. Стб. 817.
291 Там же. Стоб. 838—839.
292 Там же. Стб. 859.
293 Там же. Стб. 858.
294 Любавский М. Очерк истории Литовско-Русского государства. С. 16—17.
295 Livländische Reimchronik. V. 6471—6513.
296 Там жа. Вершы 6514—6585.
297 Там жа.
298 Вольтер Э. Указ. соч. С. 200.
299 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 860.
300 Там же.
301 Там же.
302 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 383.
303 Новгородская I летопись. С. 574.
304 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 861.
305 Там же.
306 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 383.
307 Там жа.
308 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 861.
309 Гудавичус Э. С. Литва Миндовга. С. 220.
310 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 861.
311 Там же.
312 Там же. Стб. 862.
313 Там же. Стб. 863.
314 Пашуто В. Т. Указ. соч. С. 409.
315 Боричевский И. Православие и русская народность в Литве. СПб. 1846. С. 74.
316 Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. С. 75.
317 Там же.
318 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 869.
319 Соловьев С. М. История России. М., 1963. Кн. 2. С. 189—190.
320 Татищев В. Н. История Российская. М.; Л., 1961. Т. 1. С. 357, 440; Т. 2. С. 311.
321 Улащик М. М. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1988. С. 147—158.
322 ПСРЛ. Т. 32. С. 25.
323 Там же. С. 20.
324 Маркс К.. Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. Т. 22. С. 18—19.
325 Маркс К., Энгельс Ф. Соч. 2-е изд. Т. 16. С. 163.
326 Цыт. па кн.: Греков И. Б. Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV—XVI вв. М., 1963. С. 156.

ЗМЕСТ

Прадмова 4
1. На ўзроўні XVI ст. 5
2. Ці толькі раздробленасць і слабасць? . 10
3. Дзе была летапісная Літва? . . . 21
4. Літоўскія набегі і славянская каланізацыя 36
5. Для каго была большая пагроза? . . 51
6. Што ж заваяваў Міндоўг? 57
7. Палітыка Войшалка і другое заваяванне Літвы 68
Заключэнне 83
Крыніцы і літаратура 86

Научное издание

Ермолович Николай Иванович

ПО СЛЕДАМ ОДНОГО МИФА

Минск, издательство «Наука и техника»

На белорусском языке

Навуковае выданне

Ермаловіч Мікалай Іванавіч

ПА СЛЯДАХ АДНАГО МІФА

Загадчык рэдакцыі А. І. Валаховіч

Рэдактар А. С. Пякарскі

Мастак А. А. Кулажэнка

Мастацкі рэдактар В. А. Жахавец

Тэхнічны рэдактар Л. А. Каркеева

Карэктар Я. У. Марціновіч

ІБ № 3476

Здадзена ў набор 04.04.89. Падпісана ў друк 09.06.89. АТ 10728. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,04. Ум. фарб.-адб. 5,25. Ул.-выд. арк. 5,0. Тыраж 6000 экз. Зак. № 752. Цана 60 к. Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220072. Мінск, Ленінскі праспект, 68. Друкарня імя Францыска Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220072. Мінск, Ленінскі праспект, 68.

«НАВУКА І ТЭХНІКА»

рыхтуе да друку

шэсць выпускаў факсімільнага выдання

першай масавай беларускай газеты

«Наша ніва»,

якую па праву называюць «энцыклапедыяй беларускага адраджэння». Яна адыграла вялікую ролю ў развіцці новай беларускай культуры, развіцці грамадска-палітычнага руху, станаўленні нацыянальнай самасвядомасці.

Першыя два выпускі запланаваны на 1989 г. Выпуск 1 уключае нумары газеты з 1906 па 1908 г., выпуск 2 — нумары за 1909 г.

Выданне падпісное.

60 к.